МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БАРАНАВІЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

А. І. БЕЛАЯ

# ФАРМІРАВАННЕ ГІСТОРЫКА-ПАТРЫЯТЫЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ ШКОЛЬНІКАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ТВОРАЎ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

**Вучэбна-метадычны дапаможнік**
**для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў**

**Рэкамендавана да друку навукова-метадычным**
**саветам універсітэта**

Рэпозиторий БарГУ

**Баранавічы**
**РВА БарДУ**
**2011**

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

УДК 882.609(072.3)(0433)
ББК 83.3(4Беи)
Б43

А ў т а р

А. І. Белая

Р э ц э н з е н т ы:

*Н. У. Ермаловіч*, старшы выкладчык кафедры філалогіі
Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*П. В. Васючэнка*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры
Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта

**Белая, А. І.**

**Б43** **Фарміраванне гісторыка-патрыятычнай свядомасці школьнікаў пры вывучэнні твораў У. Караткевіча** [Тэкст] : вучэб.-метад. дапаможнік для студэнтаў выш. навучал. устаноў/ А. І. Белая. — Баранавічы : РВА БарДУ, 2011. — 104, [4] с. — 70 экз. — ISBN 978-985-498-421-6

У дапаможніку прадстаўлены аўтарскія падыходы да літаратуразнаўчай і метадычнай інтэрпрэтацыі лірычных, ліра-эпічных і эпічных твораў У. Караткевіча, што ўваходзяць у школьную праграму. Асаблівая ўвага нададзена раману «Каласы пад сярпом тваім».

Прызначаецца для настаўнікаў беларускай літаратуры сярэдніх агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў, для студэнтаў-філолагаў.

**УДК 882.609(072.3)(0433)**
**ББК 83.3(4Беи)**

© БарДУ, 2011
© Белая А. І., 2011
© Гундар У. Т., вокладка, 2011

**ISBN 978-985-498-421-6**

Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

## Ад аўтара

Адной з важнейшых мэт літаратурнай адукацыі з’яўляецца фарміраванне ў вучняў гістарычнай свядомасці. Гістарычная свядомасць — гэта працэс і вынік пазнавальнай і ацэначнай дзейнасці асобы, скіраванай у мінулае. Пры гэтым веды аб мінулым выступаюць як фундамент устаноўкі на пазнанне сучаснасці і на вызначэнне перспектыў развіцця (трыяда «мінулае, сучаснасць, будучыня»). Калі веды прапушчаны праз прызму светаўспрымання чалавека і адпавядаюць ідэалам канкрэтна-гістарычнага перыяду, то яны спрыяюць фарміраванню каштоўнасных арыентацый. Таму гістарычная свядомасць як феномен духоўнага жыцця ўключае і тыя формы, дзе яна існуе ў мастацкіх вобразах, у тым ліку вусную народную творчасць і мастацкую літаратуру. Наглядна і па-свойму дакладна мастацкі твор увасабляе грамадскую свядомасць і грамадскую псіхалогію людзей пэўнай эпохі. Веды па гісторыі і культуры свайго народа, яго ўклад у сусветную культуру, гонар за продкаў актыўна ўплываюць на фарміраванне гістарычнай свядомасці моладзі, адметным зрэзам якой з’яўляецца патрыятычная свядомасць.

Рэальным зместам дзяржаўнага суверэнітэту з’яўляецца развітая нацыянальная свядомасць як спосаб самаідэнтыфікацыі нацыянальнай супольнасці на аснове разумення сябе сярод іншых. Яна фарміруецца пад уздзеяннем гісторыі Айчыны і ведання гэтай гісторыі. Калі мы не хочам, каб суверэнітэт нашай дзяржавы быў фармальным, то павінны фарміраваць і ўмацоўваць у сваіх выхаванцаў погляд на сябе як на прадстаўнікоў арыгінальнай этнічнай супольнасць, у якой ёсць свае непаўторныя абавязкі перад сабою і перад зямной цывілізацыяй у захаванні традыцый, развіцці культуры, удасканаленні быту, усяго ўкладу жыцця.

Нельга не пагадзіцца з тым, што гуманістычна арыентаваная каштоўнасная свядомасць, рэалізуемая ў розных формах, ёсць не што іншае, як духоўнасць. Яе выхаванне не ўяўляецца магчымым па-за фарміраваннем гістарычнай, нацыянальнай, патрыятычнай свядомасці. Адным з важнейшых сродкаў дасягнення гэтай мэты з’яўляецца ўдумлівае прачытанне і грунтоўнае вывучэнне творчасці Уладзіміра Караткевіча [1].

«Варты жалю той, хто не ведае былога дня і таму не можа разабрацца ў сённяшнім і прадбачыць будучы... Абыякавы да мінулага не мае ніякай інтэлектуальнай перавагі над жывёлай і таму ёсць першы кандыдат на маральную, а затым і фізічную смерць. Усё адно хто гэта — чалавек ці народ»[1]. Гэтыя словы пісьменніка, укладзеныя ў вусны

[1] Караткевіч У. Зб. тв. У 8 т. Т. 5. Мн., 1989. С. 127. (Далей творы У. Караткевіча цытуюцца па гэтым выданні з падачай у адсылцы тома і старонкі, напрыклад: [т. 5, с. 35]).



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

героя рамана «Каласы пад сярпом тваім», гучаць прароча. Акрамя таго, у іх, як і ў назве пасмяротнага зборніка У. Караткевіча «Быў. Ёсць. Буду», заключаецца мастацкая формула гістарычнай свядомасці, трыяда «мінулае, сучаснасць, будучыня». Выразна гучыць мастацкае крэда пісьменніка: «Жыццё прыдумаць нельга. Яго можна толькі ўзнавіць. Такім, якім яно было... З усімі ўспамінамі пра мінулае... І з усім тым, што перажылі, што адпакутавалі мае і вашы продкі. З той падсвядомасцю, што тоіцца ў маёй і вашай душы. Таму ўсе мы — ад іх» [т. 5, с. 525].

Асновай патрыятычнага выхавання, як добра усведамляў У. Караткевіч, з'яўляецца культура свайго народа, праз якую маладое пакаленне далучаецца да агульначалавечай культуры. Напрамкі гэтага шляху вызначаюцца такімі каштоўнасцямі, як:

– родная мова, што спрыяе развіццю нацыянальнай самасвядомасці;

– родная гісторыя — аснова гістарычнай памяці;

– прырода роднага краю — аб'ект як патрыятычных, эстэтычных, так і па-гаспадарску дбайных адносін;

– фальклор як культурна-гістарычны, мастацкі шлях народа;

– нацыянальнае мастацтва як гістарычная энергія народа, моц яго духу, багацце і краса;

– народны каляндар як энцыклапедыя культуры побыту народа;

– сямейна-бытавая культура: шанаванне продкаў, захаванне роднай мовы, пераемнасць пакаленняў, вывучэнне радаводу, нацыянальна-гістарычнай маралі, этыкету, адзення, побыту;

– народныя традыцыі як еднасць мінулага, сучаснага і будучага народа;

– нацыянальны характар як сукупнасць псіхалагічных рыс і якасцей, што сфарміраваліся гістарычна і забяспечваюць жыццёвую ўстойлівасць беларускай нацыі.

Усе гэтыя напрамкі фарміравання гістарычнай свядомасці, выхавання патрыятызму, духоўнасці і грамадзянскасці па-мастацку ўвасоблены ў рамане У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім».

Узровень метадычнай інтэрпрэтацыі твора павінен быць адэкватным таленту пісьменніка і яго ўкладу ў гісторыю беларускай літаратуры, у агульную культурную спадчыну. Вялікае выхаваўчае ўздзеянне мае і асоба У. Караткевіча, надзеленая не толькі ўсебаковай таленавітасцю, але і «ўсебаковай чалавечнасцю». Творчасць яго глыбока гуманістычная таму, што грунтуецца на адзінстве народнага і агульначалавечага, на імкненні знаходзіць тое, што аб'ядноўвае людзей і народы як у гарызантальным, сучасным зрэзе іх існавання, так і ў вертыкальным, глыбінным, гістарычным. У дадзеным дапаможніку змешчаны метадычныя рэкамендацыі, якія, на думку аўтара, дазволяць зрабіць працэс фарміравання гісторыка-патрыятычнай свядомасці школьнікаў больш эфектыўным.

У выхаванні асноватворных светапоглядных якасцей моладзі неабходна ўлічваць гісторыка-культурныя рэаліі кожнага канкрэтнага рэгіёна Беларусі, узыходзячы ад іх да агульнанацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей. Аўтар дапаможніка вылучае новую версію паходжання назвы рамана «Каласы пад сярпом тваім», якая звязана
з помнікам на месцы бітвы ў маі 1863 года пад Мілавідамі (зараз Баранавіцкі раён



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Брэсцкай вобласці) і аргументуецца ў раздзеле «Сімволіка прозы У. Караткевіча». У афармленні вокладкі выкарыстаны здымак з адпаведным фрагментам помніка.

Репозиторий БарГУ



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

## ТВОРЫ У. КАРАТКЕВІЧА Ў ШКОЛЬНАЙ ПРАГРАМЕ І ІХ МЕТАДЫЧНАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ

Репозиторий БарГУ

«Без гістарычнага рамана, гістарычнай літаратуры ўвогуле не можа абудзіцца нацыя, бо няма нацыі без пачуцця гістарызму, без спакойнага гонару за сябе і проста самапавагі...» [2, с. 285]. Гэта добра разумеў У. Караткевіч, заснавальнік гістарычнай тэмы ў сучаснай беларускай літаратуры, які, па сутнасці, узнавіў у памяці беларусаў іх уласную гісторыю, узняўшыся над застойным канфармізмам, над штодзённасцю і бездухоўнасцю. Ва ўмовах апалагетызацыі сучаснасці, калі пачала цалкам дыскрэдытавацца гістарычная тэма, пісьменнік усё ж звярнуўся да яе, бо добра ўсведамляў, якія шляхі злучаюць мінулае з будучыняй, чалавека з людзьмі і народамі. Творы пісьменніка былі новай, нязвыклай з'явай, і ўспрыманне іх таксама было неадназначным. Чытачы адразу сталі прыхільнікамі караткевічаўскага таленту, а крытыкі адзначалі шматлікія недахопы, у тым ліку і тыя, якіх творы не мелі. Прычына найперш у тым, што падыход У. Караткевіча да «рэканструкцыі» гістарычнай мінуўшчыны быў адметным і арыгінальным, ён ішоў ад легендарна-фальклорнага матэрыялу да глыбокага аналізу канкрэтных гістарычных фактаў, дакладнаму веданню якіх пісьменнік удзяляў вялікую ўвагу. Аднак не менш важнай задачай ён лічыў узнаўленне духу мінулых эпох. Кожная эпоха, да якой звяртаўся У. Караткевіч, была «эпохай з віруючым жыццём, эпохай, калі народу трэба было ўсе сілы пакласці, каб вырātаваць жыццё, і сумленне, і права дыхаць, калі смяротная пагроза навісла над краем, калі народ стаяў перад рэальнай і грознай небяспекай гвалтоўнай асіміляцыі» [2, с. 22]. На гістарычных сюжэтах, кожны з якіх быў для пісьменніка адкрытай размовай з сучаснікам, У. Караткевіч ствараў сваю матрыцу будучыні. За вобразамі яго герояў паўстае складаны, часта трагічны лёс Белай Русі, бо людскія лёсы неадрыўныя ад гістарычных падзей і абумоўлены гэтымі падзеямі. Пісьменнік увасабляе такую повязь у сучаснай мастацкай форме на аснове



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

спалучэння рэалістычнага і рамантычнага пачаткаў. У мастацкім свеце яго твораў «жывуць і дзейнічаюць выключныя па характары і паводзінах героі, людзі моцныя, смелыя, схільныя да глыбокіх перажыванняў, пачуццяў» [3, с. 133] вызначальнае сярод якіх — пачуццё патрыятызму. «Іменна рамантызм увёў у літаратуру прынцып гістарызму», які ёсць «праўдзівае адлюстраванне канкрэтных асаблівасцей жыцця народа, побыту, нораваў, псіхалогіі людзей той эпохі, якую паказвае пісьменнік» [3, с. 44]. Творы У. Караткевіча, у якіх жыццё паказана ў гістарычным развіцці, раскрываюць непарыўную дыялектычную сувязь паміж мінулым, сучасным і будучым. Падзеі нацыянальнай гісторыі, якім пісьменнік аддае перавагу, дазваляюць яму адлюстраваць актуальныя праблемы эпохі, выказаць свой пункт погляду. Гістарычна-прыгодніцкія творы У. Караткевіча спрыяюць павышэнню цікавасці да беларускай кніжкі дзякуючы арыгінальнасці, займальнасці, здольнасці трымаць чытача ў пастаянным напружанні. Даўніну і сённяшні дзень Беларусі звязваюць непарыўнай сувяззю сюжэтныя таямніцы, непрадбачаныя калізіі. Пісьменнік умела карыстаецца гістарычнай інфармацыяй, свабодна пераходзіць ад аб’ектыўных мастацкіх карцін і вобразаў да лірычных і публіцыстычных адступленняў, роздумаў пра мову, фальклор, культуру. Акрамя таго, гістарызм у творах Караткевіча з'яўляецца важнейшым сродкам узбуйнення прыватных маральных праблем да агульначалавечых маштабаў; яскрава выступае ідэя сувязі этычных ідэалаў сучаснага чалавека з народнымі традыцыямі. Мастацкае асэнсаванне дыялектыкі адносін паміж гісторыяй і сучаснасцю, глыбокае разуменне гістарычнага працэсу — вось тыя рысы, якія робяць напісанае У. Караткевічам мастацка-гістарычным летапісам жыцця і лёсу беларускага народа, фактарам фіксацыі і развіцця гістарычнай свядомасці сучаснага і наступных пакаленняў.

Мастацкая літаратура адлюстроўвае сувязі, уласцівыя сацыяльнай рэчаіснасці, у эстэтычных катэгорыях. Асоба і творчасць У. Караткевіча ўяўляюць сабою прыклад сакральнага разумення і мастацкага ўвасаблення гістарычнай свядомасці беларусаў пачынаючы з гісторыі ўласнага роду пісьменніка, што з’явілася штуршком да напісання рамана «Каласы пад сярпом тваім», з асэнсавання ролі «прыватнай гісторыі»



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

ў станаўленні асобы і грамадства і заканчваючы сімвалічнай назвай пасмяротнага зборніка «Быў. Ёсць. Буду».

У гэтым феномен Караткевіча, «заступніка беларускай гісторыі і культуры, прапаведніка і прарока». Ён «узвысіўся, стаў эпахальнай з'явай не толькі ў працэсе развіцця беларускай літаратуры ці беларускай культуры, але і фарміравання... нацыянальна-гістарычнай свядомасці нашага народа» [4, с. 225—226], арганічна спалучаючы
ў асобе і творчасці патрыятычнае і інтэрнацыянальнае, афарбоўваючы ў нацыянальныя колеры і адценні набыткі сусветнай літаратуры. «Творы У. Караткевіча выхоўваюць нашы пачуцці, упрыгожваюць думкі, вучаць любіць і берагчы чалавечнае ў чалавеку, паглыбляюць веды пра зямлю, на якой жывём, выклікаюць радасць мастацкага адкрыцця, абуджаюць, хвалююць, трывожаць фантазію і розум. Творчасць У. Караткевіча — гэта сапраўдны летапіс духоўнага жыцця беларускага народа, напісаны шчыра і таленавіта. І ягоным творам наканавана доўгае жыццё» [5, с. 241].

Так, як у новых гістарычных умовах У. Караткевіч працягваў традыцыі сваіх папярэднікаў, гэтак і яго творчасць прыкметна ўплывае на сучасны беларускі літаратурны працэс. Дбаючы аб грамадзянска-патрыятычным выхаванні моладзі, пісьменнік імкнуўся ўдасканальваць як змест, так і форму сваіх твораў. Ёсць усе падставы сцвярджаць, што яны напісаны як бы навырост, маючы на ўвазе іх здольнасць задаволіць усякі мастацкі густ, адпавядаць духоўным запатрабаванням асобы на кожным этапе яе развіцця. З улікам гэтага ажыццёўлены пэўны падбор твораў У. Караткевіча ў сучасных школьных праграмах.

Чытацкае ўспрыманне школьнікаў праходзіць пэўныя перыяды развіцця: перыяд «наіўнага рэалізму» (5—6-ыя класы), перыяд «маральнага эгацэнтрызму» (7—8-ыя класы), «эпоху сувязей, асэнсавання прычын і вынікаў» (9—11-ыя класы) [6]. Дамінантай іх характарыстыкі з'яўляецца адметнасць чытацкай свядомасці ў кожным перыядзе, якая абумоўлена дыялектыкай двух супрацьлеглых працэсаў: звернутага на зносіны з рэчаіснасцю і скіраванага на асобасную перапрацоўку атрыманага звонку. Ад канкрэтна-сітуацыйнага мыслення дашкольніка асоба пад уплывам навучання ўступае ў «эпоху разважлівага мыслення» (П. П. Блонскі), якое паступова ўзбагачаецца псіхалагічным кампанентам уяўлення аб людзях. У юнацкім узросце на



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

першы план выходзіць гістарычная, сацыяльная канцэпцыя і эстэтычная матывацыя.

Перыяд «наіўнага рэалізму» характарызуецца яркасцю эмоцый. Яны спрыяюць асэнсаванню зместу твора, аднак характэрнымі рысамі гэтага працэсу з'яўляюцца схематызм і аб'ектыўнасць, а ўзроўнем — пераказ. Сюжэт часта засланяе аўтарскую ідэю. Узнаўленчае ўяўленне пераважае над творчым, за выключэннем сітуацый, знаёмых школьнікам з уласнага вопыту. У цэнтры іх увагі звычайна не аўтар, а герой твора; форма твора не ўяўляецца істотнай, аднак вучні здольны матываваць мастацкую дэталь. Дзейнасць настаўніка на дадзеным этапе заклікана стымуляваць эмацыянальную актыўнасць вучняў, якая пракладвае шлях да складаных інтэлектуальных дзеянняў, спрыяць узнікненню эмпатыі, фарміраваць здольнасць да цэласнага ўспрымання твора; улічваючы інтэнсіўнае фарміраванне свядомасці падлеткаў, мэтанакіравана ўплываць на станаўленне іх грамадзянскай пазіцыі.

Спецыфіка ўспрымання літаратуры школьнікамі ў 5-ым класе робіць яго пераходным звяном ад пачатковай да сярэдняй ступені літаратурнай адукацыі. Яе зместам на гэтым этапе з'яўляецца азнаямленне вучняў з разнастайнасцю прыёмаў і сродкаў адлюстравання жыцця ў фальклорных і літаратурных творах. Вершы, што прапануюцца ў першым раздзеле праграмы, сваім зместам і формай заклікаtable сцвердзіць думку пра родную мову як захавальніцу нацыянальнай, патрыятычнай і гістарычнай свядомасці народа, выклікаць захапленне яе прыгажосцю і мілагучнасцю, у якіх адбіліся хараство роднай прыроды і духоўнае багацце людзей, што спрадвеку жывуць на беларускай зямлі. Так, вывучаючы верш У. Караткевіча **«Бацькаўшчына»**, вучні 5-га класа ў сумеснай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці з настаўнікам, паводле патрабаванняў праграмы, павінны адчуць гонар паэта за сваю радзіму, захапленне яе краявідамі, ацаніць мастацкае адлюстраванне прыроднага наваколля ў вершы, заўважыць і асэнсаваць глыбокі лірызм, шчырасць і непасрэднасць у перадачы пачуццяў паэта, звярнуць пільную ўвагу на вобразнасць, эмацыянальную насычанасць мовы.

Паспяховае засваенне літаратуры як школьнага прадмета «залежыць не толькі ці не столькі ад колькасці засвоенай вучнямі інфармацыі, колькі ад іх уяўлення, інтуіцыі, свежасці погляду і праніклівасці... Маецца на ўвазе самастойнасць і дывергентнасць



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

мыслення» [7, с. 67]. Эфектыўным з'яўляецца метадычны прыём «Мантаж тэксту з россыпу слоў», для якога варта скарыстаць урыўкі з верша. Яны друкуюцца вялікімі літарамі без знакаў прыпынку, затым разразаюцца на асобныя часткі, і вучням прапануецца ўзнавіць зыходны тэкст. Такое заданне ставіць вучня ў пазіцыю аўтара і творцы, развівае навыкі аналізу і сінтэзу, а па выніках выканання настаўнік здольны меркаваць пра наяўнасць літаратурных і творчых здольнасцей навучэнцаў і кіравацца гэтым у далейшай дзейнасці. Акрамя таго, рэалізуецца міжвольнае запамінанне пры «навучанні з захапленнем».

Пэўныя цяжкасці ў пяцікласнікаў узнікаюць з прычыны недастатковага валодання лексікай беларускай мовы і спецыфікай мастацкай вобразнасці. «Пры “наіўным рэалізме” эмоцыі чытача звычайна ярчэй за славесныя азначэнні пачуццяў. Нэадэкватнасць чытацкіх пачуццяў і славеснай ацэнкі тлумачыцца малым вопытам рэфлексіі і неразвітасцю мовы» [8, с. 99]. Як адзін са сродкаў пераадолення гэтага ў настаўніцкай практыцы аўтара дадзенага дапаможніка засведчыў сваю эфектыўнасць наступны прыём: складанне тэматычнага слоўніка «Пачуцці», які паступова папаўняецца. Мэтазгодна пачынаць гэтую работу з самага пачатку літаратурнага курса і ўжо на дадзеным уроку прапанаваць вучням пэўную класіфікацыю эмацыянальных станаў асобы, пажадана ў параўнальным аспекце, што ўзбагачае веды пра пачуццёвую сферу чалавека, дапамагае асэнсоўваць уласныя эмацыянальныя перажыванні, што выступаюць як пачатак духоўнага свету асобы, яе культуры. З дапамогай такой апоры вучні вызначаюць дыяпазон і дынаміку пачуццяў у творы.

Пасля работы з урыўкамі пераходзім да высвятлення спецыфікі мастацкай вобразнасці. Зносіны на дадзеным уроку будуюцца ў першую чаргу праз абуджэнне патрыятычных пачуццяў вучняў. Паколькі аналіз твора — гэта вырашэнне праблем, пастаўленых пісьменнікам, то адна з галоўных стратэгій усякага ўрока — даследаванне аўтарскай пазіцыі. Напачатку яна можа быць сфармулявана як адказ на пытанне «Якім вам уяўляецца чалавек, што напісаў такі верш?». Звычайна пераважае адказ: «Добрым». Але пры яго канкрэтызацыі выяўляецца шматзначнасць слова ў вучнёўскім разуменні: здольны бачыць прыгажосць свайго краю,



Рэпазіторый БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

уважлівы да ўсяго ў ім, неабыякавы, таленавіты, вельмі добра ведае родную мову, крышку сумны.

Маральна-светапоглядная ўстаноўка пісьменніка павінна быць у ідэале аднолькавай як для чытача, так і для самога сябе. Гэта цалкам адпавядае жыццёваму і пісьменніцкаму крэда У. Караткевіча, што робіць выхаваўчы эфект яго твораў максімальным.

Гістарычная свядомасць як феномен духоўнага жыцця ўключае, сярод іншых, і фальклорныя формы асваення гістарычнай рэальнасці. Фальклор — кампанент гістарычнай свядомасці, гіганцкі акумулятар культуры. Фальклорныя жанры, за выключэннем легенд і паданняў, уяўляюць сабой формы міфалагічнай свядомасці, якая не ведае катэгорыі часу. Гістарычны жанр у мастацтве з'яўляецца з нетраў фальклору, але кожнай з’яве ўласціва свая спецыфіка: «фальклор гарманізуе мінулае, навука і мастацтва... узнаўляюць праўду» [9, с. 102].

Народная творчасць з’яўляецца і неад’емнай часткай гісторыі народа, і ўяўляе сабой своеасаблівы кодэкс маральна-этычных норм. Для фальклорных твораў характэрна ўжыванне выслоўяў, змястоўнасць, практычная скіраванасць, вобразнасць, якія выхоўваюць пачуццё мовы, увагу да слова, яго гучання і сэнсу ў кантэксце. У 5-ым класе вывучаюцца міфы, легенды, народныя казкі, загадкі, прыказкі, прыметы
і павер’і, народныя песні, а таксама літаратурныя легенды і казкі. Сярод апошніх — казка У. Караткевіча «Нямоглы бацька», з якой вучні знаёмяцца на ўроках літаратуры, а казкі «Чортаў скарб» і «Кацёл з каменьчыкамі» прапанаваны пяцікласнікам для пазакласнага чытання.

У сярэдніх класах прадмовай да аналізу твора можа быць паведамленне звестак пра асобныя бакі жыцця пісьменніка: пэўныя праблемы, якія цікавыя дадзенаму ўзросту, або тыя аспекты біяграфіі, што маюць непасрэдныя адносіны да твора. З гэтай прычыны ўступнае слова настаўніка грунтуецца на старонках з жыццяпісу пісьменніка «Дарога, якую прайшоў» і ўспамінах яго сястры «З табой мы адны перад богам...» [10], што дазваляе вучням зрабіць першыя крокі па асэнсаванні такіх каштоўнасцей, як радзіма (малая і вялікая), яе гісторыя; сям'я і сямейная гісторыя як частка гісторыі Радзімы;



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

родная прырода; культура; творчасць. Прычым каштоўнасныя адносіны арганічна ўвасоблены ў мове і стылі.

Неабходна суаднесці новае з тым, што ўжо вядома (вынікі аналізу верша «Бацькаўшчына»), бо такое суаднясенне, з пункту погляду псіхалогіі, забяспечвае паўнату ўспрымання і трываласць запамінання як апора на міжсістэмныя асацыяцыі, а ў дыдактычным аспекце магчымасць пераносу наяўных ведаў павышае цікавасць да новых ведаў. Адносіны У. Караткевіча да Радзімы, выяўленыя ў ягоным жыццяпісе, бадай што тоесныя мастацкай формуле «О, як добра, як прыгожа жыць!» з верша «Бацькаўшчына». Непасрэдныя адносіны да аналізу казак пісьменніка мае ўрывак з успамінаў сястры У. Караткевіча пра ўплыў на яго асобу дзеда, Васіля Юльянавіча Грынкевіча.

Другі аспект уступных заняткаў — тэарэтыка-літаратурны, але ён не выключае выхаваўчага, а акумулюе яго. Вучням важна асэнсаваць спецыфіку аўтарскай казкі. Метадам параўнання рэалізуецца пастаўленая задача: калі народная казка перадае адносіны народа да пэўных з'яў, то літаратурная — погляд на іх пісьменніка. На змест літаратурнай казкі істотна ўплывае асоба аўтара і аказвае выхаваўчае ўздзеянне на асобу чытача.

Настаўнікам рэкамендуецца пачаць вывучэнне казак У. Караткевіча з казкі **«Чортаў скарб»**, бо, яна, дзякуючы стылявой адметнасці, даступнасці і адпаведнасці ўзроставым асаблівасцям малодшых падлеткаў, у найбольшай ступені спрыяе разуменню аўтарскай пазіцыі.

Звычайна казка пачынаецца мастацкай формулай, якая адразу ж прыцягвае ўвагу чытача (слухача). Для замацавання гэтай жанравай уласцівасці казкі, а таксама з мэтай далейшага асэнсавання арыгінальнасці казкі «Чортаў скарб» варта прапанаваць наступныя заданні:

– перакласці на «казачную» мову такія выразы: *вельмі далёка, настойліва прасіць, павольна ісці;*

– згадаць лікі, характэрныя для казачнай мовы, і прывесці прыклады з казак. Затым, пасля ўзорнага чытання настаўніка і лексічнай работы, звяртаемся да каменціраванага чытання, мэта якога — выявіць асаблівасці літаратурнай казкі як жанру.

Казка складаецца з казачніка, матэрыялу, выканання, аўдыторыі [11]. Урок будуецца так, каб ніводзін з гэтых кампанентаў не застаўся па-за ўвагай. Галоўны з іх — асоба «казачніка», яго творчая адоранасць,



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

светапогляд, мастацкія схільнасці. Ужо сама казачная формула пралівае святло на гэтую асобу. Паколькі казка першапачаткова ўзнікла як фальклорны твор, мэтазгодна, выкарыстоўваючы прыёмы вуснага малявання ці ілюстравання, узнавіць месца яе выканання, «сцэнічную пляцоўку», дзе таленавіты апавядальнік трымае экзамен перад аўдыторыяй.

Наступная вучэбная сітуацыя — аналіз казачнай формулы. Вучні самастойна прыходзяць да высновы, што У. Караткевіч замілавана гаворыць пра сваю Радзіму, знаходзіць для яе апісання па-мастацку дасканалыя словы. Вызначаецца роля шматкроп'я, якое красамоўна сведчыць, што пералік айчынных багаццяў можна працягваць.

Азнаёміўшы чытачоў з месцам дзеяння, аўтар прадстаўляе ім герояў казкі. Усякая казка заўсёды апавядае аб нечым незвычайным. Таму патрабуецца назваць незвычайныя з'явы і ў казцы «Чортаў скарб», напрыклад, тое, што даўным-даўно на Беларусі вадзіліся чэрці. Аналізуюцца аўтарскія адносіны да герояў, адзначаецца павага да клопатаў Лесавіка і Вадзяніка. У гарэзлівым чарцяняці казачнік дапамагае сваім чытачам пазнаць і сябе, а аўтарскія адносіны да гэтага малога шкодніка ўвасабляюцца ў словах з памяншальна-ласкальнай формай, якія характарызуюць і героя, і спагадлівага аўтара.

Менавіта дзіцячая аўдыторыя прадвызначыла змест і форму гэтай казкі. Функцыя яе яўна выхаваўчая, але, каб не збіцца на аголены дыдактызм і маралізатарства, трэба ісці ад мастацкіх асаблівасцей твора. Адна з іх — мяккі, лагодны гумар. Паглыбляючыся ў змест казкі, вучні здолеюць дадаць яшчэ адзін штрых да партрэта апавядальніка — пачуццё гумару. Варта выбарачна зачытаць афарбаваныя гумарам эпізоды, бо гумар — спецыфічны выхаваўчы сродак, здольны аб'яднаць радаснае здзіўленне са спачуваннем, перажываннем, шкадаваннем. Прырода смеху гуманістычная; дасціпнасць узбагачае асобу, бо мае на ўвазе эрудыцыю, добры эстэтычны густ, здольнасць аналізаваць і параўноўваць. Прывіць пачуццё гумару нельга, але развіваць яго, дбаючы пра спецыфіку навучання літаратуры як «мастацтва спасцігаць мастацтва», неабходна. «Паколькі літаратура — гэта мова вобразаў, асаблівы спосаб мыслення, то зусім зразумела, што і логіка пазнання гэтага школьнага прадмета,



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

метадалогія і тэхналогія навучання яму — своеасаблівая. Спецыфічны змест патрабуе і адпаведных падыходаў» [12, с. 70].

Шырока выкарыстоўваецца метад творчага чытання ў разнастайнасці прыёмаў: выразнае чытанне з абгрунтаваннем яго асаблівасцей, багацця інтанацый; вуснае славеснае маляванне; засяроджваецца ўвага вучняў на эмацыянальнай танальнасці ўрыўкаў. Гэта дае магчымасць не толькі суперажываць з героямі, але і глядзець на твор у цэлым, заўважаць і ацэньваць некаторыя асаблівасці эстэтычнай формы, радавацца майстэрству пісьменніка — дакладнасці і трапнасці яго слова, веданню чалавека і прыроды, гумару. Чытанне па ролях — улюбёны від дзейнасці вучняў на ўроку. Удалы ўрывак для мастацкага чытання — размова Янкі з чортам. Апавяданне пра чорта ў мядзведжых абдымках дазваляе зрабіць вывад пра выяўленчы патэнцыял роднага слова і паглыбіць паняцце пра сінонімы.

Фразеалагізм «задаць чосу» як бы расшыфроўваецца сінанімічным радам дзеясловаў (*мяць, валтузіць, калашмаціць, круціць, дзерці*). Красамоўны і рад сінонімаў-дзеясловаў руху: *узляцеў, выкараскаўся, скаціўся, чкурнуў*. Адзначаецца, якія з дзеясловаў ужыты ў прамым, якія — у пераносным значэнні. Разнастайныя прыёмы чытання даюць магчымасць знітаваць у адзінае цэлае такія кампаненты казкі, як матэрыял і выкананне.

І ўсё ж казка найперш не лінгвістычны матэрыял для назіранняў, а сродак выхавання. Мэта казачнікаў «заключаецца ў тым, каб якой бы там ні было цаной выхаваць у дзіцяці чалавечнасць — гэту дзіўную здольнасць чалавека хвалявацца з-за чужых няшчасцяў, радавацца радасцямі іншага, перажываць чужы лёс, як свой. Казачнікі клапоцяцца аб тым, каб дзіця з малых год навучылася ў думках удзельнічаць у жыцці ўяўных людзей і жывёл і вырвалася б такім чынам за вузкія рамкі эгацэнтрычных інтарэсаў і пачуццяў. Уся наша задача заключаецца ў тым, каб абудзіць, выхаваць і ўмацаваць ва ўспрымальнай дзіцячай душы гэтую каштоўную здольнасць суперажываць, спачуваць, сурадавацца, без якой чалавек — не чалавек» [13, с. 178—179].

Патрабавальны да сябе апавядальнік, У. Караткевіч строга захоўвае пачуццё меры ў дыдактызме, не аслабляючы, між тым, выхаваўчага ўздзеяння казкі. Знаходзім у казцы фальклорныя элементы, якія і працуюць на вырашэнне выхаваўчых задач, і адначасова вобразна адлюстроўваюць



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

рэчаіснасць: прыказкі, прымаўкі, устойлівыя выразы. Сам выбар вучнямі трапных выслоўяў сведчыць аб тым, што яны вымагаюць ад чытача больш патрабавальна прыгледзецца і да сябе, і да тых, хто побач.

Казку лёгка пераказваць, бо яна створана для таго, каб жыць у вуснай мове. Эпізод сустрэчы Янкі з чортам на восеньскім полі прапануецца вучням для вуснага малявання. Яны вылучаюць у гэтым эпізодзе шэраг карцін, якія ў выніку складаюць яго сюжэт. У дадзеным фрагменце тэксту выяўляюцца і рысы характару персанажаў, і асабовыя характарыстыкі аўтара, які дбае пра тое, каб яго юным субяседнікам было не толькі цікава, а і карысна прачытаць казку. Даруйце, сцвярджае аўтар, і вам даруецца.

Пяцікласнікі жыва рэагуюць на ўсё, што адбываецца на ўроку: на цікавую інфармацыю, на рэплікі, на жарты, таму, бясспрэчна, кожная хвіліна ўрока выхоўвае. У ацэнцы літаратурных герояў вучні кіруюцца перш за ўсё маральнымі крытэрыямі, прымаючы ўсё добрае, смелае, дужае і адмаўляючы злое. Як паказвае практыка, ідэйны змест вобраза Янкі ім бачыцца так: дужы чалавек павінен быць добрым, каб яго сіла была скіравана на карысць людзям, а не на бяду.

Творча падыходзячы да казачнага сюжэту, У. Караткевіч часам адыходзіць ад традыцыйных канонаў, уводзіць новыя дэталі (пра гэта сведчаць, у прыватнасці, казачная формула і казачныя лікі, матывіроўка ўчынкаў герояў), каб мастацкім словам пераканаць дзіця ў пэўных нормах паводзін, што садзейнічае каштоўнаснаму засваенню ідэйнага зместу твора. Нездарма, вызначаючы галоўны ўрок, які выкладае чытачу У. Караткевіч, вучні звяртаюцца да фіналу казкі, акцэнты ў якім расстаўлены вельмі выразна: свавольнік-чорт, страціўшы ўсялякую меру гарэзавання, згубіў права на закапаны скарб. Затое працавіты, цярплівы і добры Янка дабіўся дабрабыту і для сваёй сям'і, і для ўсіх аднавяскоўцаў. У пашане засталіся і мядзведзь з кошкаю, якія «зрабілі калісьці так, што табе добра». І ўсе пераможцы вялікадушна даравалі чорту.

Усе ніці аналізу збярэ ў сябе заключнае пытанне: «Пра які яшчэ незвычайны скарб, не называючы яго, вядзе гаворку пісьменнік на працягу ўсёй казкі?» *(Пра нашу Радзіму)*.

Работу над казкай «Нямоглы бацька» варта пачаць з чытання ўрыўка пра норавы «дзікіх людзей», які вяртае чытача ў мінулае нашай краіны. Аб аддаленасці гэтага мінулага можна меркаваць па



Рэпазіторый БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

тым, што Месяц і Неба ў першым сказе — уласныя назоўнікі. Адсюль версія пра «мастацкі час» як пра час паганства, калі людзі абагаўлялі з'явы прыроды.

Аналіз казкі **«Нямоглы бацька»** падпарадкаваны вырашэнню наступнай праблемы: як дзікія людзі здолелі стаць людзьмі? Твор патрабуе лексічнага каментарыя, які вымагае ад настаўніка творчасці, каб не ператварыцца ў шаблон. Адным з прыёмаў лексічнага каментарыя можа быць уключэнне ўсіх незразумелых слоў у звязны тэкст, пры якім адбываецца больш хуткае далейшае іх асваенне і ўключэнне ў актыўны слоўнік, бо магчыма частковае разуменне сэнсу слова ў кантэксце, напрыклад: «*Ветах* вісеў пасярэдзіне неба, нібы на цвіку. Ён адбіваўся ў вадзе невялікага *става* і абыякава пазіраў на тое месца, дзе ад моцнага ўдару **перуна** старая каменная *капліčка* ператварылася ў *крушню*».

Вучні 5-га класа павінны ўмець складаць план твора ці ўрыўка з яго. Пры нятворчым выкладанні літаратуры гэты прыём універсалізуецца і замяняе сабою іншыя, развіваючыя. Эфектыўнай нам уяўляецца работа з тэкстам па апорах, у якасці якіх выступаюць арыгінальныя моўныя канструкцыі, выпісаныя на дошцы, напрыклад:

кароткай касою ў місцы касіць;
рыхтуйся ваўкоў гадаваць;
насіце на руках бацькоў.

Такое вывучэнне тэксту, з аднаго боку, з'яўляецца выбарачна-скіраваным, а з другога — звязана з пільнай увагай да слова ў кантэксце. Пасля гэтай работы творчая актыўнасць вучняў мабілізуецца на складанне плана, пытанні якога не павінны дубліраваць па форме зыходныя апоры, але ў іх аснове ляжыць той жа змест.

Гуманістычны пафас казкі дае шырокія магчымасці для выхавання духоўнасці, і найперш праз выяўленне аўтарскай пазіцыі. Вучні знаходзяць як яе прамое, так і ўскоснае выяўленне праз наступныя пытанні і заданні: «Знайдзіце ў тэксце прамы зварот да чытача. Якія аўтарскія пачуцці да “дзікіх людзей” гучаць у ім?»



Рэпазіторый БарДУ
PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Творчага падыходу ў аспекце праблемы патрабуе аналіз фразы, якая, на першы погляд, здаецца бессэнсоўнай. «Ты, гэта, Пятро... таго... — сказаў урэшце другі сусед, Максім. — Ты, значыцца... гэна». Падводзім вучняў да разумення ролі паэтычнага сінтаксісу як выяўленчага сродку мовы. Знакі прыпынку перадаюць душэўны стан героя, у якога не хапае слоў у складанай жыццёвай сітуацыі. Вучні знаходзяць адпаведны па змесце эпізод, які дазваляе «дэкадзіраваць» гэты стан: «Едуць вёскаю ў лес. Рэдкія сустрэчныя вочы хаваюць». Гэты сорам — таксама аўтарскае апраўданне «дзікіх людзей».

У казцы «Нямоглы бацька» пісьменнік малюе агульную канцэпцыю гістарычнага шляху народа, дзе нягод было больш, чым радасцей. Гэта вымушала людзей рабіцца яшчэ больш дзікімі, пра што сведчыць фраза *«Цяпер дзяцей заб'ю, а пасля і сам»*. У такія часы маглі ўратаваць толькі годныя адносіны да бліжняга. У гэтым сэнсе вучні па-іншаму трактуюць выраз *«як ты віншуеш, так і цябе аддзякуюць»*. Магчымыя варыянты адказаў:

— Пятро нёс свайго бацьку на спіне, як і ён некалі яго малога.

— З суседзямі падзяліліся бацькавым сакрэтам — ва ўсіх урадзіла жыта, як Бог аддзячыў. А калі ваявалі, то жыта ўсё ў ямах папяклося — ні сабе ні людзям.

— Нават такому, як Гнат, бацька ў цяжкі час адплоціць дабрынёю за зло. «Добрай мудрасцю за злосную дурасць».

Аналіз адпаведных эпізодаў дазваляе вучням выявіць асноўныя рысы вобраза Гната: ён скнара, ліслівец, крывадушнік, падхалім. Аднак, адзначае аўтар, Гнат адзіны такі вылюдак у вясковай грамадзе. Настаўніку варта прыгадаць выраз з казкі «Лебядзіны скіт»: «Калі чалавек моцна захоча — ён зробіць нават немагчымае». Узнікае пытанне «Як гэты выраз стасуецца да вобраза Пятра?» *(Пятро першы, хто паўстаў супраць старога Закона, супраць усіх і перамог. Ён змагар за справядлівасць, што пацвярджаюць словы героя, скіраваныя супраць несправядлівага стаўлення да бацькоў: «У соты б раз я такі Закон пераступіў»)*.

Падагульняем: такім чынам, дзікія людзі сталі людзьмі, бо спачатку асмеліліся, а потым і навучыліся шанаваць дабрыню, мудрасць, жыць у добрым ладзе з суседзямі, што спрадвеку было характэрна для нашага народа. Выраз *«Знішчалі "ўчора" і таму не мелі права на "заўтра"»* ўяўляе сабой не што іншае, як мастацкую формулу гістарычнай



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

свядомасці. Вучні найперш тлумачаць рэалістычны сэнс гэтага выслоўя: людзі знішчалі сваіх састарэлых бацькоў, а таму таго мусілі чакаць ад уласных дзяцей. Аднак неабходна падвесці школьнікаў і да больш глыбокага асэнсавання праблемы: без вопыту і мудрасці продкаў немагчыма будаваць жыццё нашчадкам. У заключным слове настаўнік адзначае, што ўрокі гісторыі паўтараюцца, але, на шчасце, працэс ператварэння дзікіх людзей у чалавекаў незваротны. Прыкладам можа служыць наша больш блізкая трагічная гісторыя: Вялікая Айчынная вайна, блакада Ленінграда. Пра яе са шчымлівым болем напісалі жорсткую праўду рускі пісьменнік Данііл Гранін і беларус Алесь Адамовіч. Голад вымушаў людзей ісці на тое, каб выбіраць, каго з дзяцей ратаваць, аддаючы ўсю ежу, а каго аддаць на галодную смерць. Інакш загінулі б усе.

Але страшную логіку перамагала мацярынскае пачуццё. Вось прыклады з «Блакаднай кнігі»: «Божа, ты бачыш, як я пакутую, якая галодная і якія галодныя мае дзеці. Няма больш моцы. Пашлі нам смерць, толькі каб мы памерлі адразу ўсе» [14, с. 400—401]. Героі У. Караткевіча таксама кіруюцца пераканнем «жыць разам і паміраць разам».

Гісторыя беларусаў не песціла. «Чалавек шмат на што здольны, — сцвярджаюць і аўтары «Блакаднай кнігі», — вельмі на многае, але як горка, што жыццё зноў і зноў патрабуе ад яго неймаверных ахвяр» [14, с. 402].

Той, хто забыў сваё мінулае, асуджаны зноў перажыць яго — нагадваюць нам лепшыя творы сусветнай літаратуры, сярод іх — і творы У. Караткевіча.

Адной з дамінант патрыятычнай свядомасці асобы з’яўляюцца адносіны да экалагічнай сферы Радзімы. Свядомае мысленне, свядомыя экалагічныя паводзіны можна сфарміраваць толькі пры ўмове змянення прыродаспажывецкай псіхалогіі, якая пануе зараз, на прыродазберагальную. Толькі дзякуючы паважлівым адносінам да прыроды старажытны чалавек адаптаваўся да яе і эвалюцыянаваў у чалавека разумнага. Даволі глыбокую даўніну маюць традыцыі добрых стасункаў нашых продкаў з прыродным наваколлем, што адлюстравалася ў фальклоры яшчэ з дахрысціянскіх часоў. Дзякуючы духоўнаму погляду на навакольны свет фарміраваўся і старажытны народны каляндар. У беларускім нацыянальным характары моцныя пачаткі альтруізму, любові да людзей, жывёл,



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

раслін, а светапогляд першапачаткова абумоўліваўся пантэізмам. Адзін з сучасных праектаў сістэмы сацыяльнага ўладкавання [15] мае на ўвазе «адраджэнне шматвяковай культуры, якая абараняе нас ад памылак навукова-тэхнічнага прагрэсу; адраджэнне нацыянальнага вопыту ашчаднага прыродакарыстання», дзеля чаго патрабуецца як навучанне неабходным ведам, так і адпаведнае выхаванне духоўнасці. Немагчыма вывучэнне культурнай спадчыны народа ў адрыве ад прыроды, што са старажытнасці і да сённяшняга дня натхняе майстроў на творчасць. У творах У. Караткевіча адчуваецца «не толькі радасць ад адзінства з прыродай, але і затоеная трывога за яе лёс» [4, с. 212]. Матывы еднасці жыцця людзей з жыццём прыроды і выяўленне духоўнай шчодрасці чалавека ў клопатах аб прыродзе выяўляюцца як дамінантныя пры вывучэнні ў 5-ым класе апавядання «Былі ў мяне мядзведзі».

Даследаванне генезісу маральнай свядомасці паказвае, што яна паўстае не як простае засваенне правілаў і паводзін, а як працэс пераўтварэння і інтэрыярызацыі тых норм і правіл, якія прад'яўляюцца грамадствам.

У малодшым падлеткавым узросце ідэал дзіцяці ўвасабляецца ў канкрэтным чалавеку і звычайна звязваецца з той сітуацыяй, у якой дзейнічае абраны герой. Гэта абумоўлівае выхаваўчы эфект твора дзякуючы адметнасці асобы аўтара і гуманістычнаму зместу вобразаў, што раскрываецца ў першую чаргу праз мову твора. На занятках па вывучэнні апавядання «Былі ў мяне мядзведзі» работа над словам вядзецца ў непарыўнасці двух яе відаў, лексічнага і арфаграфічнага.

Такі прыём «спадарожнага навучання» [16] выхоўвае культуру мовы і ўвагу да слоў і выразаў, што будуць ужыты пры аналізе. Інакш не вычэрпваецца ўвесь змест тэксту, школьнікі прывыкаюць браць яго сэнс павярхоўна. Са свайго боку, настаўнік тактоўна ставіцца да вучнёўскага няведання, заахвочвае і стымулюе ўстаноўку на яго пераадоленне.

Сістэма работы са словам пры вывучэнні апавядання «Былі ў мяне мядзведзі» можа ўключаць у сябе такія заданні:

– замена фразеалагізмаў з тэксту сінанамічнымі выразамі;

– падбор аднакарэнных слоў да слоў *«мядзведзь»* і *«лес»* і правільнае іх напісанне;

– падбор сінонімаў да слоў *«нетры»*, *«кленчыць»*, *«карбач»*;

– пастаноўку націскаў у словах і інш.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Увага да слова змяшчае і такі аспект, як уменне бачыць і асэнсоўваць яго склад, агульны сэнс кораня, усе «пералівы значэнняў» [17], якія ўзнікаюць пры саюзе кораня і афіксаў *(лапэта, задкаваў)*. Актыўнае валоданне марфемамі айчынных слоў дапамагае зразумець многія запазычаныя словы *(анімаліст, дынастыя)*.

Творчае заданне выпісаць словазлучэнні, што абазначаюць колеры, спрыяе абвастрэнню ўвагі да тэксту і далучэнню чытача да творчых знаходак пісьменніка, такіх як *«колер турэцкага тытуню»*, *«іржавая лістота»* і інш., якія перадаюць разнастайнасць прыродных з'яў на «найпрыгажэйшай у свеце зямлі»...

Акрамя адчування слова, настаўнік абуджае ў вучняў здольнасць да эмпатыі, спасціжэння эмацыянальнага стану герояў твора, а праз яе адбываецца зварот да рэфлексіі, якая фіксуе градацыю пачуццяў галоўнага героя апавядання да свайго роднага кутка: замілаванне — туга — трывога — боль. І калі прырода двух першых адценняў пачуцця тлумачыцца натуральна, то апошнія абумоўлены спачатку ваеннай навалай, а затым нядбайным, а часам і злачынным стаўленнем да прыроды, з якою герой зnative «з першай хвіліны, у якую пачаў усведамляць сябе». Праз эмпатыю пачынаецца асэнсаванне ідэі твора на ўсім шляху аналізу, у час якога акцэнтуецца ўвага на пабудове сюжэта (складанне плана), вылучаюцца эпізоды, істотныя для ўсведамлення ідэі, асвойваюцца прыёмы паказу літаратурнага героя — і ўсё гэта праз прызму мастацкага стылю У. Караткевіча.

Зместам другога ўрока з’яўляецца працяг знаёмства з мядзведзікам Бурыкам. Вучні прыходзяць да высновы, што У. Караткевіч піша пра медзведзяня як пра чалавека, а паколькі яно малое, то як пра дзіця.

Пасля чытання адпаведнага ўрыўка з тэксту выбіраюцца ўсе іншыя апісанні Бурыка. Дэманструюцца вучнёўскія малюнкі і пераказваюцца адпаведныя ім эпізоды з тэксту. Вылучаецца галоўны прынцып яго «сямейнага выхавання»: узялі, то цярпець маем. Згадваецца выслоўе А. Сент-ЭкзюпеLicense: «Ты назаўсёды адказны за ўсіх, каго прыручыў».

Бурыку нядрэнна жывецца ў Сяргейкавай сям'і, таму вучні не адразу асэнсоўваюць сцвярджэнне Маркі: «Пакрыўдзілі мы яго. Трэба выправіць, як здолеем». Перш чым высветліць, што, чаму і як выпраўляць, настаўнік актуалізуе веды вучняў пра стылі мовы, элементы якіх можа ўключаць у сябе мастацкі стыль. Тэкст даследуецца на наяўнасць звестак пра бурага мядзведзя, якія



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

параўноўваюцца
з навуковай інфармацыяй. Каб Бурык не страціў здольнасці арыентавацца ў прыродным асяроддзі, каб «лес не збыткаваўся з яго», мядзведзіка належала выпусціць. Узнікае дылема: любіць — і не адпускаць, каб усім было добра з ім, або любіць — і адпусціць, каб добра было яму. Вучні разам з аўтарам-апавядальнікам вырашаюць яе на карысць Бурыка, які «ўсё ж быў народжаны для свабоды». Усведамленне гэтага прыйшло да Сяргейкі, калі Бурыка давялося пасадзіць на ланцуг. Аўтарская пазіцыя надзвычай выразная: «Не дай бог вам бачыць гэта, калі вы любіце звяроў і людзей!» — а тым больш рабіць супраць іх малыя і вялікія злачынствы. Важна, каб міма ўвагі вучняў не прайшло
і аўтарскае ўдакладненне «...тады яшчэ паляванне на мядзведзяў не было забаронена». Падрыхтаваны вучань робіць паведамленне паводле старонак Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь пра колькасць жывёлін гэтага рэдкага віду і тэндэнцыі яе змянення.

Адзначаючы кульмінацыю дзеяння як паказчык майстэрства празаіка будаваць дынамічны, займальны сюжэт, выяўляем і маральны змест эпізода: за дабро аддзячыцца дабром, і Бурык уратоўвае Сяргейку ад смерці. Паміж Чалавекам і Прыродай магчымы і павінны быць гарманічныя адносіны.

Сюжэт — нібы абалонка тэксту, якая адначасова і выяўляе галоўную думку, і маскіруе яе. І для пяцікласнікаў у мастацкім творы вылучыць галоўную думку бывае цяжка нават у тым выпадку, калі фабула «працуе» на гэта. Але, ідучы шляхам абагульненняў рознага маштабу (як у кантэксце дадзенага твора, так і на ўзроўні агульначалавечых духоўных каштоўнасцей), вучні павінны ў сваіх высновах рухацца ў наступным напрамку: трэба рабіць так, каб тым, каго мы любім, было добра побач з намі; вайна — зло для ўсяго жывога і інш. Ідэя апавядання выходзіць далёка за межы займальнага сюжэту пра мядзведзіка Бурыка. Гэта робіцца відавочным для вучняў ужо пры параўнанні гэтага твора з вядомымі ім творамі У. Караткевіча, асабліва з вершам «Бацькаўшчына» і казкай «Чортаў скарб», у якой фінальная формула ўяўляе сабой шчымлівае прызнанне ў любові да роднай зямлі, да ўсіх, хто «дыхае і шуміць». «Дзеля нашай будучыні, — адзначае настаўнік, — мы павінны кіравацца спрадвечнымі этычнымі законамі. Не рабіць другому таго, што самому не міла. Браць у прыроды не больш, чым яна здольна аднавіць. Усё рабіць



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

прыгожа, з душою. Перадаць нашчадкам родны кут лепшым, чым атрымаў яго сам».

Творы У. Караткевіча на экалагічную тэму аказваюць выхаваўчае ўздзеянне на вучняў дзякуючы выразнай аўтарскай пазіцыі, выяўленай у адметным мастацкім стылі. Асэнсаванне таго, што мэтазгодныя, каштоўнасныя адносіны да прыроды былі ўласцівы беларусам на ўсім шляху іх гістарычнага развіцця, выступае адной з умоў фарміравання патрыятычнай свядомасці, сярод дамінант якой значнае месца займаюць адносіны да экалагічнай сферы Радзімы. Рэалізацыя міжпрадметных сувязей з мовай, гісторыяй, выяўленчым мастацтвам і прыродазнаўствам праз разнастайныя прыёмы творчай дзейнасці вучняў выклікае эмпатыю, эмацыянальнае заражэнне, якія ў далейшым могуць служыць асновай для сацыяльнай творчасці асобы адносна роднай прыроды.

Пачынаючы работу над казкай **«Лебядзіны скіт»**, актуалізуем звесткі аб тым, як узнікла задума твора. Далейшая праца звязана з высвятленнем часу і месца дзеяння ў казцы праз зварот да яе зачыну. Звяртаемся да гістарычнага каментарыя: Беларусь не была паняволена мангола-татарамі. Беларусы змагаліся з татара-мангольскімі набегамі ў 1259, 1275, 1277 гг. Аднак гэта былі менавіта наезды, уварванні. Беларусь ніколі не падпарадкоўвалася Залатой Ардзе, ніколі не ведала азіяцкай няволі.

Каларыт эпохі абумоўлівае асаблівасці лексікі твора, якая таксама патрабуе каментарыя, бо, сутыкаючыся з незразумелымі назвамі, чытач рызыкуе не спасцігнуць сэнсу твора. Але твор літаратуры мае на мэце менавіта мастацкае ўзнаўленне гістарычнай рэальнасці і ўзбагачае гісторыка-патрыятычную свядомасць, апелюючы найперш да яе эмацыянальных кампанентаў. Таму не варта злоўжываць каменціраваннем. Часам незразумелая назва не дае чытачу пэўнасці, але выклікае адчуванне сустрэчы з дзіўным, незвычайным і вельмі рэальным прадметам, якое, як таямніца мастацтва, знікае за падрабязным каментарыем. Незразумелыя дэталі выконваюць, такім чынам, яскравую эстэтычную функцыю. Гэта добра відаць на прыкладзе фразы *«Тут справа ідзе не пра бэркавец мёду і не пра лашт збажыны, а пра жыццё людзей»*. Нават калі чытач і не ўяўляе сабе такіх мер, як бэркавец і лашт, ён усё роўна разумее, што яны зусім мізэрныя ў параўнанні з каштоўнасцю чалавечага жыцця.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Прыкладны змест гутаркі:

1. Якім чынам адлюстраваліся гістарычныя падзеі ў казцы?
2. Назавіце адну з версій узнікнення назвы «Белая Русь».
3. Дакажыце, што «балотная Русь» у казцы — не што іншае, як наша з вамі Радзіма (прыгадваюцца геаграфічныя назвы, асаблівасці ландшафту).
4. На чым жа грунтуецца другая версія? Згадайце азначэнне легенды.

Нягледзячы на тое, што «легенда» — літаратуразнаўчае паняцце з канкрэтным сэнсам, пра яе кажуць яшчэ і так: гэта жыццё, якім яно павінна быць. Наступныя этапы работы прысвечаны высвятленню сутнасці жыццёвых скарбаў у разуменні асобных герояў і моўна-выяўленчых сродкаў іх увасаблення. Гэтаму будзе спрыяць характарыстыка вобразаў хана Батыя, паэта Юсуфі, старца. Значыць, легенда — гэта жыццё, якім яно павінна быць. Ці такім? «Усё ішло, як трэба. Наперадзе яны [татарскія палкі] сустракалі зялёныя палі, хаты ў садах і стракатыя агароды, а ззаду пакідалі толькі чорную пустэчу...» Вывад: мір — адзін з важнейшых жыццёвых скарбаў; усякая вайна — зло. Яно ўвасоблена ў вобразе Бату-хана.

Сярод уменняў, якімі павінны валодаць пяцікласнікі, — вылучэнне эпізодаў і дэталей, важных для характарыстыкі дзейных асоб; уменне знаходзіць выяўленчыя сродкі мовы і з дапамогай настаўніка вызначаць іх ролю ў стварэнні вобраза. Істотнай з’яўляецца самахарактарыстыка героя, пра што сведчыць прачытаны выраз *«Я, хан Бату, нясу на зямлю смерць»*, а таксама выбарачны пераказ эпізодаў, якія ўвасабляюць гэтае сцвярджэнне. Аднак знаёмства з кожным чалавекам, у тым ліку літаратурнай асобай, пачынаецца з яго знешнасці. Вучні адказваюць на пытанне, чыімі вачыма мы бачым Бату-хана.

— Мусіць, гэта канец свету прыходзіць, што такі твар бачу я *(Вачыма старца);*

— Бровы, падобныя да ляжачага сабакі; касыя вочы... *(Вачыма аўтара);*

— Твар хана... з'яўляецца ступнёю, якая не мае сораму *(Вачыма Юсуфі).*



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Як відаць з асаблівасцей партрэтнай характарыстыкі, у пачварным аблічча хана ўвасоблена найвялікшае зло — вайна, а яго скарбы ўрэшце ператворацца ў гару чарапоў.

Чытанне па ролях наступнага ўрыўка дае вучням магчымасць усвядоміць сапраўдныя жыццёвыя каштоўнасці: працу, талент, песню, свабоду, мову, чэсць, служэнне на карысць сваёй Радзіме, носьбітамі якіх з'яўляюцца Юсуфі і старац. Але ідэйны змест вобраза Юсуфі вучнямі ўсведамляецца не адразу. З дапамогай настаўніка, шляхам аналізу выказванняў паэта, вучні прыходзяць да вываду, што Юсуфі — суддзя ў адвечнай спрэчцы паміж дабром і злом.

Аналіз казкі ёсць першы крок у асэнсаванні пяцікласнікамі дыялектыкі нацыянальнага і агульначалавечага. Гэтаму спрыяе прыём падбору да беларускіх прыказак і прымавак адпаведных па сэнсу рэплік паэта Юсуфі. На дошцы, у адрозненне ад табліцы 1, выслоўі запісаны не ў дадзенай адпаведнасці, яе трэба ўзнавіць. Гэты від пазнавальнай дзейнасці можа быць рэалізаваны таксама ў форме тэсту на ўстанаўленне адпаведнасці.

Адзначаныя маральныя запаведзі і даюць адказ на пытанне, якім павінна быць жыццё згодна з уяўленнямі пра дабро. Зачытваюцца выразы:

Памяць маці сваёй і героя ніхто не рашыўся зняважыць.
...Я буду гаварыць яе, праўду. Што ты зробіш з ёю?
Для зайца самае каштоўнае камыш, а для мужчыны — чэсць і інш.

Зачытваецца таксама малітва старца. Вытокі незвычайнага, сцвярджае пісьменнік, — у лепшых чалавечых якасцях. Старац аказаўся здольным здзейсніць цуд, бо верыў і любіў.

Абагульняючая гутарка мае на мэце яшчэ раз вярнуцца да тых «скарбаў», каштоўнасцей, якія ўвасабляюцца ў творах У. Караткевіча. Акцэнтуецца ўвага на свядомым засваенні паняцця «патрыятызм». Паколькі адзін з кампанентаў мастацкай мадэлі гісторыка-патрыятычнай свядомасці — нацыянальны характар, то заключным момантам дадзенага ўрока варта зрабіць каменціраванне фразы хана: *«Едзем з гэтай страшнай зямлі, дзе плачуць нават камні і змагаюцца нават слабыя»*.

Ходу вучнёўскіх разважанняў патрэбна надаць такі кірунак: «Калі для аўтара яго Бацькаўшчына светлая, для Юсуфі гэтая зямля —



Рэпазіторый БарДУ
PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

добрая, то страшная яна для таго, хто нясе зло. Тады «змагаюцца нават слабыя» (гэта, напрыклад, добра вядома нам з часоў Вялікай Айчыннай вайны). Але беларусы маюць чулую душу, яны не абыякавыя. І ў час бяды людзі, такія розныя, аб'ядноўваюцца і перамагаюць».

Цікавасць і складанасць выклікае праблемнае пытанне, якое можа быць прадстаўлена ў двух варыянтах:

— Супастаўляючы тэксты казак «Лебядзіны скіт» і «Нямоглы бацька», адкажыце, якія падзеі адбываліся раней? (Або: Які Закон дзейнічае ў казцы «Лебядзіны скіт»? Абгрунтуйце адказ.)

Т а б л і ц а 1

| Рэплікі | Прыказкі і прымаўкі |
|---|---|
| «Ты... заваяваў палову зямлі, не пасадзіўшы на сваёй нават рэпы» | Без працы няма чаго хлеба шукаці |
| «Той, хто не давярае чэсці людзей, сам не мае яе» | Хто людзям не верыць, той і сабе веры не дасць |
| «Імёны вашыя хай не апаскудзяць слыху патомкаў, бо на вашых вачах забіваюць багатура...» | Ліхая забава — вялікая няслава |
| «Лепшая спадчына — сумленная песня» | У крывым воку ўсё крывое |
| «Што ты возьмеш з сабою і што пакінеш на зямлі, акрамя чарапоў?..» | Чарвяк капусту з’ядае, а сам раней прапа-дае |

Версія адказу: калі з'явілася магчымасць выратавання, «...матары выштурхоўвалі наперад дзяцей, жаніхі імкнуліся выратаваць мілых нявест сваіх, дзеці — старых сваіх бацькоў». Значыць, у казцы «Лебядзіны скіт» дзейнічае ўжо новы Закон, і падзеі адбываюцца пазней.

Як бачым, казкі У. Караткевіча з'яўляюцца арыгінальнай мадыфікацыяй жанру і адметныя як па праблематыцы, так і па мастацкай вобразнасці і кампазіцыйнай структуры. Арыгінальная манера пісьма і рамантычнае светабачанне пісьменніка адпавядаюць дадзенаму перыяду чытацкага развіцця малодшых падлеткаў, які характарызуецца прамой і непасрэднай сувяззю паміж эмоцыямі і асэнсаваннем зместу твора, а таксама скіраванасцю дзейнасці і дапытлівасці да знешняга свету.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Увага пісьменніка да дынамікі ўнутранага стану герояў, даследаванне незвычайных з'яў пры адсутнасці залішняга маралізатарства абумоўлівае высокі выхаваўчы патэнцыял яго казак. Казкі У. Караткевіча, у якіх мастацкі вопыт пісьменніка спалучаны з лепшымі традыцыямі народнай педагогікі, выхоўваюць любоў да Радзімы, павагу да продкаў, спрыяюць фарміраванню свядомасці маленькага чытача.

Твор **«Зямля пад белымі крыламі»** (7 клас) у жанравых адносінах вызначаны як нарыс, але ў ім прысутнічаюць выразныя рысы эсэ. Яно азначаецца як форма інтэлектуальна-эмацыянальнага самавыяўлення індывіда, што захоплівае і прастору сакральнага (метафізічнага), і прастору прафаннага (побытавага). У свой час эсэ адкрыла еўрапейскаму чалавеку каштоўнасць суб'ектыўнага мыслення і каштоўнасць індывідуума як носьбіта гэтай суб'ектыўнасці. Роля гэтага літаратурнага жанру ў фарміраванні індывідуальнай свядомасці, у тым ліку патрыятычнай, неацэнная. У караткевічаўскім цыкле мастацкіх нарысаў пра Беларусь, у шчырай і непасрэднай размове пра самае дарагое, гучыць высокі патрыятычны пафас. Дакументальнасць жыццёвага матэрыялу, спалучаная з назіральнасцю пісьменніка, яго ўвагай да жыццёвых падрабязнасцей і ўласцівай яму адметнасцю стылю, аказваюць вялікі ўплыў на асобу вучня. Работу над творам мэтазгодна праводзіць на працягу трох урокаў:

1) «Усе мы з хат»;
2) «Хлеб і да хлеба»;
3) «Людзі зямлі беларускай».

Вывучэнне нарыса-эсэ дае багатыя магчымасці для развіцця творчых здольнасцей вучняў. З гэтай мэтай, а таксама дзеля забеспячэння нагляднасці вучні атрымліваюць папярэднія заданні: намаляваць канкрэтную, «бабуліну», вёску або тую, якая ўявілася з аўтарскага апісання тыповай беларускай вёскі; скласці тэматычныя слоўнікі «Колеры ў жыцці беларуса», «Прылады працы», «Посуд» і інш. Увага да этнаграфічных элементаў на дадзеным этапе зробіць працэс далейшага вывучэння твораў беларускай літаратуры больш эфектыўным, паколькі сістэматычны курс «Этнаграфія Беларусі» ў айчыннай агульнаадукацыйнай школе адсутнічае. Эпіграфам да цыклу ўрокаў па творы будуць словы У. Караткевіча: «Я хачу... даць вам ключ



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

ад нашага дома, каб далей ужо вы асвойваліся ў ім самі, каб добра ведалі сваё месца ў гэтым жыцці».

Уступнае слова настаўніка з элементамі гутаркі акцэнтуе ўвагу вучняў на незвычайнасці гэтай кнігі адносна як гісторыі яе напісання, так і загадкавасці назвы, і адметнасці формы, што відаць ужо з уступу. Пасля выразнага чытання ўступу ідзе работа з метадычным апаратам падручніка ў тэарэтыка-літаратурным аспекце; актуалізуюцца наяўныя веды пра адметнасць публіцыстыкі як жанру і выяўляюцца асаблівасці нарыса, што выцякаюць з прыроды публіцыстыкі. З аднаго боку, ва ўступе адзначаем тое, што «кніга напісаная сведкам, які многа бачыў на ўласныя вочы» ці чуў. Але, з другога боку, У. Караткевіч, «нібы дапытлівы, уважлівы і добры чараўнік, ішоў з цудадзейным ліхтарыкам па зямлі і высвечваў усё яркае, незвычайнае... Ён ішоў са сваёй любоўю, трывогай і болем за чалавека, за зямлю, дзе нарадзіўся і жыў» [18, с. 230]. А перадаць усе адценні сэнсу дапамагаюць мастацкія прыёмы і сродкі, якія публіцыстыка таксама актыўна выкарыстоўвае (сярод іх і гумар, ужо вядомы школьнікам па казках пісьменніка).

Кожны беларус павінен ведаць гэтую кнігу, бо яе называюць візітоўкай і мастацкай энцыклапедыяй Беларусі. А чаму менавіта так, вучням прапануецца адказаць пасля аналізу твора. У. Караткевіч вядзе нас да нашых вытокаў, у беларускую хату, якая стаіць у беларускай вёсцы. Узброіўшыся сцвярджэннем аўтара, што «ў кожнай беларускай вёсцы ёсць што паглядзець, толькі трэба ведаць, што глядзець», рушым у падарожжа.

Вылучыўшы агульныя рысы нашых беларускіх вёсак («*шмат зеляніны, шмат вады, шмат неба над галавою...*»), параўноўваем малюнкі вучняў з пункту погляду дакладнасці і мастацкасці. Развіццё падлеткаў не можа зводзіцца толькі да сузірання, назірання, пасіўнага ўспрымання эстэтычных каштоўнасцей. Вялікім імкненнем да самастойнай дзейнасці, самавыяўлення, уласцівым гэтаму ўзросту, абумоўліваецца неабходнасць актыўнага ўключэння іх у творчую дзейнасць, пры гэтым не толькі мастацкую творчасць, але і іншую мэтанакіраваную дзейнасць, якая выклікае станоўчыя эмоцыі. Ад вучнёўскіх малюнкаў пераходзім да твора, знаходзячы паміж імі паралелі, напрыклад: «*хаты патанаюць у садах*»; «*...здаюцца пагружанымі на дно глыбокага зялёнага возера*» і інш.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Затым у тэксце адзначаюцца асаблівасці некаторых вёсак, адметных або сваёй флорай і фаўнай, або помнікамі гісторыі, якая ўсюды пакінула свой след. Такія публіцыстычныя звесткі дапамагаюць разабрацца, хто мы і адкуль, але іх прэзентацыя ў творы адбываецца з дапамогай мастацкіх прыёмаў. «Слаўныя» хаты, «харошыя» хаты», — кажа У. Караткевіч пра хаты беларусаў, і гэта характарызуе не толькі іх гаспадароў, а і аўтара, які ганарыцца сваімі землякамі. Пасля гэтага «падыходзім» да канкрэтнай хаты. З мэтай нагляднага тлумачэння будаўнічай лексікі выкарыстоўваецца малюнак будынка знадворку. Маем права сцвярджаць, што, абсталёўваючы сваё жытло, беларус асноўваўся на «трох кітах». Два з іх называе настаўнік — трываласць і зручнасць. Трэці вучні вызначаюць самі — прыгажосць. У. Караткевіч актыўна разбурае стэрэатып маляваць жыццё беларускага селяніна ў шэра-чорнай гаме.

— А цяпер зойдзем у хату, і, хутчэй за ўсё, ключ нам не спатрэбіцца. Чаму? Адказ — у тэксце.

У беларусаў жыве выслоўе «Замок — ад добрага чалавека», каб паказаць, што гаспадароў проста няма дома (бо ліхога не спыніць і замок).

На гэтым этапе праводзіцца пісьмо па памяці (можна правесці вольную дыктоўку).

БЕЛАРУСКАЯ ХАТА

А цяпер зойдзем у беларускую хату. Выгляд яе для кожнай мясцовасці быў розны. Але найбольш тыповы выгляд быў такі. З трысцена быў уваход у хату. Ля ўваходу, справа, мыцельнік, месца для мыцця посуду і кухонных рэчаў. Пасля — печ. Печ — гэта цеплыня, здароўе застуджанаму, гарачая і смачная ежа. На поўначы Беларусі печ дужа вялікая і простая. На поўдні — меншая і мае шмат выступаў і ніш для глінянага посуду. Уся яна распісана кветкамі, дзяўчаткамі з каромысламі і конікамі. За печчу, на правай сцяне, — пол [нары] ці шырокія ложкі. Уздоўж астатніх сцен ішлі шырокія лавы. На іх сядзелі і ноччу маглі спаць, асабліва калі бывалі госці. Перад лаўкамі — стол, часцей, як і лаўкі, дубовы.

Злева ад уваходу стаялі куфры і ўзімку — гаспадыніны кросны. З упрыгожанняў былі абразы на покуце, тканыя посцілкі і налаўнікі і, вядома ж, ручнікі.

Каштоўнасць такіх відаў работы ў тым, што ўзбагачаецца слоўнік вучняў, яны практыкуюцца ў правільным вымаўленні і напісанні новых слоў — аб'ядноўваюцца задачы развіцця мовы і фарміравання граматнага пісьма. Па заканчэнні працы яшчэ раз акцэнтуецца ўвага вучняў на трыядзе «трываласць, зручнасць, прыгажосць» на прыкладзе



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Рэпазіторый БарДУ

ручніка, які ў сялянскай хаце быў і прадметам штодзённага ўжытку, і паказчыкам дабрабыту, і ўпрыгожаннем. У святле гэтага абмяркоўваецца складзены вучнямі слоўнік «Колеры».

Другі ўрок, «Хлеб і да хлеба», настаўнік пачынае невялікім уступным словам: «Разумнае ўладкаванне жыцця было ўласціва беларусу ў вялікім і малым, ад будаўніцтва хаты да вырабу і спарадкавання такой, напрыклад, рэчы, як...» (дэманструецца выява куфра). Рэч называецца па-руску, па-беларуску, затым у словазлучэнні: *сундук, куфар, куфар жыцця*. Робіцца вывад пра адметнасць нашай мовы пры ўсім яе падабенстве да рускай. Куфар якраз і ўвасабляе тое, аб чым кажуць: «Не хлебам адзіным жывы чалавек». Даследуецца змесціва куфра з улікам здольнасцей «інтэлектуалаў» (вучняў, якія пераважна мысляць аналітычна), «творцаў» (уладальнікаў крэатыўнасці)
і «практыкаў». Апошнія якраз і павінны назваць як мага больш прадметаў беларускага нацыянальнага адзення, бо яны найбольш уважлівыя да прыватных фактаў, дэталей, падрабязнасцей. «Інтэлектуалы» павінны будуць у выніку аналізу таго ж урыўка высветліць, ці з'яўляецца змесціва куфра ўмовай наступнага пажадання нявесце: «Ой, будзь прыгожа, як ружа; будзь здарова, як вада; будзь багатая, як зямля!»

Прыгажосць вучні павінны ўбачыць у гаме колераў, у майстэрстве вышыўкі і ўпрыгожання адзення, ва ўзорах ткацтва і пляцення карункаў, майстэрстве вырабу абутку. Здароўе — у адзенні з саматканых палотнаў, воўны, аўчыны. Як пісала Л. Геніюш: «Лён, воўна і залатыя рукі жанчын-беларусак — і чалавек апрануты хораша, цёпла і чыста» [18, с. 7]. Багацце для дзяўчыны — у колькасці і якасці пасагу, а для замужняй жанчыны — у яе дзецях. У даступнай форме настаўнік тлумачыць класу, што шматлікасць нацыі — важны фактар яе жыццяздольнасці, багацця і шчасця.

У пэўным сэнсе аналізуемы ўрывак дае і тлумачэнне слова «Беларусь» у дадатак да дзвюх ужо вядомых версій з казкі «Лебядзіны скіт»: апрануты ў саматканыя світкі, «натоўп сялян заўсёды здалёк выглядаў белым». А калі нават і шэрым, то як паставіцца ды выразу «*Душа, браце, і пад шэрым жупаном бывае не шэрая*»? Паводле тэксту вучні гавораць пра таленавітасць беларусаў. Для «творцаў» магчыма такое заданне: інсцэніраваць частку вясельнага абраду (зыходным



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

матэрыялам можа быць вяселле Гапона і Кацярыны ў паэме В. Дуніна-Марцінкевіча «Гапон»).

Пасля абгрунтавання згаданых аспектаў вяртаемся да сэнсу выразу «Куфар жыцця». Ён — як жыццёвы шлях жанчыны. Ён — як жыццё ўсёй сям'і. Настаўнік дадае, што яшчэ — і як пэўны лад жыцця беларускай сям'і. На падставе аналізу паэтычных радкоў Л. Геніюш вучні тлумачаць, чаму беларус спакойна, загадзя рыхтаваўся да смерці. Апорныя радкі: «...іх памяць і славу нашчадкі нясуць». Настаўнік падводзіць шасцікласнікаў да разумення выразу «...заслужыць мінулае і вартым быць яго».

Зачытваецца апісанне і разглядаецца план двара. Але паколькі ў такім выглядзе двор адыходзіць у нябыт, то ёсць сэнс звярнуцца да энцыклапедыі «Этнаграфія Беларусі», каб не пераблытаць прызначэнне кожнай з забудоў: *склеп, павець, клуня* і інш. Для засваення гэтых паняццяў можна прапанаваць вучням тэст на ўстанаўленне адпаведнасці. Неабходна зрабіць гэта таму, што падобная лексіка актыўна выкарыстоўваецца ў творах беларускай літаратуры і яе няведанне цягне за сабою сэнсавыя страты.

За дваром — агарод і сад. І там абавязкова знойдзецца лаўка пад яблыняй, грушай ці вішняй, дзе можна пасядзець у чаканні абеду. Бо калі ты беларус — ты любіш смачна паесці. А «без хлеба яда — да парога хада». Хлеб — гэта жыццё яшчэ і таму, што плесня на рошчыне загойвае нават раны, ад якіх вось-вось пачнецца гангрэна. «Ад хлеба жыццё і ад хлеба адужанне» [т. 4, с. 31], — піша У. Караткевіч у рамане «Каласы пад сярпом тваім». З усяго гэтага вынікаюць і адпаведныя адносіны беларуса да хлеба як да святыні. А якія яго адносіны да свайго апетыту? Зачытваецца анекдот, прыведзены аўтарам у тэксце нарыса. Вучні называюць сінонімы да слова «з’еў» і адзначаюць, што іх выкарыстанне — гэта сродак мастацкай літаратуры. Падрыхтаваны вучань знаёміць клас са слоўнікам «Першыя, другія і трэція стравы беларусаў», з чаго ўсе павінны выбраць (а гэта няпроста!), што б асабіста яны жадалі «ўмяць, змамоніць і ўбіць», а потым папіць. На гэтым этапе ўрока настаўнік можа прадэманстраваць класу кулінарную кнігу XIX стагоддзя «Літоўская гаспадыня», арыгінал якой быў у свой час знойдзены А. Мальдзісам у Магілёве. На падставе раздзела «Хлеб і да хлеба»



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

і некаторых рэцэптаў з дадзенай кнігі вучні змогуць прыйсці да высновы пра высокі ўзровень побытавай культуры беларусаў.

На заканчэнне размовы на ўроку варта зноў звярнуцца да тэксту нарыса: «І ў Маскве, і ў Кіеве, і ў Мінску, і ў хаце, і ў сталоўцы — амаль паўсюль ясце тыя ж самыя катлеты ды біфштэксы, носіце тыповыя вопраткі з падобных матэрыялаў, усё больш забываеце непаўторнасць і адметнасць жыцця той мясціны, адкуль вы родам. А да канца забываць пра гэта нельга». Таму што мы — беларусы, адметная чалавечая супольнасць на планеце Зямля.

Больш глыбокаму ўсведамленню гэтага спрыяюць наступныя заняткі па творы, «Людзі зямлі беларускай», на пачатку якіх, па прынцыпе кальцавой кампазіцыі, настаўнік звяртаецца да папярэдняй цытаты. «...А да канца забываць пра гэта нельга». Бо інакш вы не зможаце некалі адказаць на пытанне «Хто ты такі?». Як бы мы ні адказвалі на гэтае пытанне (вучні прапаноўваюць варыянты), усе мы — людзі зямлі беларускай. Выразна чытаецца пачатак аднайменнага раздзела да слоў «Што гэта за чалавек беларус? Што гэта за народ?». На гэтае пытанне вучні часткова адказваюць на матэрыяле папярэдніх раздзелаў, а затым, сінтэзаваўшы адказы і змест раздзела, афармляюць вывады ў выглядзе табліцы 2.

Рэпазіторый БарДУ



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Т а б л і ц а 2

| Знешнасць беларусаў | Рысы характару беларусаў |
|---|---|
| Чарнявых сярод беларусаў няшмат. Пераважаюць валасы светла-русыя ці нават бялявыя.<br>Цёмна-русых і шатэнаў менш. Колер вачэй часцей за ўсё блакітны, шэры ці сіні | Гаспадарлівасць, дбайнасць; цяга да прыгожага; павага да хлеба; пачуццё гумару; спакойнае стаўленне да смерці.<br>Самасуцяшэнне; стойкасць; уменне знаходзіць выхад і з безнадзейнага становішча |
| Рысы аблічча мяккія, склад здаецца крыху далікатным. | Спакойная смеласць; утрапёная любоў да працы; валовая ўпартасць у ёй |
| Беларус хударлявы, але моцнага складу | Ашчаднасць, разлік, — але і шчодрасць, гатоўнасць прыйсці на дапамогу ў бядзе |
| Шмат выразных і прыгожых твараў, асабліва сярод жанчын і дзяўчат | Гасціннасць добрага да добрых |
| — | Рахманы, але страшны ў гневе |
| — | Знаходлівасць, назіральнасць, некаторая хітрасць |
| — | Павага да іншых, памяркоўнасць да таго, хто думае інакш |
| — | Беларус — добры сем'янін. Любіць дзяцей, рэаліст у жыцці — і разам з тым летуценнік і рамантык |

Склаўшы табліцу, вучні адказваюць на пытанні:

1) Якія адмоўныя рысы адзначае У. Караткевіч у беларусаў?
2) Чаму пра іх няма гаворкі ў нарысе?
3) Ці азначае гэта, што мы — ідэальны народ?

Змест вучнёўскіх адказаў зводзіцца да таго, што аб'ектыўнае, часам крытычнае стаўленне да беларусаў — гэта сведчанне вялікай любові пісьменніка да свайго народа. Ён сапраўдны патрыёт Беларусі. Прыводзіцца караткевічаўскае тлумачэнне гэтага паняцця: «Няхай ты хоць як хвалі сваю Радзіму, узнімай яе хоць да нябёс, — пакуль ты паважаеш другія народы, ты патрыёт». Інакш, тлумачыць настаўнік, гэтае пачуццё пераходзіць у крайняе сваё выяўленне — нацыяналізм.

Вучням прапануецца ўсё ж назваць некаторыя рысы беларускага характару, якія ператварыліся ў недахоп натуры беларуса. Сярод названых будуць мяккасць, рахманасць, бязвольнасць, інертнасць.



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

На падставе аналізу твора і ўласных разважанняў вучням прапануецца напісаць сачыненне «Людзі зямлі беларускай» («Мы — беларусы»). Школьнае сачыненне, як усякая творчасць, — гэта не вербальны фотаздымак з натуры, а даверліва выкладзеная на паперы праекцыя ўласнага ўнутранага свету і суб'ектыўна-асабовых перажыванняў і пачуццяў, што магчыма толькі ў сітуацыі, якая стымулюе ўсведамленне школьнікам тых складаных калізій унутранага свету, якія раней не асэнсоўваліся ці не ўсведамляліся ім. Стварэнню такой сітуацыі спрыяе форма эпісталярнага сачынення, якое аб'ядноўвае веданне айчыннай гісторыі, веды пра сябе (як часткі народа, прадстаўніка нацыі), самаацэнку, адлюстраванне «Я»-фантастычнага (мара ў аспекце раскрываемай тэмы); свет пачуццяў, эмоцыі, мэтавызначэнне. Яно пабуджае да «развагі, роздуму, перажыванняў, якія бясконца пашыраюць эмацыянальна-сэнсавае поле асобы, перабудоўваючы яе каштоўнасна-сэнсавыя структуры, ствараючы ўмовы для самавыяўлення асобы, «тварэння» ёю ўласнага ўнутранага свету» [7] на аснове выкарыстання духоўнага вопыту продкаў і здабыткаў нацыянальнай культуры.

У гэтым аспекце падводзіцца вынік заняткаў. Паколькі нарыс ёсць спалучэнне ўласна публіцыстычных і мастацкіх сродкаў, то вучням ён уяўляецца і візітоўкай, і мастацкай і этнаграфічнай энцыклапедыяй Айчыны. Спецыфічнасць мастацкіх сродкаў яны схільны абумоўліваць адметнасцю асобы творцы. Вызначаецца тэма і ідэя твора. Апошняя фармулюецца прыкладна так: «Мы — беларусы. Мы адметны народ. Нам ёсць чым ганарыцца. Трэба берагчы свой духоўны скаб, памнажаць яго і перадаваць нашчадкам».

Такім чынам, нарыс «Зямля пад белымі крыламі», дзякуючы сінтэзу навуковага і мастацкага ведання, мае вялікую пазнавальную і выхаваўчую вартасць, дазваляе ўсвядоміць адметнасць і вытокі нацыянальнага характару, якімі абумоўлены розныя бакі ўладкавання беларусамі свайго жыцця, як матэрыяльнага, так і духоўнага. Прапанаваныя прыёмы работы над творам стымулююць вучняў да асэнсаванага суаднясення сваёй асобы і дзейнасці з маральнымі і эстэтычнымі ідэаламі аўтара, што ляжыць у аснове асабовых адносін да твора. Іх узнікненне — адзін з паказчыкаў дынамікі фарміравання асобы, у дадзеным выпадку, яе гістарычнай, патрыятычнай і нацыянальнай свядомасці.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Асноўны прынцып пабудовы падручніка-хрэстаматыі для 7-га класа — прынцып параўнання, раскрыцця ў вывучаемых з'явах (прозе і паэзіі, літаратуры і публіцыстыцы, літаратуры і навуцы) агульнага і адрознага. Усвядомленае аперыраванне дадзеным лагічным прыёмам дазваляе вучням лепш бачыць у вывучаемых аб'ектах як выяўленне агульных заканамернасцей, так і непаўторныя асаблівасці кожнага з іх; спрыяе больш трываламу запамінанню вучэбнага матэрыялу; дапамагае весці пошук неабходных для параўнання прадметаў і прымяняць аналогію. Мастацкія і навуковыя (гістарычныя) творы разглядаюцца
ў 7-м класе шляхам поўнага параўнання, раскрыцця агульных і адрозных прыкмет. Для чытання і вывучэння прапануюцца празаічны і паэтычны мастацкія творы: раздзел з аповесці Л. Дайнекі **«Меч князя Вячкі»** і **«Балада пра Вячка, князя людзей простых»**, напісаная У. Караткевічам. Для чытання і абмеркавання прапануюцца нарысы Я. Пархуты (на выбар настаўніка) і артыкул з падручніка гісторыі «З мячом і крыжам». Веды па тэорыі літаратуры, якія вучні павінны атрымаць пры вывучэнні дадзенай тэмы, — адрозненне мастацкага адлюстравання жыцця ад навуковага; паняцце пра баладу.

Усе аўтары абапіраліся на дакументальны матэрыял, летапісныя творы, такія, як «Хроніка Лівоніі». Для гістарычнага даследавання, як ужо вядома вучням, уласцівы сціслая перадача сутнасці падзей, спакойна-аб'ектыўная перадача зместу. Пасля знаёмства з творам Л. Дайнекі школьнікі ўяўляюць, што паказ тых жа падзей у мастацкім творы маляўнічы, зрокава-наглядны, поўны побытавых падрабязнасцей і дэталей, якія часта з'яўляюцца плёнам пісьменніцкай фантазіі. Аднак у выяўленні галоўнай сутнасці падзей, што адбываліся ў далёкім мінулым, мастацкі паказ у дадзеным творы не разыходзіцца з навуковым.

Актуалізаваўшы гэтыя звесткі, звяртаемся да балады У. Караткевіча. Гістарычная аснова твора ўзнаўляецца праз лексічны каментарый, паколькі вучні ўжо маюць уяўленне пра архаізмы, гістарызмы і іх мастацкую функцыю.

Пасля выразнага чытання балады пераказваецца яе сюжэт і выяўляецца агульнае (сутнасць рэальных гістарычных падзей) з папярэднім творам. Аднак паказ гэтых падзей адметны. Пачатак адкрытай вайны Полацка з крыжакамі паказаны паэтам сцісла і ярка ў



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

першым чатырохрадкоўі, а ў наступным гаворыцца пра складанасць барацьбы. Адзначаюцца формы слова *«князь»* і *«князькі»*. Ацэначная роля суфікса відавочная, а ўзмацняе ацэнку эпітэт *«брудныя»* [душы].

Абставіны, пры якіх трапіў у палон «сумленны хлопскі князь» Вячка, і Л. Дайнека, і У. Караткевіч выводзяць з крыжацкіх нораваў, бо «хітрасці трэба вучыцца ў тэўтонаў». Тое, што ў Караткевіча князь трапляе ў палон «параненым і слабым», характарызуе смеласць Вячкі і подласць яго ворагаў. Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што ў «Хроніцы Лівоніі» нічога не гаворыцца пра пагібель князя, які «пайшоў у Прусію, каб ніколі больш не вяртацца ў сваё каралеўства». У наяўнасці аўтарская фантазія. Аднак неабходна паказаць вучням, што яна абумоўлена логікай гісторыі. Хоць барацьба з Ордэнам яшчэ на працягу стагоддзяў вызначала гісторыю Полацка, але «ён спалучыў свае сілы з сіламі Пскова, Ноўгарада, Прыбалтыкі, Польшчы, што і дало ў далейшым магчымасць зламаць і спыніць крыжацкую агрэсію» [20, с. 287].

А такое магло адбыцца дзякуючы самаахвярнай барацьбе, паэтычнае апісанне якой зачытваецца з балады і параўноўваецца з празаічным. Вучні адзначаюць большую сціласць і напружанасць, яркую вобразнасць, што ілюструе, напрыклад, метафара *«парчу і аксаміты тапталі ў бруд яны»*. Месца дзеяння дапамагаюць уявіць эпітэты *«грозны»*, *«пранізлівы»*, *«злавесны»*. План, які нарадзіўся ў галаве Вячкі, заўчасна не раскрываецца ні ў аповесці Л. Дайнекі, ні ў баладзе У. Караткевіча, але чытачы міжволі чакаюць павароту дзеяння пасля слоў «Але сканаць пакорным і мяккім, быццам пух...?». Адказ на гэтае пытанне вучні знаходзяць у тэксце. Настаўнік засяроджвае ўвагу класа на патрыятычным пафасе твора праз супастаўленне вобразаў беларускай і рускай паэзіі (Дым «чужынскіх вогнішч» — і «дым Отечества»), а таксама выяўляе глыбіню патрыятычнай традыцыі ў айчыннай літаратуры праз Скарынаву прадмову да кнігі «Юдзіф» («Понеже от прирожения...»).

Падкрэсліваецца, што ўсё жывое, свядома ці падсвядома, мае адчуванне радзімы, з мэтай чаго зачытваецца зварот Вячкі да каня. Акрамя таго, праз гэты эпізод ускосна характарызуецца сам князь Вячка, чулы да ўсяго жывога, свабодалюбівы, з пачуццём уласнай годнасці. Вучням прапануецца ўспомніць, што ўвасабляе Л. Дайнека ў аповесці «Меч князя Вячкі» ў такіх мастацкіх вобразах: *«Змрок стукаўся ў грудзі. Кіпеў над галавой нябесны блакіт. Уздрыгвала зямля.*



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

*Спалоханыя зайцы і казулі ратаваліся, хто як мог*», — а таксама адшукаць вобразы, аналагічныя па змесце, у «Баладзе…».

З апошніх пэўную цяжкасць для вытлумачэння ўяўляе арыгінальны аўтарскі вобраз «*Ты грэбаваў зямлёю, што слалася ў нагах*», і змест яго павінен быць высветлены пры дапамозе настаўніка. Як ужо вядома з нарыса «Зямля пад белымі крыламі», вобраз каня ў беларускай літаратуры мае рэалістычна-рамантычны сэнс: гэта сябар, і памочнік, і — увасабленне мары пра свабоду. Паняцці «радзіма» і «свабода» ў мастацкім адлюстраванні У. Караткевіча непарыўныя. Усяму жывому мілы родны куток і агідны ланцуг (як мядзведзю Бурыку, успамінаюць вучні). Вячка разумее, што зварот на радзіму для яго магчымы толькі ў марах, але імкнецца дастаць хоць імгненне волі, пры гэтым выразна ўсведамляючы, што сілы няроўныя і часу ў яго вельмі мала. Князь і яго верны конь як бы зліваюцца ў адну, неверагоднай сілы і спрыту, істоту — і закіпеў бой.

Зачытваюцца дзеяслоўныя словазлучэнні, якія перадаюць дынаміку і напружанасць дзеяння. Але блізка трагічная развязка, і апошнія словы князя звернуты таксама да баявога сябра. Тут нібы зліваюцца ў адно светаадчуванне кожнага з іх: «*Мы болей не пабачым лугі і родны край*». За адно імгненне волі — нечалавечае напружанне сіл; за Радзіму — жыццё. На такое здольны толькі высакародны чалавек, «алень» «з крывёю гордай». Як кантрасны вобраз вучні адзначаюць «зграі злых сабак», што накінуліся на героя, ірвучы і раздзіраючы яго магутнае, але зраненае цела («*я ў стрэлах, быццам вожык*»), утоптваючы яго ў «пыл і гразь».

На працягу ўрока дамінуе ўстаноўка на тое, што найперш твор мастацтва выконвае эстэтычную функцыю, адлюстроўваючы гістарычныя рэаліі спецыфічнымі мастацкімі сродкамі і выяўляючы адносіны аўтара да іх. У фінале заняткаў пытанні падагульняючай гутаркі яшчэ раз засяродзяць вучняў на спецыфіцы балады, яе гістарычнай аснове, адлюстраванні аналагічных падзей у навуковай літаратуры, на ролі аўтарскай фантазіі і выяўленчых сродкаў у раскрыцці ідэйнага зместу твора.

Верш У. Караткевіча **«Беларуская песня»** вывучаецца ў 8-м класе як узор грамадзянскай лірыкі, дзе асоба лірычнага героя нясе адбітак характару і духоўнага свету самога аўтара. Пытанні і заданні, змешчаныя ў падручніку-хрэстаматыі, спрыяюць мэце фарміравання гісторыка-патрыятычнай свядомасці падлеткаў, абуджэнню іх



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

пазнавальнай актыўнасці, аднак першым крокам да ўсведамлення ідэі твора з'яўляецца загаловак, які актуалізуе ў наяўным вопыце чытача тыя ўяўленні, на якія будуць абапірацца новыя веды, і настройвае на працяг дыялогу з тэкстам да чытання і ў працэсе чытання. У назве тэксту можа заключацца або яго тэма, або асноўная думка. Вучням прапануецца высветліць гэта адносна назвы «Беларуская песня» пасля аналізу верша.

Гучанне назвы вызначаецца школьнікамі як урачыстае. Першаснае чытанне выяўляе, што і сам твор мае ўрачыстае гучанне. «Беларуская песня» — урачыстая песня — гімн. Значэнне апошняга слова ўдакладняецца па тлумачальным слоўніку. Сістэма пытанняў накіравана на высвятленне таго, што ж надае вершу якасці гімна. Вызначаецца вершаваны памер (пяцістопны анапест), і падрыхтаваны вучань чытае пачатак «Іліяды» Гамера з мэтай параўнання гучання гэтых твораў. Перад паўторным чытаннем верша ставіцца задача: пры слуханні засяродзіцца на гукапісе і тых зрокавых уяўленнях, якія выклікае твор, а затым выказаць іх адным словам (*прыгажосць*).

Вучні здольны заўважыць, што ў першую чаргу адчуваюцца зацвярдзелыя, а побач з імі — мяккія. У практыцы аўтара сустракалася цікавая вучнёўская думка, што гукавая карціна верша разнастайная, як розная і наша Радзіма, прадстаўленая ў ім. Урачыстае гучанне зацвярдзелых — гэта наша гісторыя, наш характар, нашы сімвалы. На ўроку па вывучэнні «Беларускай песні» абавязкова дэманструецца нагляднасць: выявы замка Міндоўга, Сафійскага сабора над Дзвіною, беларускія пейзажы. Прапануецца шэраг эпітэтаў да слова «прыгажосць»: *паэтычная, сціплая, тонкая, гордая, далікатная, пяшчотная, справядлівая, суровая, свабодная…* і інш.

Вучням прапануецца размясціць гэтыя паняцці па прынцыпе градацыі, а потым вызначыць, на іх думку, вядучае. Меркаванні ў асноўным супадаюць: *гордая* (і справядлівая). Аргументацыя: па-першае, ёсць чым ганарыцца. Гісторыя, прырода, людзі Беларусі ў непарыўнай сувязі паўстаюць перад чытачом. Па-другое, «гордыя» сродкі. Найперш лексічныя, якія абазначаюць тое, чым мы павінны ганарыцца: *мова, зямля (ралля, баразна), зоры, ветразь, сцяг* і інш. Адметныя эпітэты і параўнанні: *бары-акіяны; Сафія нібы карабель* і інш. І, нарэшце, сродкі гукапісу. З падручніка зачытваецца тэзіс, з



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

нагоды якога вучні павінны выказаць сваё меркаванне па творы. «Алітэрацыі і асанансы могуць ствараць мастацкі вобраз нават самі па сабе, амаль незалежна ад сэнсу слоў. Таму сапраўдныя майстры карыстаюцца гэтымі магутнымі сродкамі асцярожна і тактоўна, каб гэты мастацкі прыём не вылучаўся з агульнага ўспрыняцця верша». Вучні адзначаюць, што дадзены тэзіс нібыта напісаны пра верш У. Караткевіча «Беларуская песня».
Паэт дасканала, па-майстэрску карыстаецца гукапісам. Мастацкі змест і мастацкія сродкі знаходзяцца ва ўзаемапранікненні і гармоніі. Прыводзяцца ўзоры алітэрацыі і асанансу; вызначаецца роля гэтых мастацкіх сродкаў.

«Абуджаная літаратурным аналізам здольнасць тлумачэння вучнямі функцыі мастацкага вобраза ў творы, як правіла, стымулюе сатворчасць чытача, дапамагае нараджэнню ўласных чытацкіх вобразаў пры зносінах з тэкстам» [21, с. 219]. Гэта пацвярджаецца на наступным этапе ўрока, калі ўвага вучняў скіроўваецца на асобу лірычнага героя. Вучні ўпэўнены, што мы маем права атаясамлівасць яе з асобай паэта,
бо патрыятызм, веданне Беларусі, яе гісторыі, прыроды, нацыянальнага характару — неад’емныя рысы асобы У. Караткевіча, што вынікае з раней вывучаных твораў. Настаўнік прапануе шлях асэнсавання героем паняцця «радзіма», якое пачынаецца з пачуццёвага ўспрымання роднага кутка, а затым усведамляецца праз адчуванне вялікага гістарычнага шляху продкаў і асабістай далучанасці да народа. І ўрэшце Радзіма — гэта наша дзяржава, *«наш сцяг, што нікому... не дадзім абсмяяць, апаганіць, забыць ці мячом зваяваць»*. Апошнія радкі верша гучаць як клятва дзякуючы адметнасці паэтычнага сінтаксісу і выяўляюць непахісную грамадзянска-патрыятычную пазіцыю аўтара.

Адзначаюцца высакародныя адносіны паэта да Жанчыны, якімі абумоўлены арыгінальныя мастацкія сродкі: радасць ад жаночай прыгажосці; захапленне святлом і свежасцю юнацтва; пакланенне Маці. Аднак падлеткі не адразу спасцігаюць мастацкую логіку, якая прывяла да стварэння такога вобраза, як *«жніўё з павуціннем...»*. Пры дапамозе настаўніка яны павінны прыйсці да высновы, што ў гэтым выразе — формула жаночага лёсу: жанчына сталага ўзросту адкрасавала і дала плён, як хлебная ніва. Гэты вобраз можна назваць скразным у творчасці У. Караткевіча.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Настаўніку варта прыгадаць эпізод з апавядання «Блакіт і золата дня», дзе «перажыванні сваёй гераіні пісьменнік параўноўвае з адчуваннямі зямлі, адагрэтай сонцам, цёплым паветрам пасля доўгай зімы. Яна чакае сейбіта, каб прыняць і выпусціць наверх кінутыя ў яе зярняты. Такі стан (прадчуванне кахання) цяжка растлумачыць, яго надыход нельга прадказаць. “І ніхто, нават маці, не зразумела, што здарылася за гэтыя дні дзіва: узышла на бацькоўскую байду калючы і рэзкі падлетак, а цяпер плыве дарослая дзяўчына, што ўсё зразумела нейкімі глыбінямі душы. Быццам зямля... Нават маці не зразумела б гэтага. Як поле, якое ўсё аддало, не можа зразумець поля, якое чакае”» [22, с. 19].

Работа над вершам завяршаецца выразным чытаннем з захаваннем адпаведных інтанацый, што выяўляюць гордасць, пяшчоту і замілаванне. Спачатку зачытваюцца паасобку ўрыўкі, якія адрозніваюцца сваім пафасам. Заключныя радкі, у якіх увасабляецца грамадзянская пазіцыя паэта, чытаюцца на ўзор прысягі, з далучэннем да аўтарскіх паўтораў усяго класа. Пасля гэтага вырашаецца праблема, пастаўленая ў пачатку заняткаў: тэма ці ідэя сфармулявана загалоўкам верша? Большасць вучняў схільна лічыць, што ён спалучае як тэму, так і ідэю. Прычым у першым слове (*«беларуская»*) пераважае тэматычнае напаўненне, а ў слове *«песня»* — ідэйнае.

Тут варта працытаваць урывак з эсэ У. Караткевіча «Мсціслаў», які сведчыць, што беларусы — «людзі з мінулым, славе і мужнасці, розуму і таленту якога могуць пазайздросціць вельмі і вельмі многія», і што толькі ад іх «залежыць, каб гэтая слава... не прапала ў будучых вяках», каб яны «заўсёды былі поўныя… высокай годнасці ў кожным слове і ў кожным учынку…» [т. 8, кн. 2, с. 204]. Гэта залежыць ад кожнага з нас — так вызначаецца ідэя твора.

Для чытання і абмеркавання на дадзеным уроку ў праграме прапануецца «Патрыятычная песня» Шандара Пецёфі. Адказ на пытанне, што яднае і што розніць гэтыя творы, падводзіць вынікі ўрока. Адзначаецца іх аднолькавы пафас, прырода грамадзянскіх пачуццяў, але разам з тым вучні пры дапамозе настаўніка ўсведамляюць, што ў «Беларускай песні» ўвасабляюцца нацыянальныя каштоўнасці, а ў вершы Ш. Пецёфі радзіма выступае як агульначалавечае паняцце; верш не мае адметнага нацыянальнага каларыту. Аднак змест абодвух твораў гуманістычны.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Такім чынам, вывучэнне лірычных і ліра-эпічных твораў У. Караткевіча спрыяе асэнсаванню далёкай і блізкай гісторыі Айчыны, садзейнічае фарміраванню ацэначных адносін да яе, а ў выніку — каштоўнасных арыентацый, у якіх агульначалавечае праламляецца праз нацыянальную
і канкрэтна-асабовую адметнасць, што выявілася ў працэсе суаднясення, супастаўлення, параўнання, асацыятыўнага ўспрымання свету праз прызму вывучаемых твораў. Эмацыянальна-каштоўнасныя адносіны да гістарычных фактаў, падзей, з'яў і працэсу іх пазнання ёсць сутнасць гісторыка-патрыятычнай свядомасці ў яе аксіялагічным аспекце.

Прыступаючы да вывучэння апавядання **«Паром на бурнай рацэ»** (8-ы клас), неабходна кіравацца наступным прынцыпам: супадзенне таго, што шукае школьнік у пару духоўнага сталення, з тым, што ён знаходзіць у мастацкай літаратуры, мае важнае значэнне, а арганізацыя такога працэсу дае магчымасць педагогу актыўна ўздзейнічаць на фарміраванне асобы. Падлеткавы ўзрост — гэта ўзровень «аўтаномнай маралі», самастойна выпрацаваных маральных прынцыпаў. У працэсе сталення падлетак шукае ідэал у асяроддзі вядомых людзей гісторыі і сучаснасці, а для старшых падлеткаў увогуле характэрны свядомы пошук ідэальнага вобраза,
што ўкладваўся б у маральныя патрабаванні асобы, якая развіваецца.

Апавяданне «Паром на бурнай рацэ» закранае тыя ж праблемы, што ўздымаліся У. Караткевічам ва ўжо знаёмых школьнікам творах: гісторыя, Радзіма, прырода, сутыкненне дабра і зла. Аднак акцэнты расстаўлены інакш. Ва ўступнай гутарцы настаўнік актуалізуе звесткі, атрыманыя школьнікамі ў 5—7-м класах, акцэнтуе ўвагу на тэматыцы і вядучых ідэях творчасці пісьменніка і ставіць перад класам задачу прасачыць у час аналізу, наколькі яны ўвасобіліся ў новым творы. Апавяданне патрабуе гістарычнага каментарыя, але пасля чытання пачатку твора звяртаемся да адзнак «мастацкага часу»: «Коні баяліся людзей. Ад людзей пахла не хлебам, а крывёю, як ад ваўкоў»; «Пераспелае жыта плакала зярнятамі».

Настаўнік дапамагае вучням спасцігнуць дыялектыку рэалістычнага і сімвалічнага ў змесце гэтых вобразаў. Вайна — ненатуральны стан рэчаіснасці. Але натуральны стан і чалавека, і «ўсіх, хто дыхае і шуміць», — свабода. Таму вайна гэтая — за свабоду («*Справа ішла пра свабоду*»), і гістарычны час у творы бярэ адлік з 18 жніўня 1863 года.



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Каб вучні дакладна ўспрынялі гістарычныя рэаліі, удакладняюцца паняцці *«белыя»*, *«чырвоныя»*, *«шавінізм белага жонду»*. Эфектыўным з'яўляецца прыём складання «слоўніка эпохі». Прынамсі, па дадзеным творы могуць быць складзены два, сацыяльны і этнаграфічны. У першым пераважае лексіка, што адлюстроўвае паўстанне, а ў другім — побытавыя рэаліі XIX стагоддзя. Аднак гісторыя народа — гэта найперш гісторыя роду, гісторыя сям'і. Настаўнік знаёміць вучняў з сямейнай легендай роду Караткевічаў, якая потым знайшла дакументальнае пацверджанне: продак пісьменніка па мацярынскай лініі («па кудзелі») Тамаш Грыневіч прымаў удзел у паўстанні і быў расстраляны ў Рагачове. .

Нельга абысці ўвагай загаловак, хаця ён, здаецца, «спакойны» [17] і не адлюстроўвае ўсёй сутнасці тэксту. Паром — нібыта другасная дэталь, і такі загаловак, на першы погляд, не дапамагае выявіць галоўную думку. Вучні схільны асацыіраваць яго перш за ўсё з карцінамі прыроды ў творы. *«Рака зрабілася бурнай у вераб'іную ноч»*.

Не ўсе маюць уяўленне аб такой прыроднай з'яве, як «вераб'іная ноч», таму трэба звярнуцца да артыкула з энцыклапедыі «Этнаграфія Беларусі» (у тым ліку ў форме вучнёўскага паведамлення): «Згодна з народнымі павер'ямі, у гэту ноч з пекла на свет выходзілі ўсе злыя сілы, якія нібыта спраўлялі сваё галоўнае гадавое свята... Усе стыхіі прыродыядналіся, каб знішчыць нячыстую сілу, што распладзілася пасля Купалля за лета і бясконца шкодзіла людзям. Кожны забіты ці пакалечаны ў гэтую ноч перуном лічыўся нядобрым чараўнікам» [23, с. 419]. У такой сітуацыі прыродзе нададзена важная роля ў змаганні са злом. Адсюль вынікае ўвага да ролі пейзажу ў творы, які перадае градацыю напружанасці дзеяння і мае як бы сваю ўласную кампазіцыю, выяўляючы еднасць чалавека і прыроды, характарызуючы асобу аўтара, сам з’яўляючыся дзеючай асобай.

Выбарачна зачытваюцца эпізоды, дзе пейзаж «ачалавечваецца». Гэтае жыццё прыроды чуйна ўспрымаюць і аўтар, і яго героі. Прыводзяцца і прыклады «зваротнай сувязі». У падагульняючай гутарцы ўвага вучняў скіроўваецца на тое, што «У. Караткевіч, адухаўляючы старонкі мінулага, сцвярджаючы повязь самых розных часоў, адначасова імкнецца ўзнавіць і цэласна ахапіць складаную светабудову, творча спасцігнуць узаемаабумоўленасць усіх яе сістэм,



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

усяго жывога і існага на зямлі» [22, с. 36]. Акрамя таго, «мінулае нельга маляваць толькі адной фарбай — белай або чорнай» [4, с. 99], бо ў ім былі розныя праявы: дабро і зло, высакароднасць і подласць. Каб паказаць іх спрадвечную барацьбу, пісьменнік скарыстаў сімвалічны вобраз вераб'інай ночы, у якую сутыкнуліся жыццёвыя прынцыпы Юрыя Горава і Пора-Леановіча.

Лёсы гэтых герояў — у цэнтры ўвагі на другім уроку, які пачынаецца са знаёмства з іх мастацкімі біяграфіям, дадзенымі ў плане супастаўлення: па паходжанні, адносінах да воінскага абавязку, маральных прынцыпах і, у прыватнасці, у падзеях вераб'інай ночы. Большыя сімпатыі ў вучняў выклікае рускі Гораў, а не беларус Пора-Леановіч, а гэта яскрава сведчыць, што У. Караткевіч любіць свой народ, але не ідэалізуе яго.

Зачытваецца ўрывак з нарыса «Зямля пад белымі крыламі»: «Як і паўсюль, ёсць сярод беларусаў мяшчане і падзвіжнікі, лайдакі і працаўнікі, “малюскі” і героі, дурні і мудрацы. І кожны паступае адпаведна свайму характару...». Вучням прапануецца назваць рысы характару Пора-Леановіча, падабраць словы для яго характарыстыкі.

З той прычыны, што маральныя калізіі апавядання досыць складаныя для ўспрымання васьмікласнікаў, яны часта абмяжоўваюцца пераважна аўтарскай характарыстыкай героя. На падставе аналізу вобраза Пора-Леановіча выяўляюцца сродкі яго раскрыцця: партрэт, паводзіны і ўчынкі, мова, аўтарская характарыстыка, у выніку чаго школьнікі спасцігаюць ідэйны змест вобраза героя. Фармулююцца «маральныя» прынцыпы Пора-Леановіча, накшталт «нікога не шкадуй для сваёй мэты».

Узнікае парадаксальная сітуацыя: Гораў і Леановіч — саюзнікі, а Гораў і Грынкевіч — праціўнікі. Аднак учынкі герояў сведчаць амаль пра адваротнае. Леановіч ваюе супраць тых, хто змагаецца за свабоду яго радзімы, бо ні радзіма, ні народ не ўяўляюць для яго каштоўнасці. Поўную супрацьлегласць Пора-Леановічу ўяўляе Усяслаў Грынкевіч. Зачытваюцца словы: «Ён не за сябе, ён за народ. Не дзеля грошай, не дзеля ўлады. Каб народ быў вольны. Воля патрэбна ўсім. Ён чысты, як... неба».

Жонка Усяслава Грынкевіча ўвасабляе годнасць, адданасць, страснасць, самаахвярнасць. Аўтарская пазіцыя адносна гэтых герояў адназначна станоўчая, а адносна Пора-Леановіча — адназначная толькі на першы погляд. Пасля патаемнага данясення ўлана адзначаюцца вельмі не ўласцівыя для Леановіча паводзіны, якія сведчаць пра



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

наяўнасць сумлення ў героя, хоць ён і паспяхова змагаецца з яго праявамі. У цэнтры заключных заняткаў — сцэна дуэлі. Яе аналіз мае на мэце паказаць, што ў апошнія хвіліны жыцця Пора-Леановіч адчуў і зведаў духоўнае ачышчэнне. Пасля ўступнага слова настаўніка вучні падагульняюць вядомае з папярэдніх урокаў. Зачытаўшы сцэну дуэлі, варта задаць пытанне «Чаму гіне Пора-Леановіч, хаця Гораў быў упэўнены, што гэта яго апошняя дарога?». Глыбіня праблемы не адразу даступна вучням, яны адзначаюць спачатку тое, што ляжыць на паверхні. Подласць ва ўсе часы — подласць, і яна караецца Богам або людзьмі. Гораў кажа пра вынік дуэлі: «Варта было для яго самога». Але чаму ж «падлюга і нягоднік» дзякуе Гораву перад смерцю? Версіі адказаў ляжаць у рэчышчы таго, што Пора-Леановіч усвядоміў усю подласць свайго ўчынку і не змог бы з такім цяжарам жыць далей. Істотная дэталь — вочы, «у якіх цяпер не было пустаты», «здзіўленыя, неяк па-дзіцячы светлыя вочы...».

Каментарый настаўніка:

— Мы глядзім на яго позіркам аўтара, у якім ёсць і спачуванне, і жаданне зразумець. Успомніце, як характарызаваў У. Караткевіч у сваіх казках «дзікіх людзей», людзей, якія здольны хутка забыць «мову сваю і сваю зямлю»?

— «Яны яшчэ не нарадзіліся».

— Давайце пагодзімся з пісьменнікам і ў тым, што смерць Пора-Леановіча ёсць яго маральнае ўваскрэсенне, нараджэнне.

Пажадана прадэманстраваць рэпрадукцыю карціны Г. Хінкі-Янушкевіч «Удовам 1863 года», пры дапамозе якой вучні здолеюць абстрагавацца ад рэалістычнага вобраза парома і ўявіць сутнасць назвы твора як мастацкую праекцыю лёсу чалавека ў часы буйных гістарычных падзей між берагамі Дабра і Зла.

Сюжэт карціны зробіць лагічным паведамленне настаўніка пра тое, што вывучаны твор ёсць не што іншае, як пралог да рамана «Нельга забыць», у якім У. Караткевіч выканае запавет сваёй гераіні: «... каб мае ўнукі ніколі не варагавалі з вашымі». Праўнук Усяслава Грынкевіча Андрэй і праўнучка Горава сустрэнуцца і пакахаюць адзін аднаго, пра што Караткевіч расказаў у рамане «Нельга забыць», пралогам да якога і з’яўляецца, па сутнасці, апавяданне «Паром на бурнай рацэ».



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Прапанаваная методыка вывучэння эпічнага твора спрыяе літаратурнаму развіццю школьнікаў. Яго стымулююць і пісьмовыя работы па літаратуры, для якіх істотна і веданне вучнямі тэксту, і валоданне ўменнямі, неабходнымі для асэнсавання і ацэнкі мастацкага твора, якія выпрацоўваліся на ўроку. Аптымальным жанрам на гэтай ступені з'яўляецца супастаўленне эпізодаў. Вучням можа быць прапанавана тэма «Ноч і ранак у лёсе Пора-Леановіча».

Такім чынам, тэндэнцыі эмацыянальнага росту і ўвагі школьнікаў да эстэтычнай формы, уласцівыя перыяду «маральнага эгацэнтрызму», знаходзяцца ў прамой залежнасці ад адпаведнасці зместу вывучаемых твораў індывідуальным асаблівасцям чытача. Інтраверта цікавяць творы з псіхалагічнай і філасофскай тканінай, яму імпануюць спакойнае працяканне падзей і дэталёвае адлюстраванне перажыванняў, роздуму і разважання пра жыццёвыя праблемы. Экстраверт больш цэніць творы, што вылучаюцца вастрынёй адлюстроўваемых канфліктаў, эмацыянальнай выразнасцю, энергічнай, вольнай плынню апавядальнай манеры. Амбіверт аддае перавагу гістарычнаму і прыгодніцкаму раману. Прырода, нацыянальны побыт, нацыянальны характар, нацыянальныя традыцыі, адлюстраваныя ў літаратуры, не проста перадаюць асаблівасці таго ці іншага народа, а знаходзяць выражэнне ў творчай індывідуальнасці пісьменніка, створаным ім мастацкім свеце, у яго канцэпцыі жыцця і чалавека, якая павінна заўсёды быць у цэнтры ўвагі настаўніка.

Эпічныя творы У. Караткевіча ў гэтых адносінах здольны задаволіць усякі мастацкі густ, спалучаючы шматстайнасць формы з глыбінёй зместу і з’яўляючыся ў выніку сродкам спасціжэння чалавечага свету, далучэння да сацыяльна-гістарычнага вопыту свайго народа і чалавецтва, выхавання грамадзяніна і патрыёта.



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

# СІМВОЛІКА ПРОЗЫ У. КАРАТКЕВІЧА

Перачытваючы Караткевіча, яшчэ раз пераконваешся ў праўдзівасці таго, што «нацыянальны сімвал павінен быць сімвалам <…> з плоці і крыві», «анёльская прырода яму супрацьпаказана (дарэчы, нават у хрысціянскім універсуме нацыянальнымі сімваламі рабіліся, зазвычай, святыя і ўгоднікі, але не божышча – дарэчы згадаць святых Юрыя ці Міколу. <…> Сімвал павінен быць здольны несці нацыянальную ідэю» [24, с. 198].

Так, вобраз святога Міколы — заступніка бедных — у творчасці У. Караткевіча займае адно з ключавых месц, а жарабятка, якое ён уратаваў, — перадумова таго, што «белыя землі» [т. 4, с. 24] дачакаюцца волі і справядлівасці.

Сімвалічны вобраз белага жарабяці (белых коней) увогуле шматмерны, а ўжыты ў розных кантэкстах, здольны выклікаць разнастайныя асацыяцыі, якія ёсць веды, веданне пэўных адносін знешняга свету, набыццё новых ведаў. Карыстанне імі — ведамі, набытымі сувязямі — ёсць разуменне.

Адзін з запамінальных вобразаў на старонках рамана «Каласы пад сярпом тваім» такі: «Конь дрыжаў ад ярасці. Маленькія вушы былі прыціснуты, белыя ноздры раздзьмуты. <…> Высакародны белы дрыкгант, увесь у дробных плямах і смугах, як леапард» [т. 4, с. 192].

Дык што ж за коні такія — дрыкганты? Ці існавала на самай справе каштоўная мясцовая парода з характэрнымі рысамі, страчаная напрыканцы XIX ст.? Высветлілася, што дрыкгантам (у польскай мове *drygant, drygunt, drus*) называлі раней жарабца-стаенніка, важака ў статку. Менавіта ў значэнні «жарабец» гэтае слова сустракаецца ў некаторых літаратурных помніках і дакументах XVI—XVII стст.: «Прамова Мялешкі», «Хроніка славян» М. Стрыйкоўскага, «Гіпіка» К. Дарагастайскага, судовыя акты.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Тым не менш, спецыяльна праведзеныя даследаванні [26] паказваюць, што ўпамінання пра пароду «дрыкгант» са спецыфічнымі прыметамі не знойдзена. Магчыма, сапраўды існаваў нейкі «прататып» загадкавых дрыкгантаў, і варта пашукаць яго сярод старажытных коней Рэчы Паспалітай?

Тып каня, які дамінаваў у ВКЛ, адбіты на рэверсах медных і срэбных манет часоў Жыгімонта Аўгуста, Яна Казіміра і інш.

Аналагічныя выявы сустракаюцца і на пячной беларускай кафлі. Такі ж конь адлюстраваны на гравюры Абрахама дэ Бруіна «Вершнік польскі»: добра развітая мускулатура, моцны акруглы круп, высокі выгіб шырокай шыі. На элегантнай галаве — маленькія вушы і выразныя вочы. Тулава доўгае, капыты зграбныя, невялікія. Даследчыкі прыгадваюць таксама гравюры з кнігі К. Дарагастайскага «Гіпіка, або кніга пра коней», дзе пануе барочны тып і нават дадзены прапорцыі ідэальнага каня: «Даўжыня цела каня павінна раўняцца яго вышыні ў карку, ногі нядоўгія, спіна кароткая, шыя ўнізе шырокая, да горла — тонкая, галава невялікая, выразная» [26, с. 63]. Шляхетнага каня аўтар «Гіпікі» параўноўвае з трыма звярамі: ільвом, аленем і лісіцай, маючы на ўвазе як рысы ў знешнім падабенстве, так і ў звычках. Наўрад ці ў свой час абышоў У. Караткевіч увагай палатно Рэмбранта «Польскі вершнік» або графіку Шарля Эрарда «Коні польскія». Пра гэта сведчыць той факт, што пісьменнік у сваіх творах адлюстроўваў каня пад рысінай шкурай. На карцінах Эрарда і Рыдынгера («Конь польскі») прадстаўнікі гэтага віду на фоне асноўнай масці маюць буйныя белыя плямы, а пры наяўнасці плям на галаве конь можа мець так званыя «сарочыя вокі», якія адсвечваюць чырванню, што ў аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» У. Караткевіч перадае, у прыватнасці, у вобразе «гарэлі вочы коней» [т. 7, с. 47].

Аднак у літаратурным апісанні «дзікага палявання» ёсць яшчэ адно цікавае параўнанне масці — «як рысі або леапарды». Такая рэдкая масць сапраўды існуе і завецца тарантаватай (рус. — «чубары», англ. — *«Leopard»*, ням. — *«Tiger»*). Да яе належаць коні з дробнымі плямамі альбо палосамі чорнага, рудога ці карычневага колеру на асноўным белым фоне.

У «Дзікім паляванні караля Стаха» гэта «туманныя коні варанога і стракатага колераў» [т.7, с. 92]. Нездарма У. Караткевіч спалучаў такую афарбоўку са словам «дрыкгант», што азначала «жарабец»,



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

а згаданая своеасаблівая масць перадаецца нашчадкам менавіта па лініі жарабца-вытворніка.

Шматлікім чытачам аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха», пэўна, запомнілася апісанне верхавых коней невядомай пароды, якія насілі па балотных сцежках Алеся Варону і яго злачынную світу: «Гэта былі сапраўдныя палескія дрыкганты, парода, ад якой зараз нічога не засталося. Усе ў палосах і плямах, як рысі або леапарды, з белымі ноздрамі і вачамі, якія адлівалі ў глыбіні чырвоным агнём. Я ведаў, што гэтая парода вызначаецца дзіўнай, трывалай, машыстай інахаддзю і пад час намёту імчыць вялізнымі скачкамі, як алень. Не дзіва, што ў тумане мне такімі вялізнымі здаваліся іхнія скачкі» [т.7, с. 78].

Коні венгерскія і польскія, як падкрэслівалі знаўцы, вельмі схільныя былі да інахадзі. Гэтую звестку пісьменнік таксама выкарыстаў пры апісанні «дзікага палявання». Такім чынам, пацвердзілася, што літаратурная містыфікацыя пра палескіх дрыкгантаў абапіралася на рысы рэальна існаваўшага ў мінулым каня. Калі весці гутарку пра назву «палескія», то, на жаль, на забалочаным лясным Палессі не было сухіх раўнінных абшараў, дастатковых для табуннай конегадоўлі, і ўмовы ландшафту не спрыялі вывядзенню выдатных верхавых коней. Статкі з выдатнымі арабскімі вытворнікамі, якія не ўступалі па якасці найлепшым табунам падзішаха, мелі Радзівілы.

Гістарычная проза У. Караткевіча мае шмат рамантычных і загадкавых дэталяў, многія з якіх пакуль што застаюцца па-за ўвагаю даследчыкаў. Аднак не падлягае сумненню, што кожная дэталь у кнігах пісьменніка мае сваё дакладнае абгрунтаванне. Нездарма сам аўтар вуснамі героя аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» заўважае: «Добрыя прывіды, калі яны сапраўдным гноем зямлю пэцкаюць» [т.7, с. 113].

Яшчэ адным сімвалічным вобразам у аднайменнай аповесці выступае само дзікае паляванне. У фальклоры народаў Заходняй Еўропы [24] — гэта працэсія мерцвякоў, якая імчыцца па небе. Калі з неба даносіцца жахлівы рык, у лесе пачынаюць гнуцца і падаць дадолу дрэвы, з дамоў зрывае дахі, — значыць, пачалося дзікае паляванне.

Па небе імчыцца кавалькада прывідных істот са зграяй сабак; на чале кавалькады — Дзікі Паляўнічы. Яго нярэдка атаясамліваюць са скандынаўскім богам Одзінам. Дзікі Паляўнічы вядомы таксама як Чорны Коннік і пад многімі іншымі імёнамі. Паводле А. Афанасьева, «часта здараецца, што ў светлую, ціхую ноч раптоўна раздаецца



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

страшны гуд, святло месяца цьмее, віхуры ўсчынаюць свіст, дрэвы ломяцца і падаюць з трэскам, і ў знішчальнай буры нясецца па паветры Дзікі Паляўнічы — адзін або ў суправаджэнні вялікага поезда духаў...

На зграбным, белым, што малако, кані, які вывяргае з ноздраў і рота полымя, скача старажытны бог на чале вялізнай світы; галава яго пакрыта капелюшом з шырокімі палямі; плашч, накінуты на плечы, далёка развяваецца на ветры... Часам Дзікі Паляўнічы выязджае не вершна, а ў вогненнай калясніцы на вагнедышных конях; калясніцай кіруе фурман, ён гучна ляскае пугай, і пасля кожнага ўдару сыплюцца маланкавыя іскры» [24, с. 525].

Сустрэча з Дзікім Паляўнічым вяшчуе няшчасце і нават смерць.

Да нашага часу дайшло сведчанне, што многія жыхары англійскага гарадка Пітэрбора бачылі, як па небе пранёсся натоўп паляўнічых на чорных конях; услед імчаліся чорныя сабакі, чуліся крыкі і гукі рога. Паляўнічых было не менш за дваццаць. Толькі пад ранне яны пакінулі нябёсы над ахопленым жахам гарадком.

Прыведзенае апісанне дзікага палявання многімі сваімі рысамі ўвасобілася ў аповесці У. Караткевіча: «Я пачаў лічыць іх і налічыў дваццаць. Дваццаць першы скакаў наперадзе... вочы яго закрываў нізка насунуты капялюх з пяром... Конскія грывы веялі па ветры. <…> Веялі па ветры плашчы-велеісы» [т.7, с. 91]. Праўда, у Караткевіча паляванне выязджае «заўжды толькі ўначы, калі туман паўзе па зямлі», бо мае надзвычай зямное, «балотнае», паходжанне.

У створанай ім легендзе-містыфікацыі пісьменнік прыадкрывае, а ў заключных радках — канкрэтызуе філасофска-сімвалічны змест вобраза дзікага палявання, якое «будзе скакаць да тых часоў, пакуль існуе свет»: «не прайшоў ягоны час, пакуль ёсць цемра, голад, нераўнапраўе і цёмны жах на зямлі. Яно — сімвал усяго гэтага» [т. 7, с. 97].

Аднак усеагульнае Зло набывае ў аповесці і канкрэтнае — гістарычнае, сацыяльнае — увасабленне. Гэта шляхта, працэс вымірання якой ва ўзноўлены аўтарам час «якраз падыходзіў да канца». «Гэта смерць, гэта гнаенне зажыва... было ўжо не паэтычна і зусім не сумна, а брыдка, часам нават жахліва ў аголенасці сваёй» [т. 7, с. 8—9].

У. Караткевіч разняволена-шчодры ў эпітэтах і параўнаннях пры апісанні, напрыклад, шляхецкага з’езду ў Балотных Ялінах: «... асобы былі дзіўныя. Патрапаныя ці занадта гладкія твары, прагныя вочы,



Рэпазіторый БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

вочы замучаныя, вочы благальныя, вочы з вар’яцінкай <…>, вочы вялізныя і пукатыя, як у саламандры падземных азёр <…>. Калі яны нахіляліся, святло падала зверху, і насы здаваліся надзіва доўгімі, а раты праваленымі <…>. Яны выскаляліся, як выхадцы з магілы, цалавалі руку (і мне здавалася, што яны смокчуць з яе кроў)... » [т. 7, с. 56]. (Варта адзначыць, што, пішучы пра У. Караткевіча, зведваеш небяспеку злоўжыць цытаваннем. Хочацца звярнуцца да яго з тымі ж словамі, з якімі ён звяртаўся да Р. Барадуліна ў рэцэнзіі на кнігу «Свята пчалы»: «Цытаваць цябе амаль нельга! Іначай атрымаецца кніга цытат» [т. 8, кн. 2, с. 394]. А хочацца купацца ў ягоным слове, дабрэнным, крамяным, трапным).

Між тым, знаёмства з міфалагічным вобразам дзікага палявання абумовіла яшчэ адну асацыяцыю. «Дзікі Паляўнічы», як цытавалася вышэй, «вядомы таксама як “Чорны Коннік”». Усякі аматар творчасці Караткевіча міжвольна ўявіць пры гэтым чалавека «на вараным кані», твар якога, «шырокі і загарэлы», «увесь быў папаласаваны і зрэзаны страшнымі шнарамі» [т. 4, с. 36]. Уражанне відавочцаў (раман «Каласы пад сярпом тваім») было такое, што з’явілася сама ноч, як гэта ёй належыць — «на чорным кані і ў чорным плашчы» [т. 4, с. 143]. Гэта Чорны Война, жывы «асколак» паўстання 1830 г., вечны сімвал непакоры і барацьбы. Як бачым, рамантычны вобраз Дзікага Паляўнічага вылучаны Караткевічам з суцэльнага кантэксту дзікага палявання, што ўвасабляе Зло. Бог Одзін — Дзікі (Паляўнічы) — Адзін. Сродкі фанетычнага ўзроўню ўзмацняюць разуменне мэтазгоднасці той мастацкай логікі, якая, думаецца, кіравала аўтарам «Каласоў…». Война — чалавек гонару з «насцярожанымі і бязлітаснымі» [т. 4, с. 144] вачыма, які вырашае: «…паўстанне будзе жыць, пакуль буду жыць я» [т. 4, с. 146], і кажа «не» Раўбічу, бо кіруецца спрадвечнай беларускай высновай «Дзе двое — там рада, дзе трое — там здрада», і таму ўпэўнены, што «ў атрадзе з трох — адзін здраднік» [т. 4, с. 145]. Вобраз Чорнага Войны — гэта яшчэ і сімвал «гераізму адзіночнай барацьбы». Гаворачы аб раз’яднанасці славян, У. Караткевіч мае на ўвазе — і небеспадстаўна — «разагульненасць неардынарных асоб, з якіх... амаль кожная прыдатная ў баладу, а на справе — ... цягне ў свой бок... І таму гінуць, выходзяць на эшафот, да плахі, стаюць пад кулі...» [т. 8, кн. 2, с. 402]. Аднак вытанчаным ланцужком мастацкіх дэталяў У. Караткевіч знітаваў справу шляхецкіх рэвалюцыянераў як агульную (мы памятаем,



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

што ў свой час Раўбіч уратаваў ад смерці Война, а Алесь Загорскі — самога Раўбіча), тым самым акцэнтаваўшы слых чуйнага чытача на ноце надзеі.

Адзін з галоўных сімвалічных вобразаў у творчасці пісьменніка — вобраз каласоў, змест якога беларускімі навукоўцамі грунтоўна даследаваны. Мы не маем непасрэднага аўтарскага каментарыя наконт паходжання назвы, якая паўстае грунтоўнай і загадкавай брамай да такога дасканалага тварэння дойліда ад літаратуры, як згаданы раман. Яго пачатак, піша У. Караткевіч, «прыйшоў у галаву 7 жніўня 1959 г. ля Азярышча» [цыт. паводле: 4, т. 8, кн. 2, с. 437]. Сам аўтар растлумачвае чытачу і сімвалічны сэнс вобраза грушы, якая «цвіла апошні год».

Між тым, на нашу думку, мог у Караткевіча з'явіцца і такі запіс: «Ездзіў у Мілавіды, дзе адбыўся бой паміж паўстанцамі 1863 г. і царскімі войскамі. Версія назвы ўзнікла ля помніка на Мілавідскім полі» [цыт. паводле: 4, т. 8, кн. 2, 449]. Аднак такога — дакладна — запісу няма. У запісной кніжцы пісьменніка пазначана, што ў маі 1967 г. У. Караткевіч быў з М. Грынчыкам у Мілавідах і на радзіме апошняга ў вёсцы Быцень на Слонімшчыне.

Праўда, Мілавіды фігуруюць і ў Караткевічавым лісце да польскага вучонага Міраслава Ахоцкага («Задума: узнікненне і ўвасабленне»), дзе, у прыватнасці, гаворыцца: «Я збіраў матэрыял для "Каласоў пад сярпом тваім" дванаццаць год. Шукаеш, капаешся ў архівах, ездзіш на месцы сражэнняў, пытаешся ў старых, скажам, у "Мілавідах", што ім расказвалі бацькі і дзяды, дзе гэта было, хто адкуль ішоў... Кожнае адкрыццё выклікае лавіну асацыяцый, варыянтаў, мяняе калізіі... » [т. 8, кн. 2, с. 357].

У аўтабіяграфіі «Дарога, якую прайшоў», напісанай у снежні 1964 г., У. Караткевіч зазначыў, зрабіўшы акцэнт на назве: «... Над гэтым раманам — "Каласы пад сярпом тваім" — працую і зараз» [4, т.8, кн. 2, с. 10].

Істотна адзначыць, што ўлетку 1963 года пісьменнік разам з Я. Брылём і У. Калеснікам падарожнічаў па Заходняй Беларусі і хоць, напрыклад, у кнізе У. Калесніка «Усё чалавечае» [25] няма ніводнай згадкі пра наведванне імі Мілавідаў, мы ўсё ж вылучаем версію, што яно магло мець месца.

Справа ў тым, што на месцы Мілавідскай бітвы, па абодва бакі старога Варшаўскага тракта, стаяць помнікі. Адзін устаноўлены палякамі ў гонар загінуўшых касінераў, другі ўвекавечыў памяць



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

салдат царскай арміі, якія палеглі, падаўляючы паўстанне. Ён уяўляе сабой крыж з выявай анёла на адным баку і рэльефным адбіткам зламанага коласа — на другім, што, вельмі верагодна, мог бачыць У. Караткевіч і ўключыць гэты вобраз у сферу сваіх мастацкіх асацыяцый. Таму мы і дазволілі сабе вылучыць вышэйзгаданую гіпотэзу аб паходжанні назвы рамана «Каласы пад сярпом тваім». Прадстаўленая ў дакладзе аўтара дадзенага дапаможніка на II Міжнароднай канферэнцыі ў гонар 75-годдзя з дня нараджэння У. Караткевіча (Орша, 2005 г.), яна была адзначана А. Мальдзісам як вартая існавання.

У рэйтынгу, ажыццёўленым у канцы 1999 г. газетай «Звязда», паэма Я. Коласа «Новая зямля» і раман У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» з вялікім адрывам ад іншых былі названы Кнігамі стагоддзя. Думаецца, такі лёс спасцігне гэтыя творы і ў наступным стагоддзі, бо тэзіс «Класічны твор невычэрпны» — не клішэ, а адкрыццё, якое робіць кожнае новае пакаленне чытачоў. Не памяншаецца ўпэўненасці і ў тым, што проза У. Караткевіча і надалей будзе прыцягваць сваімі таямніцамі, бо сумна жыць у дарэшты вытлумачаным свеце.



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

# ВЫВУЧЭННЕ РАМАНА «КАЛАСЫ ПАД СЯРПОМ ТВАІМ» У СВЯТЛЕ ПРАБЛЕМЫ ФАРМІРАВАННЯ ГІСТОРЫКА-ПАТРЫЯТЫЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ СТАРШАКЛАСНІКАЎ

Для перыяду ранняга юнацтва характэрна інтэнсіўнае развіццё самасвядомасці. На гэтым этапе ў навучэнцаў павышаецца адказнасць за свае паводзіны, за сваю будучыню, цэнтральнае месца займае праблема ўзаемаадносін асобы і грамадства, а ў літаратурным развіцці робяцца актуальнымі праблемы гістарычных і эстэтычных сувязей мастацтва і жыцця, у чытацкім успрыманні — канцэпцыйнасць і ўвага да мастацкай формы твора. Асаблівасць ранняга юнацтва і ў павышанай успрымальнасці да маральнага і эстэтычнага ўздзеяння. Гэтаму спадарожнічае імкненне выпрацаваць уласны пункт гледжання, даць сваю ацэнку падзеям, што адбываюцца, якая не заўсёды адпавядае агульнапрынятай, але здабыта ўласнай працай, напружаннем думкі. У юнацкім узросце развіваецца ўменне комплекснай ацэнкі чалавека. Кумірамі становяцца людзі гарманічна развітыя, у якіх інтэлектуальныя якасці ўдала спалучаюцца з фізічнай развітасцю, знешняй прывабнасцю, добрымі манерамі. «Прымерка» на сябе стымулюе працэс самавыхавання. З'яўляецца ўзмоцненая цікавасць да этычных праблем, а характар іх вырашэння выступае як крытэрый маральнага развіцця асобы; выяўляецца высокі інтарэс да «вечных» праблем: сэнсу жыцця, шчасця, абавязку, свабоды асобы. Акрамя таго, нельга не адзначыць складаную ў псіхолага-педагагічным плане сітуацыю: натуральнае імкненне гэтага ўзросту да рамантызму сёння сутыкаецца з прагматычнай арыентацыяй, спараджаемай эканамічнымі ўмовамі жыцця. А ў юнацтве немагчыма проста адмовіцца ад адной мэты на карысць другой. Таму важнейшая задача настаўніка, які працуе з гэтым узростам, — паказаць, што на самай справе рамантычныя і прагматычныя ідэалы і каштоўнасці цалкам сумяшчальныя, што іх можна злучыць на ўзроўні вышэйшых чалавечых каштоўнасцей. Важна дапамагчы маладым людзям знайсці ў



Рэпазіторый БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

прагматычна арыентаваных герояў прывабныя маральныя і рамантычныя рысы, а ў рамантыкаў — карысныя дзелавыя якасці.

Гэтая і іншая актуальная для моладзі праблематыка надзвычай поўна ўвасобілася ў вобразах рамана «Каласы пад сярпом тваім».

Між тым аналіз рамана пазбаўляе настаўніка магчымасці быць заложнікам нейкіх кан'юнктурных сітуацый, бо твор грунтуецца на пастаянных ідэях і каштоўнасцях, што сцвярджаюць універсальную значнасць чалавечага быцця ў цэлым і асобы ў прыватнасці. Ён запрашае сучасніка да дыялогу з прадстаўнікамі папярэдняй культурна-гістарычнай эпохі, якія якраз і нясуць вечны змест гістарычнага працэсу, а іх голас можа быць інтэрпрэтаваны як голас сучасніка, бо вечнае заўсёды сучасна. Гэтая акалічнасць робіць многія гістарычныя пазіцыі сувымернымі з сучаснай рэчаіснасцю і адкрывае магчымасць супрацоўніцтва розных гістарычных эпох, творчую пераемнасць мінулага чалавечага вопыту, праз што рэалізуецца рэгулятыўная функцыя гісторыка-патрыятычнай свядомасці, якая вызначае прызванне чалавека (яго быццё на ўзроўні культуры). Гэтая катэгорыя арганічна злучае асобасныя характарыстыкі чалавечага лёсу з грамадскімі чалавекастваральнымі праграмамі, якія ідуць з канкрэтна-гістарычнымі формамі сацыяльнасці, з таго ці іншага канкрэтнага этнасу.

Фарміраванне гісторыка-патрыятычнай свядомасці старшакласнікаў пры вывучэнні рамана грунтуецца на далейшым асэнсаванні канкрэтных агульначалавечых каштоўнасцей, якія ўвасобіліся ў разгледжаных раней праграмных творах У. Караткевіча.

Высвятляючы дыялектыку рамантычнага і прагматычнага, нельга абысці ўвагай паняцце прыватнай уласнасці, якая ў якасці агульначалавечай каштоўнасці сцвярджалася праз палеміку. Як паказваюць навейшыя даследаванні, уласнасць — не толькі эканамічная катэгорыя, а і элемент духоўнай і матэрыяльнай культуры, з'ява, што без асобы не існуе і ўздзейнічае на яе як прадмет, як адносіны, як права і як каштоўнасць. Уласнасць — адзін з важнейшых фактараў сацыялізацыі, яна мнагаякасная, як і асоба. Усякая яе форма можа ўплываць на асобу як станоўча, так і адмоўна. Калі ўласнасць спрыяе развіццю асобы, то яна не павінна лічыцца несправядлівай, а ўяўляе сабой адзін з асноўных фактараў фарміравання асобы, перадумову яе індывідуальнасці. Прыватны — значыць адпаведны



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

аўтаноміі і свабодзе асобы. Прадмет і прадукт уласнасці, акрамя адносін карыснасці і выгады, заўсёды выклікаў у беларусаў маральныя і эстэтычныя пачуцці: любоў да зямлі, поля, лесу, дрэва, ля якога сядзелі дзяды і прадзеды, да дома, да ўспамінаў і паданняў, звязанных з зямлёй і яе ранейшымі ўладальнікамі. У той час працаўнік, якому зямля не належала, духоўна-інтымнай сувязі з ёй не адчуваў. Менавіта такая сувязь ёсць спосаб сувязі з Айчынай, месцам нараджэння і смерці. Прыдатнымі для сучаснасці могуць быць толькі маральныя, узвышана-патрыятычныя адносіны да ўласнасці. Іх узоры мы знаходзім ў гістарычным мінулым і ў літаратуры. Тып асобы-стваральніка, не спажыўца, не дачасніка, мецэната, дабрачынніка, рамантыка, — адраджаецца і зараз як паўтараемая з'ява сацыяльнага жыцця. У рамане «Каласы пад сярпом тваім» мы бачым маральныя ўзоры такіх асоб, для якіх уласнасць не самамэта, а сродак вышэйшых маральных мэт. Яны здольныя аказваць уплыў на чытача.

Зварот да гэтых аспектаў дазваляе забяспечыць прынцып навізны ў выкладанні нават пры выкарыстанні самых традыцыйных форм урока, як, напрыклад, лекцыя, прысвечаная біяграфіі пісьменніка. Вылучаюцца цікавыя для вучняў моманты, якія дазваляюць зразумець не толькі веліч пісьменніка, але і складанасць станаўлення яго асобы і таленту. Напрыклад, гэтаму спрыяюць элементы астралогіі, цікавасць да якой абвострылася на сучасным этапе. Нягледзячы на адсутнасць да яе афіцыйных адносін, усё ж нельга гэтую цікавасць ігнараваць, бо, на думку спецыялістаў, астралогія — гэта чалавеказнаўства і інструмент пазнання свету, а яе высновы грунтуюцца на гістарычных, псіхалагічных, міфалагічных, нават анатамічных ведах. Вучоныя сцвярджаюць, што «кожны момант часу і кожны пункт прасторы ў прынцыпе мае веер магчымасцей, і рэалізацыя адной з іх залежыць не толькі ад збегу абставін, але і ад выбару самога чалавека, ад выбару як мэты, так і шляху яе ажыццяўлення» [27, с. 117]. Між тым, «перанесеныя з іншых форм жыццядзейнасці, такія формы патрабуюць ад настаўніка высокай культуры, асцярожнасці, захавання меры і такту, каб за гульнявой выдумкай, фармальнай навізной, арыгінальным прыёмам не страчвалася сапраўды навуковае, канкрэтна-гістарычнае «прачытанне» мастацкага твора» [28, с. 134]. Так, пісьменнікам У. Караткевіч быць не



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

збіраўся, аднак стаў ім, рэалізаваўшы менавіта гэтым шляхам першапачаткова пастаўленую мэту — даследаваць гісторыю паўстання 1863—1864 гг. Глыбока, па-філасофску разумеў жыццё, што відаць і ў рамане: «Адна рака здаўна-давён ведае, у якое яна мора плыве, другая — з цяжкасцю прабівае сабе шлях...» [т. 4, с. 238]. Ён добра ведаў, «у якое мора плыве» сам, і памяць роду адыграла ў яго лёсе вызначальную ролю.

Змест лекцыі складаюць «зямныя шляхі» пісьменніка, прайсці якімі дапамагае відэафільм «Рыцар і слуга Беларусі». Засвоіць асноўныя звесткі і адчуць багацце асобы У. Караткевіча вучні змогуць праз запаўненне табліцы (рыс. 1) у час ўрока, а затым яе працяг па меры атрымання інфармацыі пра пісьменніка на наступных занятках і пры знаёмстве з дадатковай літаратурай.

**Жыццёвы і творчы шлях Уладзіміра Караткевіча**

| Жыццёвыя выток і | Багацце асобы | Жанры, творы, зборнікі | Творчая гісторыя «Каласоў...» | Наватарства | Складанасці ў творчым лёсе | Вядучыя рысы асобы і творчасці | Сакрэт папулярнасці твораў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| … | … | … | … | … | … | … | … |

Рысунак 1

Асоба У. Караткевіча дае прыклад беражлівых і паважлівых адносін да гісторыі роду, што вядома вучням ужо з сярэдніх класаў. Новы ўзровень разумення гэтага дае верш «Прыватная гісторыя», прачытаны на ўроку. Акцэнтуецца ўвага на сакральным усведамленні пісьменнікам сваёй місіі будзіцеля гістарычнай свядомасці. У многіх яго творах, пачынаючы з казак, утрымліваюцца адметныя мастацкія формулы трыяды, якая характарызуе гэты феномен. Адной з іх з'яўляецца назва пасмяротнага зборніка паэта «Быў. Ёсць. Буду», якая можа быць растлумачана наступным чынам: У. Караткевіч нібыта «Быў», прысутнічаў са сваімі героямі ва ўсіх гістарычных эпохах, пра якія пісаў; «Ёсць» — пражыў адведзены кожнаму чалавеку адрэзак часу; «Будзе» ва ўдзячнай памяці сваіх чытачоў. Варта тут згадаць і словы



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Віктара Каліноўскага з рамана «Каласы пад сярпом тваім»: «Варты жалю той, хто не ведае былога дня і таму не можа разабрацца ў сённяшнім і прадбачыць будучы…» [т. 5, с. 127]. Такія прыёмы падкрэсліваюць цесную сувязь, залежнасць пісьменніка ад рэчаіснасці і чытача ад твора. Аднак у вядомы час вульгарны сацыялагізм здымаў праблему спецыфікі індывідуальнай свядомасці. Гэта выяўлялася і ў тым, што не ўлічвалася адметнасць праламлення рэчаіснасці ў светапоглядзе мастака. Вучнямі дадзены аспект засведчаны ў графе табліцы «Складанасці творчага лёсу», а таксама ў паглыбленні сутнасці паняццяў «патрыятызм» і «нацыяналізм». У супрацьвагу абвінавачванням, што У. Караткевіч захапляецца паказам побыту князёў у палацах, ён імкнуўся праз умелае выкарыстанне ўсяго комплексу гістарычных традыцый і духоўных каштоўнасцей абудзіць у моладзі здаровы гонар за сваіх продкаў, жаданне прымножыць атрыманую ад іх спадчыну. У святле гэтага першапачаткова і тлумачылася паняцце «нацыяналізм», якое з цягам часу пачало ўжывацца палітыкамі як сінонім слова «шавінізм». Згодна з Оксфардскім тлумачальным слоўнікам сучаснай англійскай мовы, нацыяналізм — гэта: 1) моцная адданасць сваёй уласнай нацыі; 2) рух за палітычную, эканамічную незалежнасць (у краіне, якая кантралюецца іншай). Відавочна, што гэта станоўчае грамадзянскае пачуццё, аднак з пазіцый вульгарнага сацыялагізму яно трактавалася як заганнае.

Урок павінен не проста дэталёва канкрэтызаваць уяўленне пра асобу пісьменніка, а і быць поўным роздуму над яго жыццём, тлумачэннем, выяўленнем ідэйнага, маральнага і эстэтычнага падтэксту біяграфічных фактаў. Прагаворванне, а не чытанне лекцыі, «прыватны душэўны ўдзел» лектара [29] робіць слухачоў дзеючымі асобамі пэўных сітуацый, стварае адчуванне непасрэднага, асабістага знаёмства з пісьменнікам. Гэтаму спрыяе і гумар настаўніка, выкарыстаны з вялікім тактам і пачуццём меры, звязаны з тэмай, бо асобу У. Караткевіча немагчыма ўявіць без яго пачуцця гумару, якім надзелены і героі многіх твораў пісьменніка. Прынцып «тое, што сур’ёзна, не абавязкова сумна» можа быць пакладзены і ў аснову замацавання лекцыйнага матэрыялу. Асабовыя характарыстыкі пісьменніка можна параўноўваць з загадзя дадзенымі рысамі



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

народжаных пад знакам Стральца, да якога належыць У. Караткевіч. Гэта актывізуе дзейнасць вучняў. Адзначаюцца рысы знешнасці, характару, светапогляду.

Уплыў асобы аўтара выяўляецца і праз яе энергетыку. Таленавіты чалавек моцны энергетычна. Нават рукапісы нясуць «выпраменьванне» аўтара, і стан, у якім ён піша, не можа не ўздзейнічаць на чытача.

Існуе думка, што духоўны патэнцыял таго, хто сутыкнуўся з геніем, зменены назаўсёды. Можна яе не прымаць, але такія меркаванні сёння існуюць незалежна ад нас, і варта скіроўваць цікавасць вучняў у разумнае рэчышча, на ўсебаковае ўзбагачэнне імі ўласнай асобы. У практыцы аўтара дапаможніка, напрыклад, даследаваўся почырк пісьменніка на факсіміле рукапісу, тым больш, што почырк у Караткевіча — важны сродак характарыстыкі Кастуся Каліноўскага ў рамане. Почырк пісьменніка характарызуе яго розум («думка абганяе руку»). Ён чалавек валявы, бо літары не маюць кручкоў і ўпрыгажэнняў, яны без штрыхоў, выразныя і г. д.

Разнастайныя прыёмы актывізацыі дзейнасці вучняў ствараюць непаўторны настрой урока, а манера маўлення і паводзіны настаўніка надаюць вучэбнаму матэрыялу прыцягальную сілу. Далучэнне школьнікаў да духоўнага і мастацкага свету творчай асобы творцы рыхтуе іх да асэнсаванага ўспрымання рамана «Каласы пад сярпом тваім».

## Роля кампазіцыйных элементаў у раскрыцці ідэйнага зместу рамана «Каласы пад сярпом тваім»

Спасцігаючы твор, важна высветліць прычыны звароту У. Караткевіча да тэмы паўстання, звярнуцца да гісторыі стварэння рамана і асаблівасцей яго пабудовы. Старшакласнікі павінны ўяўляць рэальную і мастацкую «геаграфію» падзей, бачыць сувязь месца і часу ў мастацкім аповедзе.

Сярод важнейшых крытэрыяў, што вызначаюць задачы школьнага курса літаратуры, вылучаюцца ўменні, звязаныя з аналізам мастацкага твора:

– знаходзіць эмацыянальны лейтматыў (агульны тон, настрой) і асноўную праблему твора;



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

– прасачыць развіццё сюжэту ў эпічным творы, канфлікту ў драме, змену пачуццяў у лірычным вершы;

– апраўдаць слова-вобраз і вызначыць стылістычную афарбоўку апавядання;

– супастаўляць герояў і сітуацыі розных твораў, вылучаючы агульнасць і адрозненне аўтарскай пазіцыі;

– бачыць рух думкі пісьменніка ад задумы твора да мастацкага яе ўвасаблення і параўноўваць фрагменты варыянтаў тэксту;

– вылучаць агульныя ўласцівасці твораў аднаго жанру, адрозніваць індывідуальную адметнасць у межах агульнага жанру.

Узроўні развіцця розных бакоў чытацкага ўспрымання таксама ў значнай ступені вызначаюць формы і скіраванасць працэсу вывучэння літаратурных твораў. Сярод іх актыўнасць чытацкіх пачуццяў і дакладнае адчуванне пачуццяў аўтара; актыўнасць і аб'ектыўнасць чытацкага ўяўлення, узнаўленчага і творчага; спасціжэнне зместу твора на ўзроўні рэпрадуктыўным (пераказ), аналітычным (пытанні да тэксту, развагі над прачытаным, матывіроўка падзей, учынкаў герояў), сінтэзуючым (канцэпцыя твора ў цэлым); асэнсаванне мастацкай формы на ўзроўні дэталі і кампазіцыі. Калі мы не заўважым індывідуальных асаблівасцей формы твора, то перад намі не выявяцца істотныя рысы зместу, якія яе абумовілі і матывавалі.

У методыцы застаецца адкрытай праблема ўступных заняткаў, якія традыцыйна будуюцца ў навукова-храналагічным плане, без вырашэння канкрэтных «тэкставых» праблем. Або на ўступных занятках называюцца ўсе праблемы твора, але не вырашаецца ні адна. Зноў узнікае разрыў паміж імі і тэкстам.

Структура заняткаў не павінна быць кананічнай, але на іх абавязкова павінен «працаваць» мастацкі тэкст. Вывучэнне архітэктонікі твора дапамагае вучням больш глыбока, шматгранна, выразна выявіць аўтарскую пазіцыю. Абмеркаванне загалоўка рамана і яго частак і далейшае супастаўленне іх з тэкстам — вядучая форма работы на ўступных занятках. Другі аспект — аналіз прысвячэння і эпіграфаў, з якімі яно кантрастуе, бо яны маюць выразны сацыяльны сэнс.

Сярод прыёмаў вывучэння кампазіцыі — супастаўленне частак і розных элементаў мастацкага тэксту, вылучэнне і параўнанне вобразаў герояў, разгляд сувязей пейзажа і партрэта з агульнай плынню тэксту і



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

інш. Аналіз кампазіцыі ва ўмовах школьнага разбору можа валодаць і няпоўнай усеагульнасцю, частковасцю ахопу матэрыялу твора.

Ідэйны бок рамана «Каласы пад сярпом тваім» цесна звязаны з яго кампазіцыяй. Форма твора дапамагае спасцігнуць усю яго духоўную глыбіню. Праца з загалоўкамі і эпіграфам дазваляе ў сканцэнтраваным выглядзе выявіць узровень развіцця чытацкага ўспрымання, скіраваць працэс вывучэння твора ў рэчышча, найбольш спрыяльнае для фарміравання гісторыка-патрыятычнай свядомасці вучняў.

Загаловак і эпіграф — гэта своеасаблівыя міні-тэксты, якія адпаведным чынам настройваюць думку і пачуццё чытача, выклікаюць жаданне зразумець, дзеля чаго напісаны твор. Гэтая мэта і арганізуе аналіз твора. Апрацоўка ў думках загалоўка — першы крок да ўсведамлення ідэі, актуалізацыя ў наяўным вопыце чытача тых уяўленняў, на якія будуць абапірацца новыя веды. Пры супастаўленні вядомага са зместам загалоўка нараджаецца здагадка пра кола акрэсленых аўтарам праблем, узнікаюць пытанні і гіпотэзы, а гэта настройвае на далейшы дыялог з тэкстам, стымулюе спасціжэнне яго сэнсу і галоўнай думкі. Чым лепш апрацаваны загаловак (вычарпаны яго змест, узніклі пытанні, сфармуляваны гіпотэзы), тым больш паўнавартасным будзе далейшае чытанне. Неабходна адзначыць, што загалоўкі ў залежнасці ад іх функцыі бываюць розныя. Часам аўтар мае намер пры ўваходзе ў тэкст паведаміць чытачу, што яго чакае, і тады загаловак — сціслае выражэнне галоўнай думкі твора. Загалоўкі-пытанні скіроўваюць чытача ў рэчышча пошукаў адказу. Аднак у шэрагу выпадкаў аўтары даюць сваім творам такія назвы, якія сутыкаюць чытача з нечым нечаканым і незразумелым, і ён міжвольна ўцягваецца ў самастойную пастаноўку пытанняў і далей шукае адказы на іх у тэксце. Гэта ў поўнай меры адносіцца да назвы рамана «Каласы пад сярпом тваім». Як сведчыць настаўніцкі вопыт аўтара дапаможніка, першапачатковыя асацыяцыі пры яе гучанні прыводзяць вучняў да высновы аб прыналежнасці твора да традыцыйнай «вясковай», «сялянскай» прозы. Але, на іх думку, дзякуючы інверсіі, назва гучыць рамантычна і загадкава: «...пад сярпом тваім».

Адна з форм пазнавальнай дзейнасці — абмеркаванне загалоўка да чытання тэксту і далейшае супастаўленне яго са зместам твора.

Найперш варта адзначыць вобраз каласоў як рэалістычны. «Сям-там на апошніх лапіках поля жанчыны ваявалі з каласамі.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Жоўтыя бароды жменяў здрыгаліся і бязвольна клаліся пад сярпом» [т. 4, с. 375]. Ідучы ад гэтага вобраза, можна ўявіць сабе тую мастацкую логіку, якая дазволіла У. Караткевічу напоўніць гэты вобраз сімвалічным зместам, падказала канкрэтныя выяўленчыя сродкі, дзякуючы якім ён успрымаецца як увасабленне ўніверсальнага закону чалавечага быцця.

«Гэты маладзік — гэта серп, а гэтыя трысцінкі — каласы. Хто будзе жаць — аб гэтым маўчаць гады і маўчаць стагоддзі...» [т. 4, с. 75]. З аднаго боку, дадзены эпізод — сведчанне глыбіні пантэізму беларусаў, з другога — адзнака іх досыць моцнай рэлігійнасці і веры ў прадвызначанасць чалавечага лёсу. Відавочны глыбокі філасофскі сэнс вобраза. «А потым прыйшла чарга палегчы каласам...» [т. 4, с. 267]. Але не трэба шукаць песімізму ў гэтых радках. Яны ўвасабляюць непарушную логіку жыцця: згіне штосьці ў адным месцы — з такой жа неабходнасцю яго апошні пасыл узнікне ў новым месцы, каб надалей працягнулася існаванне жывога.

Незалежна ад кантэксту ўжывання вобраза каласоў, яны нязменна надзелены душою, і гэтая з'ява мае карані ў далёкім мінулым. «Душа нівы... хаваецца ў апошнюю жменю каласоў. Апошнюю жменю зразаюць асцярожна. Яна ляжыць пад абразамі і выходзіць з хаты толькі на каляды, прывязана да галавы “казы”. Тут яна радуецца і вырашае зрабіць, каб людзям было добра. І людзі не кідаюць яе» [т. 4, с. 250]. Вясной гэтую «душу» кладуць у маладыя ўсходы збожжа і яна зноў пануе ў сваім зялёным царстве, не даючы загінуць ніводнай расліне.

Аднак на старонках рамана ідылія ў духу язычніцтва вельмі хутка змяняецца жорсткімі сацыяльнымі рэаліямі, а вобраз каласоў, адпаведна, напаўняецца сацыяльным зместам. І калі ў гневе і адчаі пан Даніла Загорскі выгукае: «Няшчасны колас! Няшчасны колас пад невядомым сярпом. Ды і хіба пад адным?.. За што?..» [т. 4, с. 174] — то адказу няма толькі на самае апошняе пытанне. «Ён ненавідзеў папоў, ненавідзеў цяпер бога, ненавідзеў салдат і жандараў, тых, ад якіх тхнула потам, даносам і крывёй, тых, якія арыштоўваюць людзей за настроі і гэтым зводзяць у магілу стварэнне, якое нікому не прычыніла зла. Ён ненавідзеў маладога цара, які зрабіў так, што людзей, дваран, якія адказваюць за свае палітычныя погляды, хапаюць у іхняй крэпасці» [т. 4, с. 174—175]. Нягледзячы на тое, што гнеў пана Данілы быў абумоўлены найперш прычынамі асабістага плану, гонар яму робіць заява:



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

«Супраць народа я не пайду» [т. 4, с. 181]. Значна далей ідзе яго ўнук, князь Аляксандр Загорскі, ідзе з народам, паверыўшы ў яго творчыя сілы, знайшоўшы адказы на многія пытанні. «Бедныя, бедныя людзі! Як каласы, як травы пад сярпом тваім, грубая сіла. Ну што ж, калі твая “неабходнасць” не можа даць ім палёгкі, і волі і шчасця — тым лепей. Тады па сваёй “неабходнасці” яны стануць каласамі пад сярпом волі, радзімы, паўстання, бітвы, каласамі, якія памруць магчыма, але памруць, каб вырасла новая рунь. Гэта будзе скора. Нядоўга чакаць» [т. 5, с. 384].

Упэўніўшыся ў непахіснасці перакананняў свайго ўнука Алеся, стары Вежа бласлаўляе яго на шлях «пры кані святога Міколы». У імя агульнага прагрэсу. «Але людзям трэба ісці. Каб жыць... Асабліва тым, што самі і кідаюць зерне, што даюць яму расці, што змагаюцца за каласы — іначай нівы заглушыла б пустазелле...» [т. 5, с. 241].

«...Мала нас, мала! Адзінкі!» — развёў рукамі Алесь. Кастусь сказаў глухім, але цвёрдым голасам, нібы канчаткова вырашыў усё: «Не трэба тысячы, каб пачаць. І не трэба ста, каб пачаць. І не трэба... дваіх, каб пачаць...» [т. 4, с. 324]. Нездарма кажа народная мудрасць: «Колас да коласа — будзе сноп». І зламаць яго значна цяжэй, чым кожны каласок паасобку. «Мастацкі твор — з’ява вельмі складаная. Калі глыбока расчытаць яго асацыяцыі, то ён можа раскрыцца цікава і нечакана нават для самога аўтара» [30]. Такім чынам, дыяпазон вобраза каласоў вельмі шырокі — ад біблейскага, філасофскага, да вузка інтымнага. Найперш звернемся да сацыяльна-філасофскага. Калі Майка-падлетак спрабуе змагацца са сваім каханнем як з «пачуццём ганебнай накаванасці», не хоча палегчы пакорлівым коласам пад сярпом лёсу, то гэты бунтарскі пачатак выявіцца, як можна меркаваць з асобных дэталяў рамана і накідаў яго працягу, у грамадскім кірунку. Нават пані Антаніда, істота, здавалася б, асацыяльная, замкнёная ў коле інтарэсаў сям’і, любові, веры ў Бога, выкажа сыну свой душэўны боль: «Можа, калі красуе жыта, яно адчувае тое, што і мы, кахаючы... Ты ведаеш, што адчуваюць каласы пад сярпом? Толькі яны не могуць ні ўцячы, ні крычаць. Не дадзена ім... А мы, глушцы, кажам: мо-ожна, бо яны нямыя... Прыгон. Забі яго, Алесь, бо гэта таксама людаедства» [т. 5, с. 237—238].

Усе мы — каласы. І, як сцвярджае Уладзімір Караткевіч сваім жыццём і творчасцю, — перш за ўсё каласы на ніве сваёй Бацькаўшчыны. Думаецца, з вядомай тэзы Канфуцыя «Трэба вучыць



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

радзіму любіць, бо іначай — за што яе любіць» пісьменнік, бясспрэчна, прыняў бы толькі першую частку. Пытання «За што?» для яго не існавала. І пытання «Як?» таксама. Толькі дзейсна, да самаахвярнасці:

Часта радуеш сэрца ты, часта ты мучыш,
Я павек не забуду твае палі.
І каб стала ты полымем буйнаравучым,
Я саломаю стаў бы. Вазьмі. Спалі. [т. 1, с. 82].

Нягледзячы на знешнюю лаканічнасць, эпіграфам належыць вызначальная роля на шляху да галоўнай думкі. Яны выяўляюць яе непасрэдна ці іншасказальна, выклікаюць аналогіі ці якія-небудзь іншыя асацыяцыі. Ні ў якім разе нельга прыступаць да тэксту, мінаючы эпіграф. Акрамя зместу, эпіграф можа выяўляць і эмацыянальную афарбоўку твора. Адзначаючы сцісласць, «скандэнсаванасць», экспрэсіўнасць эпіграфа, варта мець на ўвазе, што ён пэўным чынам дыягнасціруе і адметнасць асобы творцы, уяўляе сабой эстэтычны зрэз яго культуры, эрудыцыі, светабачання.

Так, раман «Каласы пад сярпом тваім» мае наступнае прысвячэнне: «Маці маёй прысвячаю...» Яно кантрастуе з эпіграфамі як да ўсяго рамана, так і да яго першай кнігі, што маюць выразны сацыяльны сэнс, але гарманіруе з назвай першай кнігі. Таму варта прааналізаваць гэтую назву найперш у індывідуальна-асабовым плане. Агульнавядомы той уплыў, які зрабіла на У. Караткевіча яго сям'я, а яго жыццё і яго творчасць — узор высакароднага і рыцарскага стаўлення да Жанчыны. Дастаткова згадаць «Беларускую песню»:

Дзе жанчыны, як радасны сон у стагах на зары,
А дзяўчаты — як дождж залаты,
А сівыя матулі — як жніўё з павуціннем
І добрае сонца ўгары... [т. 1, с. 136].

Таму бясспрэчна, што раман — даніна ўдзячнасці і павагі той, што дала выток жыццю і стаяла ля вытокаў асобы творцы, «выйсця крыніц». Менавіта гэтае словазлучэнне выкарыстана ў якасці назвы першай кнігі рамана.

Думкавая «апрацоўка» назвы — першы крок да высвятлення ідэі твора. Гэта свайго роду праблема, а вырашэнне праблемы — адзін са



Рэпазіторый БарГУ
PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

шляхоў фарміравання свядомасці. Назва актуалізуе ў наяўным вопыце ўяўленні, на якіх будуць грунтавацца новыя веды.

Што ж уплывала на станаўленне асобы Алеся Загорскага? Дзе вытокі яго перакананняў? Каб адказаць на гэтыя пытанні, варта абмеркаваць наступны тэзіс: «Разуменне сваёй годнасці прыходзіць з простых паняццяў, якія былі калісьці ў вёсцы». Логіка разважанняў вядзе да высвятлення сутнасці дзядзькавання і таго, што яно дало Алесю. Нават у герояў рамана няма адзінства ў поглядах на гэты звычай. «Дурны звычай» [т. 4, с. 42], — думае Выбіцкі. Каб быў «чалавекам, а не прадметам для царквы і псярні» [т. 4, с. 51], — нібыта абвяргае яго Вежа. «Сям'я, дзе трымаюцца старых звычаяў, не можа выхаваць юду» [т. 4, с. 283], — па-свойму рэзюмуе Война. Безумоўна, Алесь пасля дзядзькавання не мае такога свецкага глянцу, як яго аднагодкі ў шляхецкіх сядзібах, але ў хуткім часе набывае яго. А вось такія, як Ілля Хаданскі, не маюць непараўнальна большага і, што самае трагічнае, не адчуваюць сваёй непаўнавартаснасці.

Праз сутыкненне розных пунктаў погляду трэба падвесці вучняў да вываду, што паўстанне 1863—1864 гг. пацярпела паражэнне і з той прычыны, што не было паразумення паміж сялянствам і шляхтай. І менавіта таму У. Караткевіч парушае гістарычную праўду на карысць праўды мастацкай — пераносіць старадаўні звычай у XIX ст., каб «даць шанс» шляхце і сялянам паразумецца, паказаць, што гэта магчыма.

Убачыўшы Алеся, Война адзначае: «У зрэб'і. Але гэта не тое» [т. 4, с. 36]. У героя багаты радавод, знаёмства з якім надае Алесю годнасці і гонару. Але, бадай, найбольшае ўражанне зрабіла на юнака карціна Мантэны «Хлопец з канём». Чаму ж? Бо, па-першае, ажывіла ў свядомасці вобраз белага жарабяці Святога Міколы як сімвала справядлівасці і волі, а па-другое, хлопец быў выліты Алесь, чаго не мог не заўважыць нават пан Юрый.

Народная мудрасць, народны дух, народная творчасць — яшчэ адзін струмень жывой вады для Алеся, які далучае яго да незлічоных скарбаў мора, глыбіню якога ён адчувае пакуль інтуітыўна. І ў гэтым найперш заслуга Данілы Кагута. Уражлівая, паэтычная натура Алеся прагна ўбірае жыватворную вільгаць.

Ніколі ў жыцці юны князь не адрачэцца і ад той мовы, якую зняважліва называлі мужыцкай. У той час як сяляне размаўлялі на ёй,



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

бо не мелі іншай, размаўлялі так натуральна, як дыхалі, для Алеся карыстанне беларускай мовай у шляхецкім асяроддзі — учынак, а потым і жыццёвая пазіцыя. Паэтычная ж творчасць на гэтай мове — прызнанне яе каштоўнасці і дасканаласці.

Чалавека выхоўвае атмасфера бацькоўскага дому. Гаворачы сучаснай мовай, яна падмурак яго імуннай сістэмы супраць вірусаў зла ў яго розных абліччах. Таму важна высветліць наступныя пытанні: у чым адметнасць атмасферы дома Загорскіх? Што з укладу сваёй сям'і возьме Алесь у далейшае жыццё?

Юрый і Антаніда Загорскія аддалі сыну як лепшыя рысы сваёй знешнасці, так і характару; яны імкнуліся бачыць яго разумным, дужым, сумленным і рабілі для гэтага ўсё магчымае. Прычым разумелі, што галоўнае — чыстае сэрца і добрая душа. «Вочы матчыны, а позірк твой», [т. 4, с. 92] — кажа Клейна Юрыю пра Алеся. «Ты панясеш мае вочы далей», [т. 5, с. 240] — скажа Алесю маці перад смерцю. Душа маці, бацькавы памкненні... Але малады князь будзе і глядзець, і бачыць сапраўды далей.

Маці ўзбунтавалася і пакарала сябе за ўсіх, каб давесці ад імя шляхты: «мы не забойцы… мы ад адчаю жывём жыццём другіх… гэта нам крайняя пакута...» [т. 5, с. 240].

Мэта Алеся выспела ў тых жа нетрах, але яна ўсвядомленая і паграмадску значная: «...выкупіць грахі ўсіх, сваёй крывёю здабыць вызваленне для ўсіх, загінуць за ўсіх» [т. 5, с. 414].

Вялікі ўплыў на яго зробіць яго дзед, Даніла Загорскі-Вежа. Варта адзначыць, што яго прататыпам паслужыў Васіль Юллянавіч Грынкевіч, дзед У. Караткевіча. Сястра пісьменніка Н. С. Кучкоўская ўспамінае: «Валодзя моцна любіў яго. Дзед быў багаты душою чалавек і моцны фізічна. Сапраўдны беларускі волат. Ён шмат расказваў Валодзю паданняў, казак. Мова дзеда — гэта быў каскад досціпаў, прыказак, яскравых, як вясёлка, жартаў... Увогуле, мне здаецца, шмат дзедавых пераказаў увайшло ў Валодзеву творчасць... На маю думку, дзед Васіль даў Валодзю ўрок натуральнай беларускасці... А сустрэчы з дзедам адкрывалі Валодзю глыбіню і мудрасць народнай душы. Яшчэ ў тыя гады пасля 39-га ён пачаў сур'ёзна цікавіцца гісторыяй, хаця нават тыя, хто вучыўся ў беларускай школе, сапраўднай гісторыі Беларусі не ведалі і не здагадваліся, якія мы багатыя на культурную спадчыну» [10, с. 227]. Паказальна, што менавіта ў доме дзеда,



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

у Загоршчыне, Алесь адкрыў для сябе назву «Белая Русь» і там пачаўся яго ўпэўнены шлях да мора, імя якому — беларускі народ. Чаму ж дзеда не ўзрадавала нечаканае адкрыццё ўнука?

Тут варта звярнуцца да гістарычнага каментарыя, адзначыць, што дзеянне адбываецца прыкладна ў 1851 г. Беларусь у складзе Расійскай імперыі не мела назвы, мовы, школ... Нацыянальная перспектыва здавалася, з аднаго боку, безнадзейнай: «У гэтага клана было славутае і грознае мінулае, — але і тады ў яго не было імя. У гэтага клана сучаснае, горш за якое цяжка знайсці, і будучае, што губляецца ў тумане невядомага» [т. 4, с. 61]. Гэта меркаванне пана Юрыя. З другога боку, шукаць адказ на пытанне «Хто ты такі?» у дадзенай сферы адзначала станавіцца ў апазіцыю да ўрада Расійскай імперыі, а перспектыва знайсці яго рабілася небяспечнай. Стары Вежа гэта цудоўна разумеў. Да таго ж ён бачыў ва ўнуку самога сябе, толькі нязмерна палепшанага. Ён і ганарыўся Алесем, і баяўся за яго. «Дзед, зведаўшы ўнука за гэтыя дні, цяпер жахаўся, што мог адштурхнуць яго ў першы ж дзень. Усе свае рысы, усе рысы людзей, якіх ён паважаў, ён прададчуваў у гэтым чалавеку» [т. 4, с. 206]. Нават заўсёдная дзедава іронія ў адносінах да Алеся мае пэўную градацыю. Калі спачатку ён лічыць унука заканамерным прадуктам выхавання ў святле ідэалаў «царквы і псярні», то ў адказ на Алесева: «Я веру ў каня святога Міколы. І я пайду пры гэтым кані» — з'едліва пытае: «А ты не баішся, што гэты конь цябе ўбрыкне?» [т. 4, с. 192]. Аднак істотна, што збліжаюцца дзед і ўнук якраз праз здарэнне на манежы, калі «раз'юшаны конь... ускінуў у паветра страшныя пярэднія капыты... Рука працягнула яму на далоні кавалак цукру... Ён пацягнуўся і ўзяў цукар» [т. 4, с. 194]. І гэтае збліжэнне сведчыць пра агульнасць ідэалаў прадстаўнікоў розных пакаленняў. Даніла Загорскі, іранізуючы з Алеся і Кастуся, «сябра трызненняў» ягонага ўнука, робіць «апошнюю спробу павярнуць верацідла, на якім ткалля-парка ткала лёс гэтых юнакоў» [т. 4, с. 316]. Аднак, пераканаўшыся ў непахіснасці іх пазіцыі, не вісне са сваёю старасцю цяжарам на іхніх нагах. «Назіраючы за людзьмі, ён разумеў, што тое, да чаго яны ідуць, — лепшае... І трэба было зразумець, што адзіны спосаб не стаць непатрэбным — змяняцца да смерці і да смерці разумець новае, а калі няздольны зразумець — ставіцца да яго з любоўнай верай» [т. 4, с. 194]. Пры наяўнасці такога разумення, як бачым, не ўзнікае канфлікту пакаленняў. Вобраз Вежы



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

мае глыбокі філасофскі змест. «У глыбіні гістарычнага быцця чалавецтва нястомна і нязбытна сумесна садзейнічаюць і традыцыі, якія захоўваюць сілы мінулага ў сучаснасці і перадаюць іх будучыні, і творчая энергія духоўнай актыўнасці, скіраваная да будучыні і параджаючая новае», якое «як бы зачынаецца з нічога ў тым патаемным найглыбейшым цэнтры асобы, які мы называем свабодай... Калі прынцып творчай ініцыятывы не выспявае спакойна ў лоне даўніх традыцый, не напоены іх сілай, то ён застаецца ўнутрана бяссільным» [31, с. 126]. Дагматычнае ж захаванне традыцый прыводзіць да закасцянеласці. Вобраз Вежы, створаны У. Караткевічам, сцвярджае прагрэсіўнасць традыцыі, якая з'яўляецца адной з умоў фарміравання гістарычнай свядомасці.

Узвышальную і ачышчальную сілу мастацтва Алесь у поўнай меры адчуў таксама ў Загоршчыне, у тэатры старога Вежы. «Што ж рабіць потым?.. Як жыць без гэтага?» [т. 4, с. 200] — пакутліва думаў ён. А вось кнігу Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Алесь адклаў без жалю, хаця чалавек гэты «адкрыў Мора на шэсць год раней за яго, нават паспеў напісаць аб гэтым» [т. 4, с. 255]. Аднак «не разумеў хваль, з якіх гэта Мора складалася» [т. 4, с. 255], не мог даць сацыяльнага абгрунтавання асаблівасцей светаўспрымання і нацыянальнага характару беларусаў.

Ці не таму, каб сам Алесь змог убачыць і зразумець «хвалі мора», У. Караткевіч «выпраўляе» яго з абозам праз усю Беларусь, з Прыдняпроўя ў мястэчка Свіслач на Гродзеншчыне? На кірмашы «Алесь хадзіў сярод... align рознагалосага, стракатага мора, трошкі ачмурэлы і як быццам сонны, але радасна ўзрушаны. Сонныя былі вочы, узрушанае было сэрца. <...> Краіна была багатая. Краіну чакаў голад» [т. 4, с. 273]. Нельга было не згадаць дзедава «мы, незалежна ад нашых добрых якасцей, удзельнічаем у адным вялізным злачынстве, імя якому... Расійская імперыя» [т. 4, с. 203]. І як было пасля песень Данілы не спыніцца ля сляпога старца з лірай? «...Пакуль слухаюць людзі хаця аднаго лірніка, не памерла воля» [т. 4, с. 277],— скажа Алесю Кастусь Каліноўскі, якога аўтарская фантазія сутыкне ў самым прамым сэнсе з маладым князем тут жа, на кірмашы, каб яны пасябравалі на ўсё жыццё, якое ў іх засталося... «Алеся цяпер цягнула да гэтага хлопца. Таму што ён, не ведаючы Алесевых думак, прыйшоў да таго самага» [т. 4, с. 276].



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

І хоць у многім героі розныя, іх аб'ядноўвае перш за ўсё пачуццё нацыянальнай самасвядомасці, у той час як іншыя «таксама такія ж… толькі не знайшлі, як сябе называць... Безгалосае мора» [т. 4, с. 278].

У кантэксце фарміравання асобы Алеся Загорскага нельга не адзначыць гады яго вучобы ў Віленскай гімназіі. Аднак якасці, якія ён там набыў, сфарміраваліся хутчэй не дзякуючы ўмовам навучання, а насуперак ім: там было «цесна, задушліва, убога па думцы, абмежаваныя настаўнікі... Увесь горад нагадвае казарму або бальніцу. І ад гэтай казарменна-бальнічнай дзейнасці хоць ты ваўком вый» [т. 4, с. 290]. Уратавала Алеся «Братэрства чартапалоху і шыпшыны».

Чыталі недазволенае і спрачаліся да пены на вуснах. Сам выгляд кніг, якія даставаў Грыма, «дыхаў недазволенасцю і небяспекай. <…> Але гэта было спачатку. Пытанне, пастаўленае перад кожным, патрабавала адказу. Юнакам, амаль дзецям, неадкладна трэба было ведаць, хто яны такія» [т. 4, с. 291].

Найперш яны шукалі ўсё, што было магчыма, па гісторыі і праз гэта адкрывалі сябе: «плакалі над лёсам Ветра, Дубіны і Мурашкі, слухалі аб подзвігах князя Вячка, Міхаіла Крычаўскага і князя з Гарадка, сціскалі кулакі, перажываючы бітву на Крутагорскіх палях або сечу на Іваньскіх грывах... Перад вачыма падлеткаў, нібы невядомы, уставаў іх родны край... Той змрочны, лясны, тужлівы, але самы родны свет, дзе яны нарадзіліся… <…> Яны не ведалі яшчэ, што слава чалавецтва не ў мінулым і што біцца трэба не за мінулае, але іхні парыў быў сумленны і чысты» [т. 4, с. 292].

Пры параўнанні слаўнага мінулага свайго народа і яго абрыдлівага сёння ўзнікала нянавісць да таго, хто ведаў гэта, але «не хацеў нічым памагчы зямлі, жыхары якой дайшлі да апошняй ступені галечы і прыніжэння». Першым зрабіў выснову з гэтай нянавісці Алесь. «Дзеці сур'ёзна гаварылі аб паўстанні і зброі, і гэта было б нават смешна, каб не іхнія пашыраныя вочы, ліхаманкавы румянец шчок і перарывістыя галасы» [т. 4, с. 203].

Асобным зрэзам гістарычнай свядомасці з'яўляецца патрыятычная свядомасць. На штодзённым узроўні яна ўвасабляецца ў эмпірычных ведах пра Айчыну, яе гісторыю, развіццё і абарону, у патрыятычных традыцыях, пачуццях, эмоцыях, волі. Як бачым, усе гэтыя кампаненты па-мастацку ўвасоблены ў рамане. Патрыятычная, а значыць, і гістарычная свядомасць герояў літаратурнага твора паўстае ў мастацкіх вобразах як эстэтычны аб'ект. Яна ёсць вынік каштоўнасных

Рэпазіторый БарДУ



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

адносін да Айчыны і ўспрымання прагрэсіўных традыцый у свядомасці асобы праз прызму яе патрэбнасцей і інтарэсаў, пра што згадвалася раней.

Прагрэсіўна-пераўтваральная функцыя патрыятычнай свядомасці залежыць ад ступені яе ператварэння ў асабістыя перакананні чалавека, аб чым і сведчыць вобраз Алеся Загорскага. «Веды і вера ў радзіму — розныя рэчы» [т. 4, с. 331].

Найбольш паказальны ў гэтых адносінах эпізод яго віленскага жыцця — сустрэча ў гасцёўні Адама Кіркора з «цветам новай віленскай грамады» [т. 4, с. 326], у прыватнасці Вінцэнтам Дунінным-Марцінкевічам, Уладзіславам Сыракомлем, Станіславам Манюшкам, Вінцэсем Каратынскім.

Чаму ж Алесю, народжанаму пісьменніцкай фантазіяй, так утульна пачуваецца ў кампаніі рэальных гістарычных асоб? Так, «два Вінцукі — абодва паэты. <…>Абодва добрыя грамадзяне. Любяць радзіму. <…> Абодва на гаворцы пішуць. На літоўска-мужыцкай» [т. 4, с. 329]. Гэта скажа памяркоўны Кіркор. На першы погляд такім здаецца і адзін з Вінцукоў, Дунін-Марцінкевіч. Аднак Алесь убачыў у ім прыхаваную цвёрдасць і «супакоіўся, што знайшоў зразумелага і блізкага чалавека» [т. 4, с. 330]. Тым больш што Ходзька хоць і зласлівіць, але мае рацыю: пад уплывам творчасці паэта шэрагі паплечнікаў Алеся павялічацца, а мова ўсё больш настойліва заявіць пра сябе. У тым ліку і «тутэйшымі» песнямі, якія, па словах Манюшкі, «звіняць, смяюцца, плачуць». «Я ад Польшчы, — кажа кампазітар, — я і ад іх» [т. 4, с. 333].

Тут варта згадаць словы пана Юрыя пра грамаду, «у якой няма душы —

і яна выклікае магутны выбух сіл у кожнага суседа, што датыкаецца да яе. Тады яна дае такія ўзлёты генія, што ўсіх бярэ здзіўленне» [т. 4, с. 62].

Мова — гэтая душа. Мова — носьбіт і форма існавання культуры. Калі мове адмоўлена ў дзяржаўнасці, айчынныя таленты вымушаны далучацца да пануючай культуры. У гэтым трагедыя і ўсякай нацыянальнай культуры ўвогуле, і іх асабістая. Баршчэўскі, Чачот, Міцкевіч, Манюшка і многія іншыя — «паходжання беларускага, нацыі польскай». Але яны не здольны дайсці да думкі, што быць палякам — азначае душыць астатніх. Той жа, хто ўзброіўся гэтай думкай (Ходзька, Лізагуб), асуджаны «ніколі не быць ні беларусамі, ні палякамі,



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

ні немцамі, хоць яны схільны быць і тым, і другім, і трэцім» [т. 4, с. 332].

Вынікам дыскусіі ў гасцёўні Кіркора сталася тое, што Алесю давялося бараніць свае перакананні ў самым прамым сэнсе, аднаму супраць сямёх, не страціўшы ўласнай годнасці.

Эпіграф да кнігі «Выйсце крыніц» выклікае аналогіі з сацыяльнымі рэаліямі 50-х гг. XIX стагоддзя.

У рэалістычным плане гэты вобраз падаецца так: «Дзеці тым часам знайшлі ў самай глыбіні яра... крынічку. Крынічка, спакойная на паверхні, выкідала з глыбіні сваёй пясчаныя фантанчыкі. Вечна жывыя пясчынкі рухаліся, расцякаліся па дне ад сярэдзіны жарала, скакалі.

А побач другі малы гейзер... таксама тужыўся нарадзіць ваду, але ў яго не хапала сілы, і ён толькі часам выпускаў з сябе сытыя бурбалкі» [т. 4, с. 155].

Аднак гэты вобраз мае і глыбокі сацыяльна-філасофскі сэнс, увасабляючы дзве плыні ў грамадстве: дзеячы і абывацелі. «Жывая вада» — рух асобы і грамадства да прагрэсу. А ён ляжаў праз барацьбу. Барацьба гэтая была неаднароднай, бо жывілася з розных крыніц.

Мэта аналізу — выявіць іх і абгрунтаваць магчымасці аб'яднання ў адзіную плынь паўстання.

Усім вядомая прыказка «Адзін у полі не воін». Хто з герояў рамана ўласным лёсам яе абвяргае? Багдан Война. І імя, і прозвішча гэтаму герою пісьменнік абраў невыпадкова. Для чаго ж Бог даў Прыдняпроўю такога Войну? «Каб не спалі…» [т. 4, с. 47], — кажа Выбіцкі. Война — «асколак» паўстання 1830—1831 гг., нацыянальна-вызваленчага паўстання ў Польшчы, на Беларусі і ў Літве. Кіраўнікі яго ставілі галоўнай мэтай аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Адным з галоўных кіраўнікоў паўстання быў А. Чартарыйскі. На першым этапе паўстанне шырока падтрымлівалася сялянствам, якому былі даспадобы заявы аб надзяленні зямлёй і пераводзе на чынш. Але непаслядоўнасць кіраўнікоў паўстання ў вырашэнні аграрных пытанняў прывяла да адыходу ад барацьбы народных мас. На тэрыторыі Беларусі паўстанне атрымала найбольшы размах на захадзе і паўночным захадзе. Летам 1831 г. асобныя выступленні адзначаліся ў паўднёвых паветах Беларусі, але ў цэлым паўстанне на беларускіх землях пайшло на спад і ў жніўні было задушана. «…Прыйшла чарга палегчы каласам...» [т. 4, с. 267]. Многія ўдзельнікі паўстання былі аддадзены пад суд. У шляхты



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

канфіскоўваліся маёнткі, асоб нешляхецкага паходжання аддавалі ў салдаты ці ссылалі ў Сібір. Урад разумеў, што адных рэпрэсій мала. Таму пасля 1830 г. быў распрацаваны канкрэтны план поўнага зліцця забраных ад Рэчы Паспалітай зямель з тэрыторыяй Расіі пад сцягам праваслаўя і адзінай рускай народнасці.

У. Караткевіч вобразам змагара-адзіночкі сцвярджае, што і адзін у полі воін. «…Паўстанне будзе жыць, пакуль буду жыць я» [т. 4, с. 146]; «Інсургент спіць, а інсурэкцыя ідзе» [т. 4, с. 147]; «Лепей недаесці, як ястраб, чым пераесці, як свіння» [т. 4, с. 144] — у гэтым перакананы Чорны Война.

Праз некалькі год Кастусь Каліноўскі скажа Алесю, па сутнасці, амаль тое ж: «Не трэба тысячы, каб пачаць. І не трэба ста, каб пачаць. І не трэба... дваіх, каб пачаць» [т. 4, с. 324]. Вобразы Чорнага Войны і, у значнай ступені, Кастуся Каліноўскага пісьменнікам, безумоўна, рамантызаваны. Адзін з сучаснікаў Каліноўскага адзначаў, што кіраўнік паўстання валодаў незвычайнай вытрымкай і бязмежнай самаахвярнасцю, з’яўляўся выдатнейшым, не маючым аналагаў, узорам рэвалюцыянера. Ён адзін мог замяніць сотні, бо ўмеў цалкам аддавацца барацьбе, ахвяраваць сабой і хавацца ад праследаванняў. Война распараджаецца толькі ўласным жыццём — і гэтак жа Кастусь сцвярджае, што каханне не павінна віснуць на нагах змагара.

Як бачым, пераемнасць гэтых вобразаў відавочная, а адсюль — магчымасць зліцця адпаведных крыніц у плыні барацьбы.

Варта адзначыць і адметнасць сюжэтнай лініі Чорны Война — Алесь. У. Караткевіч не мае (і штучна не стварае) магчымасці сутыкнуць на старонках рамана Война і Кастуся, і мы адзначаем толькі агульнасць ідэйнага напаўнення гэтых вобразаў. А Алесь адчуў уплыў гэтага чалавека ўжо з дзяцінства, хай сабе спачатку і падсвядома. «З цёмнага тунеля дарогі даляцеў стомлены рэдкі стук капытоў, а потым з’явілася сама ноч, як гэта ёй належыць — на чорным кані і ў чорным плашчы...» [т. 4, с. 143]. Аднак і Война, у сваю чаргу, адзначае адметнасць «дзядзькаванага паніча». Ужо згадвалася пра станоўчыя адносіны Войны да сям’і, дзе трымаюцца старых звычаяў. Калі лёс сутыкне Алеся з Войнам яшчэ раз, той будзе больш шчырым у сваіх высновах: «Без гэтага [без ран] ніводны сапраўдны мужчына не пражыве. Можа, і табе давядзецца некалі, крый божа... Ты што ж,



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

любіш жандараў?.. Бацька твой іх не любіць. Дзед. Прадзед не любіў. Усе... Клеткі не любіць ніхто. Кожны, акрамя труса, хоча яе зламаць. А свабоднага чакаюць сіло, раны, смерць» [т. 4, с. 284].

Гэтыя словы бунтара-адзіночкі напоўняцца для Алеся глыбокім сэнсам значна пазней, калі ён зразумее: не паўстанеш — сумленне страціш. А паўстанеш — гэта, магчыма, і плаха. Аднак «у рабстве гіне дух» [т. 4, с. 294]. І заўсёды знаходзяцца людзі, якія разумеюць гэта. Цікавы аспект ва ўзаемадачыненнях Алеся і Чорнага Война выяўляецца ў час свіслацкай вандроўкі маладога князя, калі ён распытвае ў цёткі Тацяны Галіцкай пра яе жыццё. Высвятляецца, што да смерці яе мужа быў у яго стрыечны брат Багдан. Але год дваццаць назад знік, калі дваране бунтавалі. Пайшоў са зброяй, ды так і знік. Усё, што ад яго засталося, — амулет старога дзьмутага золата, на якім Белы коннік бароніць Авечку ад Льва, Змія і Арла...

З гэтага заканамерна ўзнікае жаданне дапусціць, што Война і незнаёмы нам Багдан — адна і тая ж легендарная асоба, якая «тройчы тры разы» ўнікла «немінучай смерці» [т. 4, с. 272] і бароніць Авечку ад улады, хітрасці і драпежнасці. А адсюль — не толькі блізкасць поглядаў, але і сваяцтва, роднасць Алеся і Чорнага Войны, якая не дазволіць ім у вырашальны момант апынуцца на розных баках барыкад.

Ездзіць па наваколлі Чорны Война. Ані спаймаць яго, ані купіць... Як дух... Не спіць і дух народа, аб чым сведчыць песня Данілы Кагута пра белае жарабя.

...Недзе ў лесе таўсцеюць доўбні,
Недзе ў стайні расце жарабятка [т. 4, с. 24].

Гэтую таемную песню будзе каму падхапіць. Адзін з блізнят-Кагутоў, Андрэй, вельмі добра спявае: «Праспявае так, што ўспомніць маладосць самая старая баба» [т. 4, с. 27]. Народны дух жыве і ў песні сляпога лірніка са Свіслацкага кірмашу. Блізкі да яго і Война, які скажа Андрэю: «Добра спяваеш, хлопчык. Спявай, спяваць добра. Спявай, пакуль даюць...» [т. 4, с. 36—37]. І ён жа разумее, што нягоднікі не спяваюць: «Дзе спяваюць, ідзі спакойна» [т. 4, с. 283].

Спяваць, аднак, маглі сяляне ва ўладаннях Загорскіх і блізкай да іх па духу шляхты. У Кроера не паспяваеш. Узнікае асацыятыўны вобраз работніка ў масцы на кроераўскай цукраварні. Калі Кроер не заплаціў



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

сялянам за згон, то Корчак, «працавіты бацька двох дзяцей, заўсёды рахманы, паважна-маўклівы», адважыўся на пратэст, бо «ў дзяцей галодных кавалак з рота вырвалі» [т. 4, с. 118]. Сялянская «крыўда патрабавала неадкладнага выхаду». Спалілі збожжа Кроера. Гэты быў «гнеў, пры якім не разважаюць» [т. 4, с. 121]. Аднак неабходна адзначыць наступную дэталь: пасля залпу Корчак бег у іншы бок, чым астатнія. З аднаго боку, гэтая дэталь становўча вылучае Корчака з аморфнай сялянскай масы. Менавіта праз сюжэтную лінію Кагуты-Корчак У. Караткевіч паказвае перарастанне стыхійных сялянскіх выступленняў у арганізаваную барацьбу супраць прыгнятальнікаў. Алесь бачыў «у гэтым мужыку вялікую чысціню нянавісці» [т. 5, с. 413]. Аднак часам Корчак не разумее відавочнага, узровень яго свядомасці невысокі. Яго нянавісць часта скіроўваецца не ў тое рэчышча. Так, ад рук Корчака ледзь не гіне Яраш Раўбіч, арганізатар дваранскага закалату; Корчак, аслеплены помстай, гатовы быў узняць руку нават на дзіця, Алеся, бо апошні — сваяк Кроера і нашчадак Загорскіх. Абмежаванасць светапогляду Корчака аўтар падкрэслівае праз такую дэталь яго знешнасці, як чорныя «дрымучыя» вочы. У час гарыпяціцкага бунту Корчак таксама не змяніў сваіх адносін да Алеся. «Не веру я табе, — сказаў ён. — Усёй пародзе вашай праклятай не веру... Ненавіджу я цябе. Не за тое, што ты гэта ты. За іншых я цябе ненавіджу. За Кроера. За ўсіх братоў тваіх. За ўсё... Хай бы цябе забілі салдаты, князь» [т. 4, с. 407]. Алесь з болем думае, што за пагарду продкаў да народа, за пагарду адукаваных да народа — каб не давялося плаціць дзецям, якія любяць гэты народ. Аднак вырашае зрабіць усё, каб Корчак стаў яму таварышам, бо вялікай справе патрэбны людзі, якія ўмеюць ненавідзець. «Харошы мужык», — думае ён пра Корчака.

Паплечнікі Корчака не падзяляюць яго крайняга радыкалізму: «На злых так пойдзем, што нас яшчэ на шворцы трымаць будзе трэба. А добрых — не руш» [т. 5, с. 81]. Некаторыя з сялян (браты Лапаты) згодны дапамагаць Корчаку, але пад яго сцягі не становяцца, лічачы за лепшае, як і спрадвеку, араць зямлю. Ёсць і такія (Данька-пастух), хто лічыць, што «лухта ўсё... Кормяць людзі, у торбу кладуць і на зіму даюць» [т. 5, с. 81] — а што больш трэба?

Час для выступлення супраць «ваўкоў» Корчак выбірае неспрыяльны, калі ўсе чакаюць царскай волі. І гэта ён цудоўна разумее.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

«Але яму было няўсцерп чакаць..., хавацца і перахоўвацца» [т. 5, с. 82], таму Корчак ігнаруе цвярозае меркаванне пра тое, што вялікай грамады цяпер не ўзняць.

«Але і чакаць было горш за смерць» і яму, і тым, хто побач з ім, і такім як Алесь, якія бачылі «на кожным раздарожжы, над усёй краінай узлёт прабітых цвікамі рук» [т. 5, с. 414]. Алесь разумее, што ў іх з Корчакам адна справа. У чарнавых накідах да рамана гэтая лінія мелася быць працягнута наступным чынам: «Алесь Загорскі і Корчак ідуць праз пікет пасля замаху на Аляксандра II, іх збіваюць на граніцы, калі яны хочуць перайсці яе» [т. 2, с. 160].

Аналіз дадзеных эпізодаў выяўляе гістарычную праўду таго часу, сведчыць пра неаднароднасць сялянскай масы, а таксама пра абмежаванасць сялянскіх выступленняў і супярэчлівасць мужыцкіх адносін да будучага паўстання, складанасць шляхоў да паразумення з перадавой часткай дваранства. «Не такі ўжо ён вогненебяспечны наш народ. І не такое ўжо з нас, з кожнага, добрае крэсіва, каб іскры сыпаліся» [т. 4, с. 80], — самакрытычна кажа Юллян Раткевіч, паплечнік Яраша Раўбіча.

Калі Алесь імкнецца хутчэй адпусціць на волю сваіх сялян, каб яны адчувалі, ад каго яе атрымалі, і ў далейшым ва ўсім яму верылі, то многія баяліся ашуканства, маўляў, «царская воля выгаднейшая». І таму мае рацыю Кастусь, калі кажа: «Тады і пачнем, калі зразумеюць падман. Раней мужыка на бунт не ўзняць. А без яго мы пералёты, на корані адсохлыя» [т. 5, с. 309].

Пэўная абмежаванасць выяўляецца і ў дзеяннях самога Раўбіча, у самым прамым сэнсе — гэта тое, што ён рыхтуе лакальнае шляхецкае выступленне: «...на той тэрыторыі, што мы збіраемся падняць, жыве нешта каля дзевяцісот тысяч чалавек» [т. 4, с. 384]. Памкненні Раўбіча ў тым, каб гэтая зямля стала зямлёй справядлівасці для ўсіх. Для гэтага трэба «паўставаць з надзеяй на перамогу» [т. 4, с. 379], і Раўбіч усё старанна разлічвае і рыхтуе.

У міжасабовым плане гістарычны аспект узаемадачыненняў розных пакаленняў дваранскіх рэвалюцыянераў увасоблены ў сюжэтнай лініі Алесь — пан Яраш. Іх адносіны на працягу рамана ўскладняюцца і на пэўным этапе робяцца нават варожымі, што выклікае сумненні ў магчымасці аб'яднання гэтых крыніц паўстання. Аднак некаторыя мастацкія дэталі дазваляюць глядзець на такую магчымасць



Рэпазіторый БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

аптымістычна: так, браты Грыневічы (адзін з іх — Тумаш, продак У. Караткевіча «па кудзелі») пачынаюць удзел у барацьбе як паплечнікі Раўбіча, само выступленне ён плануе не раней 1862 г. А гістарычныя крыніцы сведчаць пра гібель Тамаша Грыневіча як аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863—1864 гг. І гэта толькі адна з праяў тонкай і бездакорнай мастацкай логікі.

Судакранаючыся з такімі людзьмі, пачынае ўсведамляць неабходнасць барацьбы Алесь Загорскі. Гэтаму спрыяе ўваход яго ў «Братэрства чартапалоху і шыпшыны» і знаёмства з Кастусём Каліноўскім, а потым — членства ў «Агуле».

Усе пералічаныя крыніцы маюць агульную мэту — барацьбу супраць прыгоннага права. Большасць усведамляе, што змен патрабуе не толькі сацыяльна-эканамічны лад, але і форма дзяржаўнага кіравання, што манархія зжыла сябе, а ўдушлівая грамадская атмасфера, абумоўленая і першай, і другой акалічнасцямі, можа аздаравіцца толькі ў выніку выбуху народнага гневу. Толькі ў сялян яшчэ жывая вера ў добрага цара. Аднак Алесь, Кастусь і іх паплечнікі ў сваіх памкненнях стаяць значна вышэй за іншых. Яны, акрамя ўсяго, усведамляюць і сваю нацыянальную прыналежнасць. Таму далучаецца яшчэ адзін напрамак барацьбы — за нацыянальнае вызваленне, за незалежнасць сваёй Айчыны, за суверэнітэт.

Гэтыя ж мэты стаяць і перад польскімі дзеячамі, але іх рух таксама быў неаднародны. У поглядах на гістарычны лёс Беларусі многія прадстаўнікі «вялікай Польшчы» нічым не адрозніваліся ад расійскіх вялікадзяржаўных шавіністаў. «Знаеш, на што ім бунт? Каб прывілеяў сваіх не згубіць, каб да ўлады дарвацца... Спяць і ў сне бачаць свае прыёмы, балі, сваю паліцыю, сваіх катаў на айчынных эшафотах», — так характарызуе Кастусь тактыку «белых» [т. 5, с. 141].

У тым і другім адрасуецца ўзрушаны маналог Алеся: «Мы ніколі не паддамося ні вам, ні немцам, нікому. І не таму, што не любім вас, а таму, што кожны чалавек мае права на роўнае шчасце з другімі, а шчасце — толькі ў сваім доме» [т. 4, с. 334].

Тут будзе дарэчы яшчэ раз звярнуцца да высвятлення вучнёўскага разумення паняццяў «патрыятызм» і «нацыяналізм», бо многія з іх не схільныя выдзяляць патрыятызм у ліку прыярытэтных якасцей асобы, а таксама амаль не бачаць розніцы паміж паняццямі «патрыятызм» і «любоў да Радзімы». Хаця асобныя навучэнцы ўсё ж ацэньваюць



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

патрыятызм як больш дзейснае, па-грамадску значнае пачуццё, аднак пераважная большасць старшакласнікаў не кіруецца патрыятычнымі пачуццямі ў вызначэнні сваіх жыццёвых мэт. Паколькі, як адзначалася, патрыятычная свядомасць ёсць асобны зрэз гістарычнай свядомасці, то ў працэсе работы з названымі вышэй паняццямі варта скарыстаць такія метады фарміравання свядомасці, як перакананне і ўнушэнне.

«Родная зямля — гэта крыніцы... Выйсце крыніц. Воды. Воды. Струменьчыкі, ручаіны, рака, мора...» [т. 5, с. 95]. Ад выйсця крыніц — да мора, вобразу якога адводзіцца значнае месца ў рамане. «Струменьчыкі», «ручаіны» — гэта людзі адзіных поглядаў, якія імкнуцца да большага, моцнага і чыстага, як «сіні празрысты крышталь» [т. 4, с. 237]. Але шлях гэты не просты. «Наперадзе яшчэ скалы, у якіх трэба працачыць сабе дарогу, пяскі, у якіх трэба не высахнуць, зграбныя, як дзяўчаты, вербы, карані якіх трэба напаіць, і палі сеч, з якіх трэба літасціва змыць кроў» [т. 4, с. 238]. У гэтым вобразе зліваюцца ў адно індывідуальна-асабовае, сацыяльнае і філасофскае гучанне назвы «Выйсце крыніц». Алесь Загорскі пройдзе гэты шлях выпрабаванняў і ўвальецца ў супольнасць людзей, якія адстойваюць сваю мову, Радзіму, нацыю, каб, усвядоміўшы сваю ўнікальнасць і адметнасць, крочыць у агульначалавечую супольнасць.

Сэнс назвы другой кнігі рамана, «Сякера пры дрэве», на першы погляд ляжыць на паверхні. «Наша становішча жахлівае, нясцерпнае, і толькі сякера можа нас уратаваць, і нішто, акрамя сякеры, не дапаможа! Да сякеры клічце Русь!» [т. 5, с. 308]. У святле гэтай цытаты з «Колокола» відаць яскравы сацыяльны сэнс евангельскага выслоўя-эпіграфа: «Ужо і сякера пры корані дрэвы ляжыць: кожнае дрэва, што не прыносіць добрага плода, ссякаюць і кідаюць у агонь». У. Караткевіч спасцігае і адлюстроўвае дух той эпохі, калі неабходнасць сялянскай рэформы дыктавалася самім жыццём. І пакуль яе шляхі асэнсоўваліся ў вышэйшых палітычных колах Пецярбурга, сякера няўмольна ўздымалася на ўскраінах царскай Расіі. «Бунт ідзе... Ідзе паўстанне... Ідзе рэвалюцыя, выбух шалёнага гневу і ярасці. Няўмольны пажар ад Гродні да Дняпра... Яна ідзе. Толькі сляпыя не бачаць, толькі глухія не чуюць. “Крывадушныя! Аблічча неба распазнаць умееце, а знаменняў часу не можаце?” Яна немінуча будзе



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

ў... свеце найпадлейшай хлусні, бізуна, турмы, уціску малых народаў, забароны мовы, зацісканння рота...» [т. 5, с. 254].

У аспекце дадзеных тэзісаў варта прааналізаваць такія эпізоды, як прамова Алеся ў дваранскім клубе, дамова і паход людзей Корчака на Раўбіча; параўнаць розныя дзяржаўныя праекты рэформы і іх рэзананс у Прыдняпроўі; супаставіць палітычныя погляды розных плыняў «Агула»; выявіць кантраст у поглядах прагрэсіўнай і рэакцыйнай шляхты праз дзейнасць Алеся Загорскага і «Ку-гі»; раскрыць гістарычны і сімвалічны змест XIII раздзела (Валуеў-Мураўёў); выявіць грабежніцкую сутнасць рэформы 1861 г. і паказаць адметнасць гістарычнага часу праз міжасабовыя зносіны герояў кнігі.

Аднак назва «Сякера пры дрэве» таксама мае трактоўку індывідуальнага плана, праз хронікі радоў Кагутоў і Загорскіх.

Гіне Стафан Кагут ад рук «Ку-гі». «Як узнялася рука на такога. Ціхі ж, рахманы...» [т. 5, с. 318]. , — плача Янька. Безумоўна, заўсёды трэба некаму і зямлю араць. Але наколькі красамоўна гучыць Стафанава прызнанне: «Пры жыцці і страляць не любіў. Вось і сам дзічынаю зрабіўся» [т. 5, с. 318]. А тут якраз трэба было «з ваўкамі па-воўчы». Бо ўся віна Стафана заключалася... у яго годнасці. Звычай казаў: бачыш, што шмат людзей гоняцца за адным, — не памагай, бо праўда відавочна не на іх баку. «І атрымалася так, што для мяне адзін звычай, а для іх — другі. І яны забілі мяне, хоць я нікуды не лез і ведаў, што мы людзі маленькія і павінны араць зямлю, і ў нас дзеці...» [т. 5, с. 280].

Гібель Стафана Кагута ў ідэйным сэнсе блізкая да гібелі пана Юрыя Загорскага. Разважаючы над лёсам Дастаеўскага (паводле задумы У. Караткевіча, далёкага сваяка Загорскіх, прадстаўніка малодшай бакавой галіны роду), Антаніда гаворыць: «Абсёкся род. Колькі ўжо іх, адсечаных галін. Ды хіба сякера шкадуе?» [т. 4, с. 207]. Наўрад ці хто думаў тады, што сякера занесена ўжо і над панам Юрыем. Аднак толькі на першы погляд пан Юрый — проста ахвяра злога лёсу. Яго гібель, як затым і смерць Антаніды, абумоўлена гістарычна.

Чаму ж Караткевіч «забівае» пана Юрыя, высакароднага, сумленнага і добрага чалавека? «Справядлівасць і мяккасць не на кожным дрэве растуць» [т. 5, с. 30], — так характарызуе Біскуповіч павятовага маршалка Загорскага. І — пры гэтым дрэве сякера...

Калі Мусатаў просіць Загорскага даць як бы маральны дазвол абшукаць сутарэнні Раўбіча, пан Юрый не ідзе на гэта і папярэджвае аб



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

небяспецы. Але ў сваю чаргу просіць пана Яраша задумацца над тым, што дваранскі закалат — страшная штука і што ўсё скончыцца «толькі драганадамі шалёных псоў і горам для няшчаснага краю», пераконвае: «Не займайся сваім... чарадзействам...» [т. 4, с. 226]. Відавочна, што сам Юрый Загорскі ў закалат не пайшоў бы ніколі. Ён — чалавек традыцыі, якая не мае прагрэсіўнага пачатку, час апераджае яго, бо ў гэтым часе патрэбна здольнасць на радыкальныя дзеянні. І, як гэта ні жорстка, месца ў гэтым часе пану Юрыю няма, нягледзячы на яго асабістую прыстойнасць і высакароднасць, падобную да рахманасці Стафана Кагута. Ён ператвараецца ў дрэва, якое «не прыносіць добрага плода». Даніла Вежа-Загорскі зняважліва лічыць свайго сына «прадметам для псярні», хоць не можа не адзначыць, што Юрыя паважаюць як чалавека і як «маршалка», што ён не пазбаўлены велічы. Але бацька і сын — розныя людзі. Стары Вежа ўпэўнены: «Я не ўдарыў, але маё становішча такое, што я магу ўдарыць чалавека, які не можа адказаць. Значыць — розніца невялікая» [т. 4, с. 203]. А «бацька Алеся ўяўляе сябе дабрачынным апекуном сваіх паднявольных мужыкоў: павінен быць мужык, але павінен быць і пан, які пра яго дбае» [т. 5, с. 131]. Пан Юрый не бачыць магчымасці змяніць існуючы лад, не бачыць у селяніне сілы, здольнай тварыць уласнае жыццё, лічыць, што вольны селянін не зможа скарыстацца даравана свабодай, бо разам з ёю на яго плечы кладзецца вялікая адказнасць. І ўсё ж, разумеючы, што яму дажываць, а дзецям жыць, не можа не пытацца іхняй думкі, вырашае змагацца за зямлю для сялян напярэдадні рэформы. Ён не пярэчыць жаданню Алеся адпусціць Кагутоў, а потым і іншых сялян на волю. «Што залежала ад мясцовай самадзейнасці, насыпана аж з коптурам. Цяпер калі нават "палажэнне", адрэдагаванае імператарам, адкіне ўсіх, хто зарваўся, назад, Прыдняпроўе яно адкіне не так далёка, як іншых. Людзям будзе лягчэй» [т. 5, с. 121].

Пры гэтым пану Юрыю няпроста ўсвядоміць, што разумны народ лягчэй весці, але цяжэй гнаць: «Ты ведаеш, якія бяздонні, адна за другую страшнейшыя, расчыняюцца перад вачыма дасведчанага?.. З кожным пытаннем усё менш разумееш. Просты бачыць толькі зладжаны крок чалавечых кагорт. Мудры чуе тупат чарады, якая бяжыць да прорвы... Дык ці не лепей араць зямлю?.. Паляваць?» [т. 4, с. 150—151].



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Нягледзячы на прыхільнае стаўленне да беларускай мовы, цяжка назваць пана Юрыя і нацыянальна свядомым. Ён таксама далёкі ад аптымізму адносна нацыянальнай перспектывы: «Калісьці мы, напэўна, маглі быць вялікія, але не здолелі. Наша палітычнае быццё скончылася. У нас — толькі магілы...» [т. 4, с. 76].

На працягу сюжэтнага дзеяння другой кнігі герой адчувае сябе разгубленым, у вачах яго часта з'яўляюцца абыякавасць і пустата. Нельга было не заўважыць таго, што змяніўся пан Юрый у трывожны бок, што ён глыбока незадаволены жыццём і сабой. Праўда, гэты настрой мінаецца пры падрыхтоўцы героя да палявання, праз якое «стомленыя людзі пачынаюць любіць жыццё» [т. 5, с. 198]. Але жыццё патрабуе змен, што ўвасоблена ў крэда старога Вежы: «Адзіны спосаб не стаць непатрэбным — змяняцца да смерці і да смерці разумець новае...» [т. 5, с. 194]. Пан Юрый не здольны на гэта, ён вычарпаў сваю гістарычную місію і асуджаны на пагібель ходам прагрэсу. Чарговае паляванне становіцца для яго апошнім.

Услед за ім адыходзіць з жыцця пані Антаніда: найперш таму, што жыццё без каханага мужа не мае для яе ніякага сэнсу. Але яе ўчынак мае глыбокае філасофскае абгрунтаванне. «Ты астанешся моцны, — гаворыць яна сыну, — бо ў цябе вялкая, высакародная мэта. А я заўсёды была непрыдатная. Цень — і ўсё... Я была прыдатная толькі на гэта. Узбунтавацца. Пакараць сябе за ўсіх... І за тое, што я — сваячка Кроера. І за ўсіх чыста людзей. І за яго, беднага, і за сябе. Трэба было... хоць некаму ўзбунтавацца... Каб ведалі, што гэта нам крайняя пакута, што людзі думаюць... думаюць... над гэтым» [т. 5, с. 239—240].

Перад смерцю пані Антаніда бярэ з сына клятву ніколі без смяротнай патрэбы не адбіраць жыцця ў жывога, «бо не можа быць чалавекам той, хто забіў». «Ты ведаеш, што адчуваюць каласы пад сярпом? Толькі яны не могуць ні ўцячы, ні крычаць» [т. 5, с. 237]. Антаніда таксама завяшчае Алесю адпусціць людзей, бо прыгон — свайго роду людаедства, і, пэўна, у апошнія імгненні яе жыцця ёй мроіцца «свет, у якім нікому не было б страшна жыць» [т. 5, с. 238].

Пра такі ж свет марыць стары Вежа: «І стане добра. Спачатку людзям... Потым жывёлам... Потым раслінам... Хадзіце сабе, смейцеся. Бегайце сабе, скачыце, лётайце, слаўце жыццё... Каласіцеся сабе, зелянейце...». Але ён не ўхваляе ўчынку нявесткі, бо, на яго думку, лягчэй за ўсё скончыць так.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

А людзям трэба ісці, каб жыць. Стаяць за ўсіх, хто дыхае і шуміць. Як сосны на Доўгай Кручы, «няскораныя ў сваім жаданні жыць там, дзе не здолеў і не захацеў жыць ніхто» [т. 5, с. 242].

Нягледзячы на важкасць сацыяльнай праблематыкі, у рамане «Каласы пад сярпом тваім» моцны рамантычны струмень. Каханне, прыгажосць, дабрыня — усё тое, без чаго ўвогуле немагчыма ўявіць жыццё.

Пачуцці ўяўляюць сабой устойлівыя адносіны асобы да рэчаіснасці. Калі разглядаць гістарычную свядомасць як сукупнасць духоўных структур, праз якія суб'ект усведамляе сваё мінулае, фарміруе на іх аснове сістэму каштоўнасных арыентацый, то роля пачуццяў у яе фарміраванні неацэнная. Тым больш што само ўзнікненне пачуццяў звязана з працай сусветнай гісторыі, гэта вынік дыялектычнага развіцця, ажыццёўленага чалавецтвам за час яго існавання.

У фарміраванні гістарычнай свядомасці на матэрыяле творчасці У. Караткевіча неабходна ісці праз усведамленне ідэалаў пісьменніка. Чым больш значны пісьменнік, тым глыбей ён задумваецца аб маральным удзеянні на тых, да каго звяртаецца, тым больш сур'ёзныя маральныя праблемы, якім прысвечаны яго творы.

Сувязь чалавека са светам — вось асноўная праблема юнацкага перыяду, а пошукі прычын з'явы — характэрная рыса чытацкага ўспрымання.

Якая з жанчын найбольш вартая кахання Алеся Загорскага? Як сведчыць вопыт вывучэння рамана, адназначны адказ на гэтае пытанне атрымаць цяжка. Аднак вучнёўскія разважанні ў рэчышчы дадзенай праблемы вельмі каштоўныя: супадзенне таго, што шукае школьнік у пару духоўнага сталення з тым, што ён знаходзіць у мастацкай літаратуры, мае важнае значэнне, а арганізацыя працэсу такога судакранання дае педагогу магчымасць актыўнага ўдзеяння на фарміраванне асобы.

У эпасе аб'ект адлюстравання (рэчаіснасць) і суб'ект адлюстравання (пісьменнік) знаходзяцца ў раўнавазе і складаным узаемадзеянні. Падзеі і героі пазначаны аўтарскай ацэнкай, але логікай свайго руху могуць выклікаць іншую, чым аўтарская, ацэнку чытача. Асноўная работа чытача пры чытанні эпасу заключаецца ў супастаўленні сюжэту і характараў з аўтарскай ацэнкай іх. Два цэнтры ўвагі ў эпасе — сюжэтны матэрыял твора і аўтар — уцягваюць чытача ў творчую



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

дзейнасць узнаўлення мастацкай рэальнасці ў сваім уяўленні і дыялогу з пісьменнікам у ацэнцы тых з'яў, пра якія ідзе гаворка ў тэксце.

Большасць школьнікаў схільна лічыць, што найбольш вартая кахання Алеся Гелена Карыцкая, хоць гэта, безумоўна, пярэчыць аўтарскай ацэнцы. Прычыну можна бачыць у тым, што з-за незавершанасці рамана сюжэтная лінія Алесь — Майка разгортваецца не поўнасцю. Акрамя таго, чытач, як і малады Загорскі, разумее «ўсю прорву між... высакароднасцю адной і зажывошчамі другой». Гелена, безумоўна, прыгожая, і найбольш пераканаўча гэта гучыць у вуснах Майкі: «Як ідзе... Якая прыгожая... У сто разоў прыгажэйшая за мяне». «Вочы вялізныя. А плечы тонкія, але, адразу відаць, вытрымаюць усё. Незвычайная, пагрозлівая прыгажосць. Захоча — адбярэ» [т. 5, с. 103]. Але Гелена не захацела гэтага. Менавіта — адбіраць. Бо яна хацела не проста быць шчаслівай з Алесем, а жадала найперш шчасця яму. І ён, і яна адчувалі аднолькава: шчасце не ў тым, калі толькі кахаюць цябе. Кахаць — вось было сапраўднае шчасце. Шчасце было — аддаваць. Вочы Гелены «большыя, чым ва ўсіх людзей на зямлі» [т. 5, с. 68]. Веліч душы, высакароднасць да самаахвярнасці не могуць не ўражваць чытача, як не могуць не ўразіць старонкі, прысвечаныя сустрэчы Алеся і Гелены.

Усё, што адбываецца, паміж закаханымі мужчынам і жанчынай, увасоблена Караткевічам у самым высокім сэнсе па-мастацку, як высокая таямніца, да якой хочацца зноў і зноў дакрануцца. «Алесь асцярожна трымаў яе ля сябе, сам не разумеючы, што з ім. Іншай стала ноч. Іншымі сталі салаўі і пах вярбовай кары. Разбураны свет... пачаў выстройвацца ў нешта зладжанае. І самае пачуццё гэтай гармоніі пасля развалу і дымных руін было шчаснае і вялікае» [т. 5, с. 72].

Аднак рашэнне Гелены непахіснае: «Табе патрэбна другая. Ты кахаеш яе. Ты яшчэ не разумееш гэтага, але ты кахаеш яе». І хутка Алесь сам пераканаецца ў гэтым: «І вось яе [Майкі] вочы, і валасы, і рукі, і гнуткія плечы пад ягонымі рукамі. Усё не мае ні значэння , ні цаны... і нікога больш не было нават у мінулым, бо гэта было тое і не тое, гэта было неймавернае шчасце, якога не бывае на зямлі» [т. 5, с. 339—340].

Дык чаму ўсё ж Майка? Магчыма, вырашыць гэтую праблему нам дапаможа філасофія? Каханне не ёсць проста суб'ектыўнае пачуццё, у выніку якога тое, што мы любім, прыносіць нам радасць ці



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

задавальненне. Прадмет любові часта, наадварот, прычыняе нам засмучэнне і пакуту; увогуле, абыякавы ў пэўным сэнсе шчаслівейшы ці, ва ўсякім разе, спакайнейшы, чым закаханы, бо вольны ад клопатаў і хвалявання. Алесевы адносіны з яго «прадметам любові» — яскравае таму сведчанне. «Эх, ды ці не ўсё адно, як глядзела на яго Майка. Гэтага больш ніколі не будзе. Няма нават Майкі. Ёсць Міхаліна, дачка Яраслава Раўбіча, сястра Франса Раўбіча, дачка і сястра ворагаў» [т. 5, с. 38]. Лягчэй Алесю рабілася, бадай, толькі ад таго, што ўсё разумеў дзед.

А дзеду было страшна за ўнука: вочы пустыя, голас як нежывы. Па сваёй звычцы стары іронік спрабуе зрабіць Алесю «прышчэпкі» ад яго хваробы, «абы стаў ён здаровы і спакойны» [т. 5, с. 60].

«…Літаральна дапякаў яго з'едлівымі, несправядлівымі, але з гэтай прычыны яшчэ больш дасціпнымі разважаннямі аб жанчынах…» [т. 5, с. 267]. Гэта гаварылася са смешнай злосцю і было вельмі падобна на праўду. Так надаваўся гарт Алесевай душы. Ён павінен быў сам знайсці выхад, стаць мужчынам. І дзед чакаў моманту, каб, не раней і не пазней, даць параду. Тады, калі пераканаўся, што і ў гэтым пытанні пазіцыя Алеся непахісная, сказаў: «...На зямлі існуе адзіная непапраўнасць, адзіная незваротнасць. Гэта смерць. Пакуль яна не прыйшла — усё можа змяніцца тваёй воляй або капрызам лёсу (гэтак жа і Тэкля скажа Майцы: "З труны толькі позна"). А ты што — зручнасці захацеў? Яна ж зненавідная сапраўднаму каханню, лёгкасць гэтая, зручнасць... Тое каханне, што лёгка дораць, не цягнецца доўга... Авідзій не дурань быў, калі даваў параду: заходзіць праз акно, нават калі ніштo не перашкаджае заходзіць праз дзверы» [т. 5, с. 44].

І Алесь не згаджаецца стаць пакорлівым коласам пад сярпом лёсу.

Любоў — гэта непасрэднае ўспрыманне абсалютнай каштоўнасці каханага. Майка не лепшая, чым, скажам, Гелена. Яна проста іншая. Нельга не паверыць тонкай душы Гелены і вопыту Вежы: «чорцік» абатрэцца, пазбавіцца ад свавольстваў, якія дазваляла яму жыццё і — будзе жанчына, «самая добрая пара для Алеся» [т. 4, с. 249]. Аднак ніхто не ведае, што будзе з дзяўчынкі праз сем год... І што будзе з дзяўчынкай праз сем год? І што ўвогуле будзе праз сем год?..

Ужо адзначалася версія, што У. Караткевіч «надзяліў» каханнем не Кастуся Каліноўскага, а Алеся. І тады закаханых павінны яднаць агульныя жыццёвыя памкненні, а не толькі інтарэс да неардынарнасці



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

іншага. Платон у дыялогу «Сімпазіён» апісвае сапраўднае прызначэнне эратычнай любові менавіта як першай ступені да рэлігійнага пачуцця: любоў да прыгожых цел павінна пераходзіць у любоў да прыгожых душ, а апошняя — у любоў да самой Прыгажосці, якая супадае з Дабром і Ісцінай. Для Алеся гэтыя высокія паняцці непадзельныя з прагай барацьбы. «Хоць бы хутчэй, хоць бы хутчэй паўстанне. Няхай нават смерць!» Безумоўна, аўтар рамана рыхтаваў месца для Майкі побач з Алесем. Майка патрэбна Алесю і добрая, і благая, усялякая. Іначай бы гэта не было каханне. Дык ці мае Алесева нарачоная іншыя вартасці, акрамя знешніх (тым больш што прыгожыя і Ядзенька, і Анэля, і Сабіна), каб быць побач з ім?..

Другім натуральным зачаткам сапраўднай любові, сцвярджае філосаф [31], ёсць уласцівае чалавеку пачуццё таварыскай салідарнасці, братняй блізкасці ці нацыянальнай роднасці. Апошняя акалічнасць вельмі істотная для Алеся. Аднак, як адзначалася, з прычыны незавершанасці рамана мы можам меркаваць пра яе ўвасабленне толькі па асобных дэталях, на якіх варта спыніцца ў час аналізу. Спачатку «агідная зласлівіца» Майка здзекуецца з Алесевай мужыцкай гаворкі, але потым высвятляецца, што і сама яе ведае. Затым яна піша Алесю запіску на лацінцы, на якой пазней Каліноўскі будзе выдаваць «Мужыцкую праўду»...

У час гутаркі з Геленай да Майкі прыходзіць думка, што ўсе тыя, хто ўжываў мужыцкую мову там, дзе яе не прынята было ўжываць, мелі дачыненне да Алеся.

Можна прадбачыць далейшую паяднанасць асабістых і агульных інтарэсаў дваіх закаханых. Як у Гарыславы з Людамірам: «Абаіх разрывалі страсці: любоў да радзімы і каханне» [т. 4, с. 200].

Майка для Вежы «чорцік», Кастусь — «чарцяня». Дробязь? Але, тым не менш, гэта мастацкая дэталь, адна з тых, пра якія сказана: «Жамчужына тэксту. Скупая падрабязнасць і цэлая паэма. Вузельчык, які ўбірае ў сябе многія ніці. У любой тканіне вузельчык — брак, у мастацкай — знаходка, адкрыццё. Мысленне адкрыццямі — захапляе. Калі ў малым убачым святло вялікага — з'яўляецца цікавасць да таго і другога, а ўвогуле да іх сувязі. Імпульс да чытання мастацкай кнігі тут асабліва адчувальны. Адным вузельчыкам усё разблытаць і зноў



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Репозиторий БарГУ

сабраць у вузельчык — хіба ж не спакусліва? Праблемнасць, цэласнасць, вобразнасць — усё, усё ў гэтым вузельчыку... Часам дастаткова аднаго штрыха, каб у поўны голас загаварыла ўся кніга і ўсе, хто на ўроку... Мастацкая дэталь выхоўвае менавіта думаючага чытача. Відавочна, не толькі паэты, пісьменнікі, але настаўнікі-славеснікі павінны ўмець разумець і цаніць гэтую дробязь і карыстацца ёю як своеасаблівым інструментам аналізу. Але ідучы ад малога як часткі цэлага, школьнікі не заўсёды адчуваюць гэтае цэлае. Вось тут ім і павінен памагчы настаўнік, які ўмее і любіць працаваць "ад цэлага"» [32, с. 6—8].

І Майка, і Кастусь маюць незалежны, бунтарскі характар. Так Майку выхоўваў Яраш Раўбіч, шанаваў у ёй Чалавека. Але разам з тым і патрабаваў ад яе павагі да іншых людзей, калі яна спрабавала ўласцівымі для яе сродкамі змагацца са сваім каханнем як з «пачуццем ганебнай накаванасці... нібы ўсё даўно вырашана за яе на небе, а яна проста бездапаможнае кацяня, з якім лёс робіць усё, што захоча» [т. 4, с. 361]. Не, Майка зусім не хацела палегчы пакорлівым коласам, хаця і «не хацела губляць юнака, які ляцеў між зарніц» [т. 4, с. 361]. Вось такая яна, супярэчлівая Майка; у яе пачуццях не тое што чытачу — ёй самой часам разабрацца цяжка. Гэтая супярэчлівасць і ў аўтарскай характарыстыцы гераіні. Яна «бязважкая, слабая, моцная. Уся як сама свежасць і моц. Сумная і пяшчотная, халодная і жывая, як падснежнік» [т. 5, с. 19]. «Яна не ведала, ці прыгожае ўсё гэта: матава-белы, з празрыстым глыбінным румянцам твар, рот — адным краёчкам трохі ўгору, бровы — доўгія і вычварна зломаныя, і таму трошкі ганарлівыя... Вялізныя, цёмна-блакітныя, як марская вада, вочы...» [т. 4, с. 349]. Вочы ў Майкі — ад маці, але маці «звычайная», як піша У. Караткевіч, а першае ж з'яўленне дачкі Раўбічаў, іх «немагчымага дзіцяці», сведчыць пра яе неардынарнасць. Вочы герояў з'яўляюцца ў Караткевіча важнай дэталлю іх знешнасці.

Пра што ж могуць расказаць удумліваму чытачу вочы колеру марской хвалі? А пра што нам гаворыць вобраз мора ў рамане? У ім увасоблена ўсё, да чаго імкнецца Алесь, да чаго павінен імкнуцца чалавек. Народ — Радзіма — Свабода — Прыгажосць — Дабро — Ісціна.

Майка — часцінка гэтага бязмежнага мора «Хоць бы хутчэй Майка, бунт, перамога, свабода, вольная бацькаўшчына на вольнай



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Рэпазіторый БарДУ

зямлі» [т. 5, с. 387]. «Яна сапраўдная беларуская дзяўчына» [т. 4, с. 374], — адзначыць у сваім лісце да сябра Кастусь. І ў чытача няма падстаў не верыць Гелене, Вежу, Кастусю, Уладзіміру Караткевічу. «Ты чалавек. Мой чалавек», — кажа Алесь. Мая. Майка...

І як балюча чытаць у накідах да працягу рамана: «Смерць Майкі...». Аднак у гэтым праўда гісторыі, праўда жыцця: гінуць лепшыя. Вежа напрарочыў: жыццё пачне супраціўляцца і мяць, а потым кіне ў пагібельныя хвалі, як тую грушу, што «цвіла апошні год». Безумоўна, У. Караткевічу цяжка было адпраўляць на смерць сваіх любімых герояў, аднак па логіцы свайго характару яны не маглі знаходзіцца на іншым баку барыкад. «Мне дарагі свет і ты, — казаў каханай Алесь. — Але радзіма мне даражэй за ўсё. І калі радзіме маёй дрэнна — мне таксама няміла нічога, акрамя радзімы...» Яна зірнула на яго з павагай» [т. 4, с. 374]. Думаецца, што ў хуткім часе і Алесь змог пачуць ад Майкі падобныя словы. Не ад «лялькі» Ядзечкі, не ад Сабіны, з якой жыццё павінна было сутыкнуць іх ў далейшым як ворагаў... Дык якая ж з жанчын вартая кахання Алеся Загорскага?..

Сярод элементаў, якія вызначаюць стыль рамана, — лісты герояў, узоры эпісталярнага жанру. Існіна на ўроку літаратуры прыходзіць праз перажыванне, суперажыванне. Эмацыянальнае жыццё асобы — гэта пачатак яе духоўнага свету, яе культуры. Чалавек пазнае сябе, параўноўвае свой унутраны свет з ідэаламі, рысамі і якасцямі асобы героя, што з'яўляецца першым штуршком да самаразвіцця. Аб'ядноўваецца духоўны свет чытача і літаратурнага героя. Адной з найвялікшых радасцей жыцця з'яўляецца дружба. А адна з самых вялікіх радасцей дружбы — мець таго, каму можна даверыць таямніцу. Алесь і Кастусь «пасябравалі той хуткай дружбай падлеткаў, што ўзнікае нечакана, а застаецца надоўга. Часам на ўсё жыццё.

Перад развітаннем яны вырашылі, што будуць пісаць адзін аднаму. І гэта было цудоўна: ведаць, што ўпершыню ў жыцці табе ёсць каму пісаць, ёсць для каго заліваць сургучом канверт, ёсць для каго ўзважваць унцыі і залатнікі ліста, ёсць для каго, нарэшце, зусім па-даросламу ставіць у канцы постскрыптум, так сабе, між іншым, як быццам нешта забыў ды раптам і ўспомніў» [т. 4, с. 280].

Чаму ж без гэтых лістоў немагчыма абысціся ў рамане? Адказы на гэта пытанне — у тэксце. «Мы інакш не можам гаварыць. Мы далёка



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

адзін ад аднаго, — кажа Алесь дзеду і дадае: — Я хацеў яшчэ раз паказаць вам, які... які ён» [т. 4, с. 306].

Другая прычына абгрунтоўвае зварот У. Караткевіча да эпісталярнага жанру. Лісты — не толькі гутаркі з сябрамі, якія адсутнічаюць. У іх усё мае значэнне: і дата, бо яна павінна адпавядаць рэальнаму ходу падзей, і стылістычныя сродкі, якія дапамагаюць узнавіць жыццёвыя і маральныя ідэалы, духоўны свет герояў. Істотнай прыкметай асобы з'яўляецца і яе почырк. Ён, напрыклад, у Кастуся «добры, роўны», але відавочна, што хлопец не з «памяркоўных і акуратных», а натура валявая. Для такіх якраз і характэрны, як сведчаць графолагі, почырк прамалінейны, цвёрды, літары буйныя, выразныя. Няма кручкоў і ўпрыгажэнняў. Адзначаем разам з Вежам і «свежыя параўнанні і шчырыя выказванні пачуццяў», такія як, напрыклад, «двухгаловая курыца» адносна царскага герба і інш. Увогуле, ліст выклікае ў Вежы цікавасць да чалавека, з якім даводзіцца «дзяліцца» Алесем. Акрамя таго, у лісце змешчаны пералік прыкмет Кастуся Каліноўскага, які, па-першае, характарызуе яго як аб'ект цікавасці не толькі Вежы, але і рознага роду мусатавых. Па-другое, дае магчымасць параўнання з партрэтам, створаным мастацкімі сродкамі ў рамане (*гл.* т. 4, с. 273), а таксама апісаннямі знешнасці Каліноўскага яго сучаснікамі і яго шырока вядомым фотаздымкам. «Каліноўскі быў малады чалавек, 26 год; сярэдняга росту, моцнага складу; меў круты высокі лоб, чысты жарсткаваты твар і выразныя вочы; насіў кароткія русыя валасы, зачасаныя назад. Каліноўскі валодаў вялікім розумам і незвычайнай сілай волі і характару... Бескарыслíва аддаены быў сваёй справе. Чалавека гэтага нельга было ні спалохаць, ні збіць з толку», — і гэта нават з пункту гледжання афіцыёзнага гісторыка таго часу [33, с. 201].

На жаль, нам не дадзена ведаць, як бы па-мастацку ўвасобіліся гэтыя рысы ў працягу рамана, у час паўстання, і мы вымушаны абмежавацца гістарычным веданнем, аднак варта скарыстаць магчымасці другога Кастусёвага ліста, які Алесь чытае Майцы [т. 4, с. 370—374].

У ім знайшлі адлюстраванне многія вехі жыцця Каліноўскага, але не менш важныя яго каштоўнасныя адносіны да жыцця і сродкі іх выяўлення. «Вучыцца буду, як вол» [т. 4, с. 372]. , — сцвярджае Кастусь. І мэта яго высакародная: нельга дазволіць, каб народ выміраў,



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

трэба мецъ уласных добрых гаспадароў і адміністратараў. А гэта рэдкая з'ява
ў «дзяржаве катаў» [т. 4, с. 373]. Прычым, каты — не рускі народ, а «жандары, алілуйшчыкі, прадажная погань» [т. 4, с. 374]. Няма дрэннага народа. Гэта пазіцыя Кастуся, Алеся і самога У. Караткевіча, які ў іншым творы напісаў: «Няхай ты хоць як хвалі сваю Радзіму, узнімай яе хоць да нябёс, — пакуль ты паважаеш другія народы, ты патрыёт» [34, с. 43].

Кожны радок, кожны вобраз падмацаваны жыццёвым вопытам аўтара, яго ўчынкамі ці здольнасцю на іх. І многія рысы сваёй асобы У. Караткевіч аддаў сваім любімым героям. У лісце яскрава выяўляецца паэтычны талент Кастуся. Пецярбург для яго — «дзіва! Размыты, увесь сіні і залаты...» [т. 4, с. 371]. А ці не дзіва нашая мова? «Золата на хрусталі. Васількі ў жыце! Срэбныя кропелькі!» [т. 4, с. 373]. Але ён хоча быць сярод такіх, што «свабодна аддаюць жыццё і дом і ўсё — для краіны і чалавецтва. ...Калі аддаваць, то толькі сябе. Каханне не павінна вісець у нас на нагах» [т. 4, с. 323]. Тут дарэчы пазнаёміць вучняў
з успамінамі Людвікі Родзевіч пра Марыю Ямант, нарачоную Кастуся.

Безумоўна, канцэпцыя вобраза Кастуся Каліноўскага была б перагледжана У. Караткевічам, калі б гэтыя матэрыялы былі знойдзены пры жыцці пісьменніка. І ўсё ж ён геніяльна прадказаў рысы Марыі Ямант ў духоўным абліччы гераіні верша «Нявесце Каліноўскага». «Нікні гожаю галавою...» [т. 1, с. 234]. Адно з улюбёных слоў Караткевіча — гожасць — спалучае ў сабе паняцці прыгажосці і годнасці. І гэтак жа, як немагчыма стрымаць у сабе нараджэнне вершаў, маладосць не можа не скарыцца сіле кахання. Яно высокае, велічнае і трагічнае.

Правамерна ўзнікае пытанне: чаму побач з гістарычнай асобай У. Караткевіч змяшчае вымышленага героя Алеся Загорскага? У аспекце вышэйзгаданага маем права на такое меркаванне: паколькі адносна рэальнай асобы пісьменнік павінен карыстацца творчай фантазіяй «у меру і з густам», то ўсім тым, што варта дамысліць з прычыны нязначнай колькасці гістарычных крыніц, У. Караткевіч шчодра надзяляе Алеся Загорскага. У тым ліку і каханнем. Яно ўзнікае з цікавасці адно да аднаго незвычайных дзяўчынкі і хлапчука, а затым іх з'ядноўваюць агульныя ідэалы і, відавочна, сумесная барацьба (як Кастуся і Марыю). «Яна сапраўдная беларуская дзяўчына», —



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com
Рэпазіторый БарДУ

напіша Кастусь пра Майку. У лісце ж, дасланым Алесю праз сем месяцаў, усе сябравы клопаты ён назаве «прыдняпроўскай дурасцю». Вядучы тэзіс гэтага ліста — «Ніякіх кампрамісаў!» [т. 5, с. 91]. Пачынаючы з немагчымасці служыць ворагам Айчыны — і да нянавісці да «рабскай, гнойнай часткі крыві» [т. 5, с. 92] ўласнага народа. Ліст меўся быць апошнім, а надалей спадзяванне толькі на памяць, бо «пачынаецца сур'ёзнае» [т. 5, с. 92].

Кастусь знаходзіць паплечнікаў, у прыватнасці, паляка Зыгмунта Серакоўскага, і заклікае Алеся аднавіць сувязь з хлопцамі з «Чартапалоху і шыпшыны». Што ж да самога Алеся, то «ён узрадаваўся лісту Каліноўскага. Увосень ён паедзе ў Пецярбург... Будзе віраванне спрэчак, учынкаў — усяго, што завецца жыццём. І, калі спатрэбіцца, ён аддасць гэтае жыццё братам... Хоць нехта ёсць на свеце, каму яно патрэбна. Радзіма. Родная зямля. Беларусь» [т. 5, с. 93].



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

# УНУТРЫПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ ЯК СРОДАК СПАСЦІЖЭННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ХАРАКТАРУ

Адной з праблем сучаснай літаратурнай адукацыі з'яўляецца праблема ўнутрыпрадметных сувязей як рэалізацыі параўнальна-тыпалагічнага падыходу да вывучэння літаратуры. Для творчага ўрока характэрны ўсе магчымыя кантакты аднаго літаратурнага твора з другім. «Як толькі ўстаноўлена, што вучні валодаюць неабходнымі ўменнямі, варта дапамагчы ім аб'яднаць у думках гэтыя ўменні. Толькі зрабіўшы такую работу, мы можам чакаць, што вучні ўбачаць сувязі, якія вядуць да рашэння праблем. Аб'яднанне розных уяўленняў, што асвойваліся ў розны час і ў розных сітуацыях... ёсць тое, што называецца эўрыстычным метадам» [21, с. 268—269]. Аўтарская індывідуальнасць выявіцца перад школьнікам у тым выпадку, калі творчасць пісьменніка будзе прыцягнута да творчасці іншых мастакоў слова, а інакш уплываць на свядомасць і пачуцці чытача будзе значна цяжэй. Аб'яднаць адразу некалькі твораў дапаможа, напрыклад, тая самая яскравая мастацкая дэталь, бо яна выклікае жывую рэакцыю школьнікаў. Такі шлях ажыццяўлення ўнутрыпрадметных сувязей дае магчымасць, па-першае, канцэнтраваць аналіз, ствараць пэўныя блокі творчай думкі; па-другое, выканаць такую неабходную на кожным уроку функцыю паўтарэння і па-трэцяе, (бадай, гэта самае галоўнае) стварыць канкрэтна-вобразную, метафарычную аснову для болей гнуткага, нелабавога выхавання.

На нейкім этапе свайго жыцця князь Аляксандр Загорскі ўсведамляе, што «на гэтай зямлі не існавала іншых калыханак, акрамя мужычых». І гэта было «найлепшым доказам таго, што яны ўсе адно – ад яго і да апошняга мужыка» [т. 5, с. 195].

Адзін з аспектаў такой еднасці яскрава выяўляецца пры параўнанні рамана «Каласы пад сярпом тваім», напрыклад, з раманамі «Трэцяе пакаленне» К. Чорнага і «Людзі на балоце» І. Мележа. Малады князь Загорскі працаваў так, як ніхто і ніколі не працаваў з усіх людзей яго



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

круга. Па-першае, ён быў перакананы, што галоўным у эстафеце пакаленняў з'яўляецца чалавек, які прагне справы, дзейнасці, які здольны «капаць, біцца, пісаць шчырыя кнігі, перакідваць масты, бубнець пад нос нованароджаныя вершы, секчы дровы, вучыць дзяцей, змагацца за справядлівасць, біць студні і тунелі, дзьмуць шкло, лічыць і лекаваць, — іначай не варта і жыць» [т. 5, с. 234]. Па-другое, менавіта праца, лічыў Алесь, уздымае чалавека пасля кожнага яго падзення. Менавіта яна ўтрымлівала свет, разбураны іх разладам з Майкай. Збоку нават здавалася, што ён спакойны. «Унук працаваў да знясілення, і пан Даніла радаваўся: менш дрэнных думак палезе ў галаву, і калі ўжо будзе тужыць, то ад сапраўднай тугі» [т. 5, с. 59].

Топіць у працы сумненні і згрызоты Міхал Тварыцкі ў рамане Кузьмы Чорнага. Не марнуе ён часу і ў турме. Праз усё жыццё праца для яго — асалода і паратунак ад усіх бед. Здаровая народная, сялянская душа прагне, патрабуе працы...

Таму і для Васіля Дзятла («Людзі на балоце») найбольшай пакутай з'яўляецца проста сядзенне пад арыштам, сядзенне без звычайных клопатаў, без працы. Горшага пакарання, як аказалася, няма. А калі ж урэшце дапяў да жаданага занятку, то, як заўважае пісьменнік, нават з аблічча стаў дабрэйшы, жвавейшы, паружавеў і пахарашэў; звалілася нуда з прыгорбленых плеч.

Некаторыя даследчыкі на падставе вывучэння розных гістарычных, этнаграфічных, літаратурных і лінгвістычных матэрыялаў рабілі выснову аб тым, што беларус — гэта па сутнасці самы працавіты чалавек з небывалым цярпеннем і бязмежнай гатоўнасцю да ўсялякай працы. Адсюль — і надзвычайная жыццястойкасць у змаганні з усялякімі наваламі і няшчасцямі.

Хоць у Алеся Загорскага няма неабходнасці працаваць дзеля таго, каб пракарміцца і забяспечыць сям'ю, ён вызначаецца жыццёвым прагматызмам. «Алесь здзіўляўся, чаму гэта большасць людзей нібы саромеецца гаварыць пра грошы і свае да іх адносіны..., пакуль што ўсім даводзілася жыць у свеце, дзе без іх не абыдзешся. І не маглі ў гэтым свеце існаваць ні гаспадарка, ні палітыка, ні мастацтва — не пацершыся аб той нікчэмны метал, без яго... Галоўнае, самае першае ў кожным народзе было тое, як ён урабляе палі, будуе дарогі, наводзіць масты, якія машыны стаяць на яго фабрыках і, урэшце, як ён зарабляе і як выдаткоўвае гэты самы "агідны метал" [т. 5, с. 232].



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

У тыповага беларуса менавіта такім прагматызмам жывіцца непераадольны аптымізм. У канкрэтных учынках, дзеяннях на карысць родных, блізкіх і сябе наш суайчыннік бачыць сэнс свайго жыцця. І хоць Алесь – рамантычны герой, але яго рамантычнасць гарманічна спалучаецца з прагматычнасцю. «Калі чалавек, — скажа ён Гелене, — кожны чалавек вельмі захоча зрабіць другому хоць маленькае дзіва — свет зробіцца светам дзіваў» [т. 5, с. 70]. Або рамантычны вобраз белага жарабяці, а затым белага каня. Святы Мікола дапамагае кабыле ажарабіцца, бо ведае, што чакае сялянскую гаспадарку, якая засталася без каня (згадаем, як у «Знаку бяды» заплакала Сцепаніда, уявіўшы сабе сялянскую долю без коніка, асабліва па вясне):

Коні іхнія мала елі,
Працавалі, вазілі цяжка, —
Справядлівасці ездзіць належыць
На мужыцкіх пузатых конях... [т. 4, с. 24].

Смешнае жарабятка з тоўстым хвастом пераўвасабляецца ў гордага, прыгожага, вернага каня. Срэбны коннік на белым кані ў чырвоным полі — гэта Алесь скача на фоне зарава. І гэта — наш гістарычны герб «Пагоня».

Каб глыбей асэнсаваць гістарычны шлях Беларусі і больш грунтоўна пазнаць саміх сябе, неабходна разумець адметнасць беларускага нацыянальнага характару. Яго можна вызначыць як своеасаблівы набор, сукупнасць розных псіхалагічных рыс і якасцей, уласцівых большасці прадстаўнікоў гэтага народа.

Гэтыя рысы абумоўліваюць тыповыя спосабы паводзін прадстаўнікоў менавіта дадзенага этнасу.

На сучасным этапе часта побач з паняццем «нацыянальны характар» ужываецца паняцце «ментальнасць». Яно больш шырокае, дынамічнае і рухомае. На фарміраванне пэўных якасцяў гістарычна аказвала ўплыў асяроддзе, замацоўваліся тыя з іх, што забяспечвалі жывучасць народа ў цяжкіх прыродных умовах і існаванне ў саставе іншых дзяржаў на працягу многіх стагоддзяў. Існуюць «два тыпы, дзве якасці нацыянальнага характару: і цвёрдасць і мяккасць, падатлівасць і маўклівая, зацятая ўпартасць, цярплівасць і адчайны, гераічны радыкалізм... Ствараецца ўражанне, што менавіта суіснаванне і цеснае ўзаемадзеянне гэтых двух тыпаў нацыянальных паводзін якраз



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

і забяспечваюць унутраную жыццёвую ўстойлівасць беларускай нацыі, яе здольнасць выжыць і выжываць на скразняках еўрапейскай і сусветнай гісторыі» [35].

Уменне прыстасоўвацца да ўмоў і абставін, а, з другога боку, і ўменне прыстасоўваць іх да сябе; цярпенне, але хутчэй не як пакорлівасць лёсу, а як здольнасць ««трымаць удар», «не апускаць рукі пры няўдачах, не губляць галаву і г. д.; працалюбства; укаранёнасць свядомасці; любоў да прыроды і малой радзімы; кансерватызм, нелюбоў да перамен; замкнёнасць да сарамлівасці і вера ў прыметы, якая ідзе адназіранняў за прыродай, сентыментальнасць. У ментальнасці беларусаў шмат летуценнасці і рамантызму, але валодаюць яны і імпульсіўнасцю [36], абвостраным адчуваннем справядлівасці, спрадвечным імкненнем да незалежнасці.

Беларускі нацыянальны характар — гэта багацце праяў чалавечай натуры, а не толькі рахманасць, памяркоўнасць, законапаслушэнства. Нават вядомае цярпенне беларуса — гэта два цярпенні: бязвольных, бесхарактарных, гэта значыць, раздушаных, і — дужых, якія ведаюць, што пружына бясконца сціскацца не можа, і ўсяляк адтэрміноўваюць момант зрыву, дакладней, выбуху, калі пружына пойдзе ў іншы бок.

Усведамляючы дыялектыку ўзаемадзеяння двух, часам супрацьлеглых, бакоў нацыянальнага характару, беларускія пісьменнікі імкнуліся ўвасобіць яе ў сістэме вобразаў сваіх твораў. Так, у аповесці Васіля Быкава «Знак бяды» вобразы Петрака і Сцепаніды Багацькаў, узаемадапаўняючыся і ўзаемаабагачаючыся, разбураюць ходкае меркаванне пра беларуса як носьбіта спрадвечнай пакорлівасці, забітасці, сцвярджаюць яго права звацца чалавекам, паказваюць, як вырываюцца на волю тыя высокамаральныя якасці, што доўгі час былі прыдушаны страхам перад мацнейшым.

Філасофія паслухмянасці і пакоры зліваецца ў нацыянальным беларускім характары з філасофіяй бунту і пратэсту. Уладзімір Караткевіч сцвярджае гэта ў арыгінальнай мастацкай форме праз вобразы блізнят Кагутоў, Андрэя і Кандрата. З аднаго боку, яны падобныя настолькі, што ў дзяцінстве іх блытала нават сама маці, пакуль у Кандрата ў восем год не з’явілася прыкмета, «паўкруглы белы шрам на лобе: накінула капытом жарабя. Але, акрамя вонкавага падабенства, нічога ў блізнюках не было агульнага» [т. 4, с. 26].



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

У гэтых вобразах у рознай ступені падкрэсліваецца тое, што ёсць і што хоча бачыць пісьменнік у беларусаў; яны маюць у той ці іншай ступені ўмоўную форму, сумарна ўбіраючы ў сябе і гістарычны матэрыял, і ідэальныя ўяўленні пра чалавека. У. Караткевіч разам з тым імкнецца да індывідуалізацыі характараў, да таго, каб яны ўспрымаліся чытачом як канкрэтныя цэласныя шматгранныя асобы. Такі прынцып мае на ўвазе ўключэнне ў характарыстыку ўсялякіх прыватных падрабязнасцей, дэталяў, моўных адценняў, задача якіх заключаецца менавіта ў тым, каб надаць характару максімальную жыццёвую адчувальнасць, пэўнасць і пераканаўчасць.

Вобразы Андрэя і Кандрата Кагутоў як увасабленне двух бакоў беларускага нацыянальнага характару. Гэта знаходзіць адлюстраванне ў табліцы 3, якая з'яўляецца вынікам даследчыцкай дзейнасці вучняў.

Прыведзеныя аргументы сведчаць пра спецыфіку светаўспрымання герояў у адных і тых жа жыццёвых варунках, а свядомае аперыраванне такім лагічным прыёмам, як параўнанне, дазваляе вучням лепш бачыць у вывучаемых аб'ектах і іх непаўторныя асаблівасці, і выяўленне агульных заканамернасцяў; спрыяе больш трываламу засваенню вучэбнага матэрыялу, дапамагае весці самастойны пошук неабходных для параўнання аб'ектаў і прымяняць аналогію.

У мастацкім творы кампазіцыя матывавана характарам.

«Цяпер блізняты ішлі першыя, поплеч. Каб першымі, у выпадку чаго, сустрэць бяду» [т. 4, с. 138].

І пакахалі яны (бо гэта — адзін чалавек!) адну і тую ж дзяўчыну. У экстрэмальных умовах, як бачым, беларус пераадольвае дваістасць сваёй натуры і мабілізуе ўсе духоўныя сілы. А калі ўзнікае любоўны трохкутнік, — не толькі духоўныя. «Біткі біліся моўчкі, сцяўшы зубы. Браты-блізнюкі адчувалі: насмяяліся з самага дарагога, што ў іх было» [т. 5, с. 256]. Падобныя эпізоды ўрэшце даюць магчымасць чытачу ўспрымаць абагульненае значэнне створанага пісьменнікам характару. Сабраўшы раскіданыя на творы элементы, што характарызуюць гэтых герояў, мы пачынаем уяўляць іх сабе ў дыялектычным адзінстве, як пэўны тып чалавечых паводзін, за якім стаяць пэўны тып жыцця і пэўныя эстэтычныя патрабаванні да яго. Рознымі шляхамі ідуць да барацьбы героі Караткевіча, рознымі шляхамі прыходзяць да подзвігу і быкаўскія героі.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Можа здацца, на першы погляд, што памяркоўны Андрэй парушае логіку свайго характару, зарабіўшы раней за свайго гарачага брата пажыццёвую высылку ў Сібір, аб чым мы даведваемся з аповесці «Зброя». Але ўнутраны маналог Алеся пацвярджае, што ніякага адступлення ад логікі, як жыццёвай, так і мастацкай, у фабуле твора няма. «Больш, чым брат. Брат па крыві — па выхаванню і думках. Брат, кінуты ў няволю за тое, што спяваў на кірмашы песню, якую напісала твая рука, прыдумаў твой мозг...» [т. 5, с. 416].



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Т а б л і ц а 3

| Кандрат | Андрэй |
|---|---|
| Знешнасць | |
| На ім шкура гарэла. Біцца дык біцца, скакаць дык скакаць. З раніцы да вечара ўсюды чуліся яго смех і жарты. У светла-сініх вачах іскрылася такая прыкметная, а таму бяспечная хітрасць | Вочы... цямнейшага колеру; веі заўсёды сціпла апушчаны. Галава схілена трошкі ўбок, як кветка ў весняга «сну». Слова часцей за ўсё абцугамі не выцягнеш. Але затое з першага разу запомніць і праспявае пачутую ...песню, ...так, што ўспомніць маладосць самая старая баба.<br>Вінаватая ўсмешка, вялізныя васільковыя вочы, нясмеласць рухаў.<br>Мяккае і пяшчотнае аблічча |
| Учынкі | |
| «Ну, будзе яна [Майка] яшчэ здзекавацца — спалю Раўбічы...» | «Каб усе хаты дзяўчатам палілі, калі тыя здзекуюцца... Па ўсёй зямлі попел з ветрам гуляў бы»<br>Андрэй сказаў, нібы прабачэння прасіў |
| Страшна... змяніўся з аблічча: «Ты пашкадуеш, калі зачэпіш Алеся ці кагосьці з Загорскіх» (да Корчака).<br>«У адной хаце я з ёй не змагу. Тут... або дзяліцца з бацькам, або па бязмену ў рукі ды да Корчака» (адносна Галінкі Кахновай) | «Быць нам старымі кавалерамі ды чужых дзяцей глядзець. Добра, што хоць не міне нашай хаты тая нявестка. І дзеці будуць — Кагуты». |
| Ён будзе хадзіць месяц, два, год, але перастрэне Тодара аднаго. Нельга сказаць, што яму будзе лёгка яго забіць: ён яшчэ ніколі не забіваў. Але ён ведаў: іначай нельга. Калі не карае бог, не карае начальства, хай пакарае сам пакрыўджаны (Помста за смерць брата) | «Не забіў! — раптам амаль з радасцю крыкнуў Андрэй. — Не! Бач, устае» (Адносна Іллі Хаданскага) |
| ...адбіваўся ля сценкі. Яго трымалі. Ён нагінаўся і роў. Але сваякі моцна прыціснулі яго да глухой сценкі нейкай пуні (у Гарыпяцічах) | Кінь, браце. Не час... Дарэмна загінуць хочаш» |



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Акрамя кампазіцыі, элементы, неабходныя для стварэння характару, паказаны пісьменнікам з дапамогай моўных сродкаў. Характар пераходзіць у мову, вызначаючы адбор менавіта дадзеных моўных сродкаў, а гэтыя сродкі ў сваю чаргу ствараюць у нас уяўленне пра характар як пра індывідуальнасць. Таму моўная характарыстыка Андрэя і Кандрата заслугоўвае ўвагі пры аналізе дадзенага аспекта твора. У мове герояў яскрава выяўляюцца схільнасць беларусаў да жартаў, іх назіральнасць, мудрасць, летуценнасць, звычка да іроніі і самаіроніі. Яна простая, вобразная і выразная.

Душа селяніна і пад шэрым жупаном не шэрая. Пра гэта сведчыць маральны ўзор і многіх іншых прадстаўнікоў сялянства, таму, характарызуючы стыхію народнага жыцця ў рамане, варта зместам заняткаў зрабіць іх групавую характарыстыку. Найбольш лёгка скласці яе на аснове індывідуальных характарыстык. Асноўныя лагічныя аперацыі, якія ажыццяўляе аўтар разважання, — абстрагаванне і абагульненне. Парадак работы над групавой характарыстыкай такі [37]:

– адбор матэрыялу для разважанняў (назваць усіх герояў, што ўвойдуць у групавую характарыстыку);

– успомніць кожнага героя ва ўсёй сукупнасці яго рыс характару, учынкаў і інш.;

– абстрагаваць з гэтых індывідуальных характарыстык толькі тое, што з'яўляецца агульным для ўсіх;

– абагульніць рысы, якасці, асаблівасці кожнага героя ў адну характарыстыку. Абапіраючыся на яе, можна даць прамы адказ на пытанне тэмы, а з яго — сфармуляваць асноўны тэзіс разважання; аргументамі будуць тыя агульныя рысы, якія мы выявілі ў працэсе абстрагавання і абагульнення.

Асноўнае пытанне: «Якімі ўяўляюцца вам прадстаўнікі сялянства ў рамане?»

Асноўны тэзіс разважання: «Народ — творчая сіла», г. зн., сіла, здольная на дзейнасць, вынікам якой з'яўляецца стварэнне новых матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Варта мець на ўвазе таксама і сацыяльную творчасць як «працэс, у ходзе якога ажыццяўляецца пераўтварэнне розных сфер матэрыяльнага, духоўнага і сацыяльнага жыцця з арыентацыяй суб'екта творчай дзейнасці на атрыманне



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

грамадска значнага выніку, якасна новых форм грамадскага быцця» [38, с. 306].

Для рэалізацыі сацыяльнай творчасці неабходны пэўныя сацыяльныя ўмовы, пэўны тып мыслення і ўзровень самасвядомасці, творчая атмасфера, наяўнасць пэўных ведаў, генетычна і сацыяльна сфарміраваных якасцей і ўласцівасцей асобы. Што да суб'ектыўнага аспекту дадзенай з'явы, то ён увасоблены ў вобразах большасці прадстаўнікоў роду Кагутоў, для якіх, акрамя таго, Загорскія ствараюць аб'ектыўныя спрыяльныя ўмовы (вызваленне, вучоба Паўлюка і Юрася).

У групавой характарыстыцы героі разглядаюцца з пункту гледжання іх агульных рыс. Працэс абагульнення патрабуе таксама, каб рысы, уласцівыя толькі аднаму герою, былі адкінуты. Аднак, разважаючы, трэба паказаць тыя індывідуальныя формы, у якіх пэўная агульная рыса выяўляецца ў кожнага з герояў, адлюстраваць іх адметнасць, арыгінальнасць.

Аналізуючы вобразы Кагутоў, Корчака, Гелены Карыцкай, Халімона Кірдуна, нянькі Тэклі, Грыня Паківача і інш., варта вызначыць такія рысы, як:

– жыццёвая трываласць, працавітасць;
– мудрасць;
– маральнасць і духоўная чысціня;
– пачуццё ўласнай годнасці, свабодалюбства;
– таленавітасць.

Нават калі паставіць пад сумненне, што кожны са згаданых герояў таленавіты, то не падлягае сумненню паэтычнасць душы кожнага. Гэты маркёр беларускай ментальнасці мае сваё мастацкае і філасофскае абгрунтаванне. Нездарма У. Караткевіч прыгадвае прытчу аб тым, як бог дзяліў зямлю і надзяліў беларусаў самым горшым у свеце начальствам. Гэтая акалічнасць (сацыяльны прыгнёт), а таксама тое, што гісторыя беларусаў не песціла (толькі каля ста гадоў яны жылі супольна, а ўвесь астатні час ці ваявалі з захопнікамі, ці паўставалі, ці жылі пры каланіяльным рэжыме), рабілі немагчымым для беларуса выявіць сябе ў грамадскім і культурным жыцці. Гэта і вымушала яго чулую і ўражлівую (нават у Корчака!) душу кіравацца ў вольныя даліны творчасці. Аналіз адпаведных эпізодаў павінен таксама пацвердзіць тэзіс «Народ — катэгорыя маральная».



Рэпозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Разам з тым У. Караткевіч не ідэалізуе сялянскую масу, якая была неаднароднай. Ён паказвае абмежаванасць сялянскіх выступленняў, бачыць складанасць і супярэчлівасць адносін мужыкоў да будучага паўстання. І ў гэтым — вернасць гістарычнай праўдзе. У 1967 г. пісьменнік адзначаў: «...Сёй-той з рэцэнзентаў хацеў, каб у цэнтры рамана аб паўстанні 1863 г. я паставіў не князя Алеся Загорскага і яго сяброў, а селяніна накшталт Корчака... З новых прац рускіх, беларускіх і польскіх гісторыкаў... бачна, што рухаючай сілай паўстання ў Беларусі была якраз шляхта» [4, с. 80].

Шляхта, дваранства, паны, арыстакраты... Мы пакрысе пазбаўляемся ад заганных стэрэатыпаў, уласцівых савецкай ментальнасці, ужываючы гэтыя паняцці.

У пачатку 30-х г. рускі філосаф і юрыст Іван Ільін так тлумачыў тэрмін «арыстакратыя»: «Арыстос» — гэта лепшы. Не «самы багаты», ці «самы радавіты», ці «самы спрытны». Але менавіта лепшы — бескарыслівы, шчыры патрыёт, які думае па-дзяржаўнаму, палітычна вопытны, валявы, здольны, разумны, адукаваны... Цяжка аднесці да «лепшых» чалавека прагнага, прадажнага, патрыятычна абыякавага, бяздарнага, недарэчнага, непісьменнага». А. Камю таксама лічыў, што ўсялякае грамадства трымаецца на арыстакратыі, бо сутнасцю арыстакратызму з'яўляецца патрабавальнасць да самога сябе, а без такой патрабавальнасці кожнае грамадства гіне. Дадзеныя тэзісы могуць служыць своеасаблівым планам-алгарытмам характарыстыкі прадстаўнікоў дваранства ў рамане. У рознай ступені рысы арыстакратаў уласцівы ўсім мужчынам з роду Загорскіх. У. Караткевіч свядома рамантызуе мінулае роду. Легенда — гэта жыццё, якім яно павінна быць. Звязваючы імёны і лёсы Акіма Загорскага і Кацярыны, пісьменнік не толькі сцвярджае годнасць сапраўднага мужчыны, які не ахвочы да «ловли счастья и чинов», але і паказвае, якімі павінны быць у ідэале адносіны імперыі і ўскраін. Акрамя ўсяго іншага, у рэчышча дадзенай канцэпцыі грамадскага ўладкавання добра кладзецца выслоўе, што прыпісваюць Екацярыне: «Абаперціся можна толькі на таго, хто супраціўляецца». Гэты тэзіс варта скарыстаць пры абгрунтаванні зместу легенды.

Лепшымі спадчыннымі рысамі надзяліў пісьменнік Алеся Загорскага. Апроч таго, пад уплывам абставін і людзей, з якімі юнак меў зносіны (дзякуючы адным, насуперак другім), ён выпрацоўваў



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

адметны «кодэкс гонару», які, аднак, не раўназначны хваравітаму пачуццю шляхецкага гонару, што часам апаноўваў нават Раўбічаў і ў якім якраз і выяўляецца закасцянеласць традыцыі і ператварэнне яе ў тормаз прагрэсу.

Скласці «Кодэкс гонару» князя Алеся Загорскага прапаноўвалася вучням як даследчае заданне. Яны адзначаюць, што маральныя прынцыпы маладога князя сканцэнтраваны ў выказванні:

– Я мужык. Я князь, але я і мужык.

З яго выцякаюць і у прыватнасці, наступныя:

– Пасля кожнага свайго падзення я ўстаю, бо мяне ўздымае праца.
– Нельга есці хлеб народа і грэбаваць яго мовай.
– Чалавек той, хто змагаецца за шчасце людзей.
– Я не магу ненавідзець. Не магу хлусіць. Не магу забіваць...
– Мужчына раней губляе галаву, а зброю потым.
– Уцякаць — ганебна.
– Без рызыкі жыццё не жыццё.
– Рабства ў ілжы.
– У рабстве гіне дух.
– Ён цяпер нізавошта не згадзіўся б пакутаваць на вачах у іншых, нізавошта не згадзіўся б упрошваць, бо гэта прыніжае.
– Калі нехта хоча, каб яго лічылі добрым, хай робіць добрыя справы.
– Не рабі тое, аб чым пашкадуеш.
– Я ніколі не біў першы.
– Калі я не абараню свайго гонару, хто тады гэта зробіць за мяне?
– Я не магу ваяваць за Беларусь з пабітай мордай.
– Я беларус. Мне свая каліта не дарагая. Мне свая зямля дарагая.
– Радзіма мне даражэй за ўсё. І калі Радзіме маёй дрэнна — мне таксама няміла нічога, акрамя Радзімы і інш.

Па форме такое заданне можа мець варыянты, але па сутнасці выяўляе ўсебаковыя сувязі героя са светам, што прываблівае ўвагу старшакласнікаў. У перыяд ранняга юнацтва фарміруецца здольнасць да самавыхавання, на аснове якога працягваецца развіццё асобы, яе індывідуальнасці. Выдзяляюцца наступныя тыпы прымет, што вызначаюць шляхі фарміравання чалавека — індывідуальнасці:

– чалавек-індывід (тэмперамент і інш.);
– чалавек-асоба (сацыяльная сутнасць, паводзінныя характарыстыкі);
– чалавек-суб'ект (псіхалагічныя прыметы);



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

– чалавек-індывідуальнасць (самаідэнтыфікацыя, стыль жыццядзейнасці, самарэалізацыя).

Па меры сталення падлетак шукае ідэал у асяроддзі вядомых людзей гісторыі і сучаснасці. Найбольш выразна ідэалы выяўляюцца ў яго каштоўнасных арыентацыях, матывах і мэтах дзейнасці. Каштоўнасная арыентацыя — гэта інтэгральная (інфармацыйна-эмацыянальна-валявая) якасць і стан гатоўнасці асобы да таго, каб свядома вызначыць і ацаніць сваё месцазнаходжанне ў часе і прасторы прыроднага і сацыяльнага асяроддзя, абраць стыль паводзін і напрамку дзейнасці, грунтуючыся на асабістым вопыце і ў адпаведнасці з канкрэтнымі ўмовамі пастаянна зменлівай сітуацыі. Такім чынам, гісторыя ў міжасабовым плане, увасобленая ў рамане «Каласы пад сярпом тваім», мае высокія выхаваўчыя вартасці, бо не апраўдвае пэўных палітычных падзей, а паказвае сапраўдныя суадносіны паміж асобай і грамадствам, у дадзеным выпадку — праз змест канкрэтнага паняцця «арыстакрат».

Праблемным уяўляецца і пытанне, ці арыстакрат, па вялікім рахунку, Юрый Загорскі. Некаторыя шляхі вырашэння гэтай праблемы таксама прыведзены ў аналізе кнігі «Сякера пры дрэве».

Хто ж яшчэ з прадстаўнікоў шляхты мае права называцца арыстакратамі: Война, Раўбіч, Мнішак, Ісленьеў, Клейна?.. Апошні вобраз сведчыць пра тое, што Караткевіч схільны быў глядзець на жыццё, ды і на шляхецкія справы, з добрым гумарам і смехам. Шляхецкі гонар, безумоўна, перш за ўсё! Аднак, як казаў Кастусь Алесю, некалі мужык, што ахвотай ішоў на вайну, станавіўся дваранінам. А ў мірны час такі шляхціц падазрона нагадваў сяляніна, бо сам араў зямлю... Ці не пра такіх прыказка: «Два паны — адны штаны: хто раней устаў, той і надзеў». Аднак справа не ў вопратцы, бо можа быць «лярва і ў барве». Галоўнае іншае: не тыя паны, што грошы маюць, а тыя, што бога знаюць. А гэта і Мнішкі, і Клейна. Яе вобраз акрэслены індывідуалізавана і надзвычай цёпла пачынаючы са знешнасці:

– постаць «здавалася падобнай на невялікі стажок сена...» [т. 4, с. 88];

– учынкі: «Ды не сунь ты мне сваю руку. Што мне, сто год?» [т. 4, с. 88]. Асобнай увагі заслугоўваюць захады гераіні па ўладкаванні лёсу Янкі ці Міхаліны, «пакаранне» Таркайлы і Кроера на зборні;



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

– мова: «Зусім як нейкая вясковая баба, занадта добра і працягла, гаварыла яна па-мужыцку» [т. 4, с. 89].

Характэрна, што Клейна «адаптуе» і іншамоўныя словы да беларускай арфаэпіі (*хлігер*, *хлот*), а Антаніда Загорская называе Кірдуна «Філёмонам». І, «хоць па-старому зручней», пані Клейна галасуе за адмену прыгону разам з Загорскім, Раўбічам і яго паплечнікамі.

Асобныя якасці іншых прадстаўнікоў шляхты таксама даюць падставы называць іх «арыстакратамі духу», аднак кроўная роднасць з апошнімі не азначае аўтаматычнага перанясення духоўных якасцей, як у сюжэтнай лініі Загорскія — Кроер. І тады ўсплывае паняцце «арыстакраты з лёкайскай». «Грозны рак, ды ў с... вочы» [т. 4, с. 259]. «Над пешым арлом і варона з калом» [т. 4, с. 264]. «Нежанаты пан часам большая бяда, чым той, у каго пяцёра дзяцей» [т. 4, с. 112]. Гэта ўсё пра Кроера. У гэтым вобразе сыходзяцца многія ніці як сацыяльных, так і маральных канфліктаў узнаўляемай у творы эпохі.

Кроер парушыў звычаёвае права, зацiснуў сваіх сялян да немагчымасці. А чым жа можна растлумачыць п’яны разгул, які ён чыніў у сваім маёнтку? Калі ўсе ў яме, то яе не заўважаеш (а не толькі з прычыны нежадання павялічваць спадчыну Загорскіх). Аднак не ўсіх удавалася сцягнуць у гэтую яму. Напрыклад, пана Юрыя. «Гэты чалавек [Кроер], не мог абразіць яго» [т. 4, с. 261], бо быў падонкам, не вартым нейкіх пачуццяў. Яшчэ ніжэй Кроер у вачах дзіцяці, Алеся, калі б’е звязанага Корчака, «чалавека, які не мог бараніцца» [т. 4, с. 264]. «Канец свету», — кажуць слугі, назіраючы за «баляваннем» гаспадара. Яскрава відаць, што бездухоўнасць часткі шляхты дасягнула апагею і яна ператварылася ў перашкоду на шляху грамадства да прагрэсу. Як Хаданскі, унутраную пустату якога У. Караткевіч удала перадае «акруглымі» фразамі, за якімі нічога не стаіць: выраз твару пана «ні да чаго не абавязвае» або «пра такіх кажуць “ён дасціпны”, бо больш у заслугу ім сказаць няма чаго». Яго жонка — «злая румза», якая плача аб памерлым сыне, але зводзіць са свету прыгонных. Гэта пра такіх словы Корчака: «Яны ніколі не нюхалі дзяжы, а значыць, у іхніх жылах цякла іншая кроў... Яны не дапамагалі хлебу расці, не дапамагалі зямлі — маці раджаць. Яны толькі глумілі яе, і таму праўды ў іх не было, і яны былі ваўкі. А з ваўкамі — па-воўчы» [т. 4, с. 134].



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Перад выданнем рамана, як адзначаў У. Караткевіч у адным з інтэрв'ю, яму было прапанавана «абяліць» некаторых прыгоннікаў, накшталт Кроера, зрабіць іх менш жорсткімі. Аднак пісьменнік змог захаваць і перадаць асноўныя тэндэнцыі эпохі, сярод якіх і непазбежнасць барацьбы і немінучасць, пакуль што, паражэння. Фінал рамана бачыўся яму такім: «Крах усіх спадзяванняў, усіх ілюзій і — нават у гэтых абставінах — чалавечая нязломнасць! Паўстанне пацярпела паражэнне, але мужнасць — засталася. А значыць, засталося спадзяванне, што чалавек, свабода і народ — выжывуць!» [39, с. 83].



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

# СМЕХАВАЯ КУЛЬТУРА Ў РАМАНЕ У. КАРАТКЕВІЧА «КАЛАСЫ ПАД СЯРПОМ ТВАІМ»

Сярод мноства іншых задач, якія паўстаюць у сучаснай нам грамадскай сітуацыі, на першы план выводзіцца задача фарміравання гістарычнай свядомасці моладзі. А паколькі яна — не толькі веды, але і ацэначная дзейнасць суб'екта, скіраваная ў мінулае, то мастацкая літаратура нясе адметным чынам арганізаваную інфармацыю, якую немагчыма атрымаць іншым шляхам.

Згодна з гуманістычнай тэорыяй асобы, важнейшая патрэбнасць чалавека — гэта самаактуалізацыя. Асноўныя пытанні, якія чалавек ставіць і павінен вырашаць, — «Хто я ёсць?» і «Што я магу зрабіць, каб стаць тым, кім я хачу быць?».

Творы мастацкай літаратуры валодаюць здольнасцю абудзіць у свядомасці чалавека імкненне асэнсаваць падобныя пытанні і магчымасцю ў той ці іншай ступені адказаць на іх.

Адным са сродкаў у арсенале літаратуры як мастацтва з'яўляецца гумар, смех. Калі ўлічыць, што адной з псіхалагічных характарыстык асобы, якая самаактуалізуецца, з'яўляецца валоданне пачуццём гумару, то легкаважна ставіцца да такога сродку не выпадае. Смех — важны сродак фарміравання свядомасці асобы, у тым ліку і гістарычнай.

На штодзённым узроўні свядомасці мы часта карыстаемся аксіёмамі накшталт:

- гумар — найлепшая прыправа да кашы, якую заварыла жыццё;
- гумар — выратавальны круг на хвалях  жыцця;
- чалавецтва выжыла таму, што смяялася;
- тое, што сур'ёзна, не абавязкова сумна і інш.

Пры гэтым наўрад ці задумваемся, што яны маюць пад сабой навуковы грунт.

Вучоныя сцвярджаюць, што смех дае магчымасць лепш засвойваць інфармацыю, ужо незнарок вымушаючы ўяўляць і параўноўваць, што таксама развівае мысленне.



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Пачуццё гумару — паказчык развітага інтэлекту, сфера гумару і дасціпнымі — вялізная сфера чалавечай творчасці. Дасціпнымі не нараджаюцца, імі становяцца шляхам спроб і памылак. Пры гэтым трэба шмат чытаць, аналізаваць і супастаўляць. Добрая літаратура і жыццесцвярджальны гумар прывіваюць імунітэт супраць цынізму і бездухоўнасці, што надзвычай актуальна сёння.

Згодна са «Слоўнікам іншамоўных слоў», гумар — «вільгаць як адна з арганічных сіл, што, паводле даўнейшых уяўленняў, вызначалі характар і тэмперамент чалавека» [40, с. 84].

Гумар кожнай эпохі меў сваю адметнасць, аднак асабліва акрыяў і распаўсюдзіўся ён у эпоху гуманізму; магчыма, адсюль падсвядома ўзнікае жаданне вывесці гэтыя два словы ад аднаго кораня.

Бясспрэчна тое, што для падтрымання нацыянальнай самасвядомасці любога народа, псіхічнага здароўя і энэргіі нацыі неабходна прысутнасць у духоўнай рэальнасці гістарычных папярэднікаў — продкаў, якія знаходзяцца ў сакральным часе і якія павінны падтрымліваць нас адтуль. Але падтрымка гэтая магчыма толькі тады, калі мы пастаянна звяртаемся да іх памяці, выклікаем перад унутраным зрокам іх вобразы.

Аўра гістарычнага быцця не можа быць створана без гісторыі паводле Караткевіча і тых, хто ідзе ці пойдзе ўслед за ім.

Яны даказваюць, што наша гісторыя таксама багатая на рамантычныя гісторыі, вайсковыя подзвігі, прыдворныя інтрыгі; у ёй былі мужныя воіны і іх верныя ці здрадлівыя каханкі, вераломныя інтрыганы і дасціпныя жартаўнікі.

Нельга адмаўляць таго, што белетрызацыя гісторыі — справа неабходная і карысная, асабліва ў нашым грамадстве, пры нашым узроўні гістарычнай свядомасці. У свой час У. Караткевіч, балюча перажываючы зніжэнне цікавасці чытача да беларускай кнігі, лічыў, што выправіць становішча можна стварэннем кніг з займальным сюжэтам, у тым ліку і гістарычных дэтэктываў.

«Мы ўсё пішам пра тое, як “Ганна завіхалася ля печы”, — казаў ён. — А трэба пра незвычайнае, яркае, таямнічае. Каб нельга было адарвацца ўсю ноч» [4, с. 155]. Гэтаму спрыяе і неардынарнасць смешнага. Інфармацыя, пададзеная ў гумарыстычным ракурсе, адразу прыцягвае ўвагу і затым доўга зберагаецца ў памяці.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Нават адносна ўсёй гісторыі дзяржавы існуе меркаванне, што напісаць яе, вобразную, запамінальную, цікавую для ўсіх, можа толькі асоба, якая валодае дарам мастацкага слова, фантазіяй. Прэцэдэнтам можа служыць дванаццацітомная «Гісторыя дзяржавы Расійскай» М. Карамзіна, які не меў гістарычнай адукацыі, але здолеў павярнуць рускі народ тварам да мінуўшчыны і тым самым зрабіць культурнае жыццё Расіі больш устойлівым да асіміляцыі з боку Заходняй Еўропы.

На думку Карамзіна, не трэба напаўняць гістарычных твораў нецікавымі і неістотнымі фактамі, а ўсе рысы, якія абазначаюць характар старажытных герояў, цікавыя падзеі, выдатных людзей, уласцівасці народа апісваць жыва, ярка.

Адной з рыс беларускага нацыянальнага характару з'яўляецца схільнасць да гумару. Беларус — вялікі аматар пажартаваць з суседа, але яшчэ больш з самога сябе. А здольнасць нацыі да самаіроніі — гэта паказчык яе жыццяздольнасці і перспектыўнасці.

У гумары спалучаюцца нацыянальныя і агульначалавечыя рысы, і яго пласт у мастацкім творы выявіцца чытачу поўнасцю толькі ў тым выпадку, калі твор належыць да яго нацыянальнай літаратуры. Адпаведна таму, як толькі мова, падмацаваная генетычнай і гістарычнай памяццю, нясе чалавеку адэкватнае адлюстраванне рэчаіснасці — гэтак жа смех «па-беларуску» адпавядае нашаму ўспрыманню жыцця.

Менавіта ён гучыць у выслоўі: «Жыць можна. Хоць іншы раз і неахвота». І менавіта ён у спалучэнні з іншымі рысамі ментальнасці дае беларусу яго жыццёвую трывушчасць. А калі ўсё ў яго добра, беларус скажа: «Каб і лепш, то начорта».

Творы У. Караткевіча багата прасякнуты нацыянальным жартам, гумарам. Найперш гэта абумоўлена якасцямі асобы пісьменніка. А як жа інакш, калі нават размяшчэнне планет пры яго (Стральца) нараджэнні засведчыла пра дасціпнасць, знаходлівасць, весялосць і праўдзівасць. Дрэнны настрой прападае ў яго хутчэй, чым паспявае ім авалодаць; пераважна ён знаходзіцца ў добрым гуморы, а на любой вечарынцы вы знойдзеце яго ў цэнтры шумнай кампаніі, дзе ён будзе расказваць вясёлыя гісторыі, а ўсе вакол аглушальна рагатаць.



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Можна ўвогуле крытычна ставіцца да астралогіі, аднак прыватныя факты з жыццяпісу Караткевіча ўсё ж пацвярджаюць агульную тэндэнцыю.

Да ведама асабліва стойкіх скептыкаў наступная інфармацыя: народная валеалогія (навука аб здаровым ладзе жыцця), існаванне якой немагчыма адмаўляць, акрамя іншага, уключае і веды аб нацыянальнай беларускай астралогіі. На жаль, яны ў наш час захаваліся ў выглядзе эпізадычных звестак, як сведчаць даследчыкі, і, каб уявіць усю сістэму, трэба вывучаць язычніцкія першакрыніцы. Бо менавіта праз узаемадзеянне іншых канфесій з язычніцкім пачаткам і выпрацавалася сістэма, якая паўплывала на беларускі нацыянальны характар.

Маючы этнічную сувязь з карэнным народам Беларусі і вялікую душэўную прыхільнасць да яго, У. Караткевіч не мог не канстатаваць, што гумар не пакідае беларуса ў самых страшных абставінах.

Але найбольш ярка ён выяўляецца ў простых людскіх адносінах, што ў тую ж эпоху гуманізму выклікала да жыцця анекдот, у тым ліку і гістарычны.

І хаця анекдот — гэта звычайна выдуманае гумарыстычнае апавяданне з нечаканым канцом, варта памятаць, што ў кожным жарце ёсць доля жарту, а астатняе — праўда, і таму гумар — пасланне праўды, якое можа быць скіравана у самыя сур'ёзныя сферы.

Напрыклад, важным фактарам жыццяздольнасці нацыі заўсёды з'яўляецца яе шматлікасць. Гэта знайшло прамое адлюстраванне ў прыказках накшталт «Шклянак і дзяцей у доме ніколі не бывае занадта» ці «Дзяцей увогуле найлепей як найболей».

А ўскосна адбілася ў анекдоце.

Аўдавеў адзін мужык, а на руках у яго засталося аж шасцёра дзяцей. Дзе ж яму аднаму справіцца з імі, і стаў ён шукаць сабе жонку. Знайшлася такая, што згадзілася пайсці за яго, бо ў яе, самой удавы, таксама мелася шасцёра. А паколькі абое былі яшчэ не зломкі, то нарадзілася ў іх яшчэ шасцёра дзетак. Падрастаюць усе разам, усё, як трэба. Толькі аднойчы выбягае з хаты жонка і — да мужыка, што быў на двары: «Хутчэй дапамажы! Бо твае дзеці і мае дзеці б'юць нашых дзяцей» [41].

Чым не жыццёвая сітуацыя, узноўленая ў рамане «Каласы пад сярпом тваім»?



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Маці Кастуся памерла. «Бацьку трэба было думаць, як быць з дзецьмі. Без маці не пакінеш. Так і з'явілася мачыха Ізабэла, ды яшчэ сем братоў і сёстраў. 19 было б усіх, але двое памерла» [т. 4, с. 314].

У сялян сем'і былі даволі вялікія. «Чым жа вы багатыя, панове? Дзецьмі, ды смехам, ды Дняпровай вадой...» [т. 4, с. 313].

У шляхціча Каліноўскага дзяцей было столькі, як не ў кожнага селяніна, ды і род яго зусім захудалы, страціў не толькі былую славу, а і ўсе прывілеі. Ад сялян ён адрозніваўся хіба што асабістай свабодай. Аднак Сымон Каліноўскі быў чалавекам старанным, дбайным, практычным, а як вынік — паважаным і вядомым на ўсю губерню. Спрыяла гэтаму і афіцыйнае пацвярджэнне яго і яго нашчадкаў шляхецкага гонару. «Дваццаць чатыры гады спатрэбілася на прысуд» [т. 4, с. 314], — скажа Кастусь Алесю Загорскаму ў 1855 г., а праз дзевяць год, у час канфірмацыі, усклікне: «У нас няма дваран, усе роўныя» — разумеючы свой гонар інакш, чым мілае сэрцу і вушам шляхты гучанне тытулаў.

Калі адзін шляхціц наведваў другога, і тытул, і імя высакароднага госця агалошвалася поўнасцю. Праўда, у залежнасці ад маёмаснага становішча шляхты, рабіць гэта, захоўваючы ўсе нюансы этыкету, не заўсёды было каму.

Але тое не адносілася да Загорскіх. «Спраўна грукоча гармата, гледзячы які госць заварочвае на алею... Гэта яшчэ хто? Шарабан старэнькі, конь ледзь перастаўляе відавочна парэпаныя капыты.

— То ж гэта высакародны пан Мнішак едзе на сваім Панчоху.

Ну, гэтаму хопіць і аднаго стрэлу... А гэта? Пара сытых коней. Тарантас лакіраваны. Ага, едзе дзедзіц Іван Таркайла. Гэтаму можна грымнуць з дзвюх... А вось гарматы грымнулі тройчы. Лёкай абвяшчае недзе пад тэрасай:

— Віцэ-губернатар, іх яснавяльможнасць граф Ісленьеў [т. 4, с. 84].

Найлепшыя весці — калі нясуць есці. Бадай, кожны пагодзіцца з гэтым. Толькі не Алесь пасля дзядзькавання. Мала таго, што яму незразумела, як можна есці «сёння — на заўтра...»

«Ён палез падрапанай лапай у хлебны кошык, палажыў кавалак на сваю талерку і лыжкаю пацягнуўся да бацькавай талеркі, адчуваючы ў сэрцы пачуццё, блізкае да адчаю... Маці з цікавасцю, нават трошкі грэблівай, сачыла за тым, як сын бярэ загарэлай лапкай цукат, насцярожана кладзе ў рот. Тое, што трапіла на язык, спадабалася Алесю. Але



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Рэпазіторый БарДУ

далей зубы ўлезлі «ў нешта вязкае, нечаканае і таму гідкае. Ён выплюнуў пад стол... Трэба было хаця б на кароткі час ратавацца» [т. 4, с. 54].

Але чым далей хлопец знаходзіцца ў родным доме, тым выразней разумее, што яго «ўжо нічога не ўратуе». Напрыклад, тады, калі бацька збіраецца ўвосень запрасіць настаўніка дзяржаўнай мовы і англічаніна (а нямецкія, французскія і лацінскія словы і так блытаюцца ў галаве), Алесю «часам хацелася толькі таго, каб сёлетні ўраджай быў дрэнны...». Ды «ўсё адно стары Загорскі дапаможа, у яго грошай граблямі грабі...» [т. 4, с. 66].

І ўсё ж «навядзенне глянцу» мела свой плён, прынамсі, у тым, што Алесь мог дастойна ацаніць вось такі бацькаў жарт: «Купанне Ахіла пачынаецца. У ролі маткі героя князь Юры Загорскі» [т. 4, с. 71].

Адэкватнасць расшыфроўкі смеху чытачом залежыць ад яго ўзросту, светапогляду, адукацыі, якасцей асобы і грамадскіх умоў, сучасных яму.

Як ужо адзначалася, і беларуская мова, і беларускі гумар — умовы адэкватнасці ўспрымання інфармацыі пра навакольную рэчаіснасць. На старонках рамана яны часам суіснуюць самым арыгінальным чынам. «З карэты з'явілася і стала павольна апускацца ўніз постаць старой жанчыны», падобная «на невялікі стажок сена». Але Алесю яна не была смешная. «Занадта добра, працягла, зусім як нейкая вясковая бабуля, гаварыла яна па-мужыцку. І было ў яе тое, чаго не бывае не ў вясковых людзей: ...колькі набрала паветра ў грудзі — столькі і аддала ім і праспявала сказ, шчодра, не пакінуўшы для сябе ні драбніцы паветра, каб вымавіць яшчэ адно слова» [т. 4, с. 89]. Як прыкладна ў дыялогу Карпа і пана Юрыя:

— Ты, брат, таго... не вельмі.
— Дый, пане... не таго. Не гэтага, значыць [т. 4, с. 224].

Або
— О то ж бо яно табе й е [т. 5, с. 202].

Ці
— ніколі нікому нічога ніякага, а калі што якое, дык што там такое...

Звернемся яшчэ раз да слоў Караткевіча: «Няхай ты хоць як хвалі сваю Радзіму, узнімай яе хоць да нябёс, — пакуль ты паважаеш другія



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

народы, ты патрыёт». І тады твой смех ніхто не ўспрыме як абразу, бо ён — не іронія, не здзек, не смех — разбурэнне, а смех стваральны, які нясе людзям добрае (у тым ліку і таму, з каго смяюцца). У рамане «Каласы пад сярпом тваім» гэта «чорны, як чобат, і неўтаймавана вясёлы… <…> новы прыдняпроўскі дваранін, усыноўлены Ян Клейна» [т. 4, с. 248].

Ужо пры першым яго з'яўленні ў наяўнасці і аб'ект смеху, і «адхіленне ад нормы»: з карэты «вылез нехта такі дзіўны, што Алесь нават уздыхнуў». Але потым высвятляецца, што гэта «хлопчык добры, сардэчны. Шанаваць жонку будзе, цаніць і шчасце, і дабрабыт... няхай сабе і цёмны. Не папэцкае, пэўна. Цікава толькі, якія ж гэта ў іх дзеці будуць? Крый божа, калі як шахматная дошка...» [т. 4, с. 92].

І хаця на першы погляд гэткая ж розніца павінна быць у ментальнасці, усё ж знаходзяцца пункты судакранання.

Калі разам з бусламі «паляцім мы ў Афрыку, Афрыку чорную, у лес трапічны, дзе мнгва раздзірае людзей», то пачуем, як у густых сітнягах негрыцянскі правадыр кажа дзяўчыне:

> Я прайду праз лясы, дрыгву і завалы,
> Я забуду твой цёплы смяшлівы рот,
> Я на мнгве паспрабую дзіды трываласць:
> Ці праб'е яна ворагу прагны жывот... [т. 1, с. 81]

Каб памерці героем, а не рабом. А ў рамане прачытаем Алесева прызнанне Майцы: «Мне дарагі свет і ты. Але радзіма мне даражэй за ўсё. І калі радзіме маёй дрэнна — мне таксама няміла нічога, акрамя радзімы. Не баліць нічыя бяда, акрамя яе бяды» [т.4, с. 374].

Янка не ведае, дзе яго бацькі, памятае толькі жаночыя рукі. Відаць, цеплыня рук Надзеі Клейны нагадала яму мацярынскую, а яе мова замяніла матчыну. «Тут мая і мова, і зямля», — кажа ён.

Існуюць агульначалавечыя прыёмы стварэння смеху, таму мы здольны ўключыцца ў смехавую гульню і разумець гумар іншых народаў. Тым больш калі ён нараджаецца ў выніку бачання чалавекам недасканаласці пэўнай грамадскай з'явы, а ў дадзеным творы — калізій супольнага сацыяльна-палітычнага жыцця славянскіх народаў у Расійскай імперыі. Адсюль — і смех палітычнай якасці.

«У пецярбургскім тэатры ішло "Жыццё за цара". Хор спяваў: "После битвы молодецкой получили мы царя". І малады чалавек



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

кінуў уголас: «Говорил же я вам, что драка до добра не доводит» [т. 4, с. 226].

Малады чалавек, відавочна, быў з тых, «што апладзіравалі Чарнышэўскаму і аб якіх хадзіў жарт:

— Што гэта ты, хлопча, з хадніка сабе плед зрабіў?
— З рызаў пакуль што не дазваляюць.
— Чаго гэта ў цябе ручнік замест гальштука?
— Добра, што пакуль не вяроўка.
Гумар быў змрочны. Сапраўды, гумар шыбеніка» [т. 5, с. 162].

Ён быў народжаны часам і светам, «дзе ўладарыла салдатня… дзе чужынцы духу шматавалі ўсё маладое, здаровае, чыстае» [т. 5, с. 289].

А адкуль жа трапляе ў твор смех іншай прыроды?

І дзе той першапачатковы этап нараджэння смеху, калі пісьменнік свядома ці падсвядома аналізаваў такі аспект рэчаіснасці:

— Дзядзечкі, перавязіце!
— Нельга, дзеўкі. Бачыце, душагубкі.
— А можа, я і хацела б з табою душу загубіць, саколік?.. Пад дубам пасядзелі б... Жолуд адшукалі.
— Не...
— Эх вы! Дык спаймаць вам таго язя, што кудысь лазе.
Ніхто нічога не зразумеў, акрамя старэйшых... [т. 4, с. 209—210].

Можна спрачацца аб тым, ці выконвае ў дадзеным выпадку смех пазнавальную функцыю, але ён бясспрэчна нясе ў сабе суб’ектыўную праяву індывідуальнасці, відавочны індывідуальныя аўтарскія прыёмы стварэння смеху.

Акрамя таго, да дадзенага канакрэтнага «аб’екта смеху» Караткевіч звяртаецца двойчы. Але гэта выклікае не сум, а радасць, як ад сустрэчы з добрым знаёмым, хай сабе ён і крышачку змяніўся:

...Я нячутна вяслую
Паўз жанчын, што купаюць на плёсе дзяцей.
...Смех на беразе. Мяккае рэха ў лазе:
«Хтось ляжыць у чаўне... Паглядзіце, дзяўчаты.
Бач, тужлівы які... Тапельца вязе».
І адна з кабет, зубастая, смелая,
Пэўна, маці дзяўчатак, крычыць у спіну:
«Вось каб раптам устаў бы гэты тапелец



Рэпазіторый БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

І ўхапіў сабе... Ну хоць бы адну».
Я махаю рукой і торкаю ў човен,
Каб прыгожая самая села ў карме.
О, якія ляцяць наўздагон мне словы,
О, які там віск, і кпіны, і смех... [т. 1, с. 80].

Нечаканае асвятленне набывае праз прызму смеху праблема талерантнасці. Уступае ў сілу прынцып «вораг майго ворага — мой сябар».

Калі Вежа разграміў праваслаўны манастыр, у якім звянчалі яго дачку, а на зваротным шляху — каталіцкі кляштар, у якім за суткі выпілі ўсе віны, лікёры — каталікі ўзрадаваліся ганьбе канкурэнтаў: «Чорт з імі, з лікёрамі! Будуць яшчэ. Але пан схізматув поперал...» [т. 4, с. 177]. Гэта было якраз у духу даўніх традыцый: задняпроўскія манахі і шкаляры з езуіцкага калегіума са сваімі прыхільнікамі адпаведна «пераконвалі адзін аднаго ў справядлівасці «свайго» Хрыста спосабам, у якім было мала талеранцыі і яшчэ менш гуманізму. Не апошнімі довадамі ў гэтай спрэчцы было завушэнне, розных ступеняў моцы ўдары біблій ці каўчэжцам па галаве, выспяткі» [т. 4, с. 307].

Талерантнасць — моцная рыса моцнага народа, інакш яна ператвараецца ў абыякавасць, пакорлівасць ці яе праявы набываюць адценне фарсу ў самым прамым сэнсе слова.

На думку сацыёлагаў, талерантнасць — звышкаштоўнасць, выпрацаваная беларускай нацыянальнай культурай (як у амерыканцаў — поспех, у еўрапейцаў — устойлівасць жыцця, у рускіх — эмоцыя).

Свабодная ад палітычнага сэнсу, талерантнасць выяўляецца ў такіх прыметах, як абвостранае пачуццё сацыяльнай справядлівасці, эмпатыя, міласэрнасць, непрыманне агрэсіўнасці і ваяўнічага фанатызму, кампраміснасць у вырашэнні канфліктных сітуацый.

Нават смяецца беларус спачуваючы, як Халімон Кірдун з гера Фельдбаўха: «Немец, відаць усё ж не самы горшы... Тое, што ён мяхом стукнуты, — гэта ўсё лухта: без радзімы хто хочаш ашалее. Таксама пашкадаваць трэба...» [т. 4, с. 83].

Існуе выраз: «З мінулым трэба развітвацца смеючыся». Аднак творы У. Караткевіча сведчаць пра тое, што не грэх, смеючыся, да мінулага вяртацца. Гэта дапаможа нам лепш пазнаць сябе,

Репозиторий БарГУ



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

даследаваць адмысловасць беларускага нацыянальнага характару, глыбей асэнсаваць гістарычны шлях Беларусі.

Репозиторий БарГУ



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Барадзіна (Белая), А. I.* Фарміраванне гісторыка-патрыятычнай свядомасці школьнікаў пры вывучэнні літаратуры (на матэрыяле твораў У. Караткевіча) :дыс. … канд. пед. навук : 13.00.02 / А. І. Барадзіна. — Мінск, 2000. — 158 л.
2. *Русецкі, А.* Уладзімір Караткевіч : праз гісторыю ў сучаснасць : нататкі літ. творчасці / А. Русецкі. — Мн. : Маст. літ., 1991. — 287 с.
3. *Лазарук, М. А.* Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. — Мн : Нар. асвета, 1983. — 191 с.
4. *Мальдзіс, А.* Жыцце і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча : партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. – Мн : Маст. літ., 1990. — 230 с.
5. *Верціхоўская, М. Я.* Дарога, якую прайшоў : сістэма ўрокаў па творчасці У. Караткевіча ў 11 кл / М. Я. Верціхоўская, В. Верціхоўская // Роднае слова. — 1993. — № 3. — С. 46 – 52; №4. – С. 45 – 47.
6. Методика преподавания литературы : в 2 ч. / О. Ю. Богданова, В. Г .Маранцман ; под ред. О. Ю. Богдановой. — М. : Просвещение : ВЛАДОС, 1995. — Ч. 1 — 288 с.
7. *Рожина, Л. Н.* Развитие творческого мышления и творческих способностей учащихся на уроках литературы / Л. Н. Рожина, А. П. Лобанов // Адукацыя і выхаванне. — 1997. — № 11. — С. 65 — 70.
8. Методика преподавания литературы / под ред. З. Я. Рез. — М. : Просвещение, 1985. — 368 с.
9. *Гулыга, А. В.* Эстетика истории / А. В. Гулыга. — М. : Наука, 1974. — 127 с.
10. *Кучкоўская (Караткевіч), Н. С.* “З табой мы адны перад богам...” / Н. С. Кучкоўская (Караткевіч), Г. Шаблінская // Маладосць. — 1996. — № 11. — С. 227.
11. *Кабашнікаў, К. П.* Сустрэчы з казкай : кн. для настаўніка / К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч — Мн : Нар. асвета, 1984. — 96 с.
12. *Івашын, В. У.* Ад літаратуры — да жыцця / В. У. Івашын // Адукацыя і выхаванне. — 1993. — № 5. – С. 70—73.
13. *Чуковский, К.* От двух до пяти / К. Чуковский. — Минск : Нар. асвета, 1984. — 319 с.
14. *Адамовіч, А.* Блакадная кніга / А. Адамовіч, Д. Гранін. — М. : Сов. писатель, 1982. — 430 с.
15. *Мікуліч, А.* Праз экалагічную свядомасць — да народнай згоды / А. Мікуліч, Я. Церахаў // ЛіМ. — 1998. — 6 сак. — С.4.




Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

16. *Иванихин, В. В.* Почему у Ильина читают все? / В. В. Иванихин. — М. : Просвещение, 1990. — 160 с.

17. *Граник, Г. Г.* Когда книга учит / Г. Г. Граник, С. М. Бондаренко, Л. А. Концевая. — М. : Просвещение, 1988. — 192 с.

18. *Верабей, А.* Абуджаная памяць : нарыс жыцця і творчасці У. Караткевіча / А. Верабей. — Мн. : Маст. літ., 1997. — 256 с.

19. *Геніюш, Л.* Споведзь / Л. Геніюш. — Мн. : Маст. літ., 1993. — 271 с.

20. *Ермаловіч, М.* Старажытная Беларусь : Полацкі і Навагародскі перыяды / М. Ермаловіч. — Мн. : Маст. літ., 1990. — 366 с.

21. Методика преподавания литературы : в 2 ч. / О. Ю. Богданова, В. Г . Маранцман ; под ред. О. Ю. Богдановой. – М. : Просвещение : ВЛАДОС, 1995. — Ч. 2 — 302 с

22. *Шынкарэнка, В. К.* Пад ветразем дабра і прыгажосці (жанрава-стылявыя асаблівасці прозы У. Караткевіча) / В. К. Шынкарэнка. — Мн. : Навука і тэхніка, 1995. — 175 с.

23. Этнаграфія Беларусі : энцыкл. / пад рэд. І. П. Шамякіна [і інш]. — Мн. : Бел. сав. энцыкл., 1989. — 575 с.

24. Мифология Британских островов: энциклопедия. – М., СПб., 2003. М: Эксмо: СПб.: Ferra fantastica, 2003.

25. *Калеснік, У.* Усё чалавечае : літ. партр., арт., нарысы / У. Калеснік. — Мн. : Маст. літ., 1993. — 381 с.

26. *Ішчанка, С.* Дрыкганты Уладзіміра Караткевіча і верхавыя коні Рэчы Паспалітай / С. Ішчанка, Д. Марухіна // Беларускі гістарычны часопіс. — № 2. — 1998. — С. 63—66.

27. *Валадзько, У. Ф.* Выхаванне школьнікаў / У. Ф. Валадзько. — Мн. : Нац. ін-т адукацыі, 1993. — 213 с.

28. *Івашын, В. У.* З пазіцый гуманізму. Тэарэтыка-метадалаг. і метад. праблемы літ. адукацыі / В. У. Івашын. — Мн. : Нац. ін-т адукацыі, 1998. — 166 с.

29. *Грымаць, А. А.* Агульныя асновы дыдактыкі / А. А. Грымаць, А. І. Карповіч, П. П. Шоцкі. — Мн. : Бел. дзярж. пед. ун-т, 1998. — 239 с.

30. *Гніламёдаў, У.* “Пачуць, як у слове плешчацца сэнс...” // ЛіМ, 1998. — 13 сак. — С. 5, 12.

31. *Франк, С. Л.* Духовные основы общества / С. Л. Франк. — М. : Республика, 1992. — 511 с.

32. *Ильин, Е. Н.* Шаги навстречу / Е.Н. Ильин. — М., 1986. — С. 6—8.

33. *Шалькевич, В. Ф.* Кастусь Калиновский : страницы биографии / В. Ф. Шалькевич. — Минск : Университетское, 1988. — 240 с.

34. *Караткевіч, У.* У снягах драмае вясна : аповесць / У. У. Караткевіч. — Мн. : Юнацтва, 1989. — 172 с.

35. *Праневіч, Г.* Талерантнасць : пункт гледжання / Г. Праневич // ЛіМ. — 1994. — 11 сак. — С. 5.

36. *Дубянецкі, Э. С.* Таямніцы народнай душы : кніга для вучняў / Э. С. Дубянецкі. — Мн. : Народная асвета, 1995. — 47 с.

37. *Богомолова, Е.И.* Пособие по лит. для слушателей подгот. отд-ний высш. учеб. заведений : учеб. пособие / Е. И. Богомолова, Т. К. Жаров, М. М. Кедрова. — М. : Высш. шк., 1989. — 448 с.



Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

38. Социологический словарь / А. Н. Елсуков, К. В. Шульга ; сост. А. Н. Елсуков, К. В. Шульга. — Минск : Университетское, 1991. — 528 с.

39. *Караткевіч, У.* Зброя : аповесць / У. Караткевіч // Збор тв. : у 8 т. — Мн. : Маст. літ., 1989. — Т. 5. — С. 416—517.

40. *Булыка, А. М.* Слоўнік іншамоўных слоў / А. М. Булыка. — Мн. : Народная асвета, 1993. — 398 с.

41. *Казлоў, Л. Р.* З дазволу караля і вялікага князя / Л. Р. Казлоў. — Мн. : Полымя, 1992. — 112 с.

Репозиторий БарГУ



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

## Змест

*Ад аўтара* .......................................................................................... 3

Творы У. Караткевіча ў школьнай праграме і іх метадычная інтэрпрэтацыя .... 6
Сімволіка прозы У. Караткевіча ...................................................................... 45
Вывучэнне рамана «Каласы пад сярпом тваім» у святле праблемы фарміравання гісторыка-патрыятычнай свядомасці старшакласнікаў ...................................... 52
Роля кампазіцыйных элементаў у раскрыцці ідэйнага зместу рамана «Каласы пад сярпом тваім» ............................................................................................. 57
Унутрыпрадметныя сувязі як сродак спасціжэння нацыянальнага характару .... 88
Смехавая культура ў рамане У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» ........ 102

Спіс выкарыстаных крыніц ............................................................................ 112

Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

*Вучэбнае выданне*

**Белая** Алена Іванаўна

**ФАРМІРАВАННЕ ГІСТОРЫКА-ПАТРЫЯТЫЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ ШКОЛЬНІКАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ТВОРАЎ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА**

**Вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў**

Тэхнічны рэдактар *Н. В. Іванова*
Карэктар *В. М. Майсюк*
Камп’ютарная вёрстка *В. У. Кукраш*

Адказны за выпуск *А. Г. Хахол*

Падпісана ў друк 04.02.2011
Фармат 60 х 84 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура Таймс. Аддрукавана на рызографе.
Ум. друк. арк. 6,27. Ул.-выд. арк. 5,86.
Заказ 11. Тыраж 70 экз.

ЛИ 02330/0552803 от 09.02.2010

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт»
225404, г. Баранавічы, вул. Войкава, 21.

Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com